Родная газета на родной мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

20 ЛЮТАГА 2008 г.
СЕРАДА
№ 33 (26146)

Кошт 490 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

КАНСТЫТУЦЫЙНЫ КАНТРОЛЬПАВІНЕН БЫЦЬ УЗМОЦНЕНЫ

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 19 лютага прадставіў на пасадзе старшыні Канстытуцыйнага суда Пятра Міклашэвіча і генеральнага пракурора Рыгора Васілевіча.

Гэтыя кадравыя рашэнні выкліканы не нейкімі надзвычайнымі абставінамі, а абумоўлены практыкай ратацыі кадраў кіруючых работнікаў, якая добра зарэкамендавала сябе, адзначыў кіраўнік дзяржавы. «Новыя назначэнні абсалютна не выпадковыя: канстытуцыйны кантроль і пракурорскі нагляд блізкія па сваім прызначэнні і маюць агульную мэту — умацаванне вяршэнства закона і абарону інтарэсаў чалавека, грамадства і дзяржавы», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Пётр Міклашэвіч і Рыгор Васілевіч — высокакваліфікаваныя і прынцыповыя кіраўнікі, якія карыстаюцца заслужаным аўтарытэтам у дзяржаве. «Гэтыя людзі стаялі ля вытокаў фарміравання прававой сістэмы Беларусі», — нагадаў кіраўнік дзяржавы.

Паводле слоў Прэзідэнта, назначаны на пасаду генеральнага пракурора краіны Рыгор Васілевіч праявіў ініцыятыўнасць, канструктыўны падыход і высокую грамадзянскую адказнасць, калі ў няпростых для Беларусі ўмовах узначаліў Канстытуцыйны суд. «Прынятыя за апошнія 11 гадоў рашэнні Канстытуцыйнага суда працавалі на перспектыву», — лічыць кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што, назначаючы Рыгора Васілевіча на новую пасаду, ён разлічвае на паслядоўнасць і пераемнасць праводзімага курсу, а таксама далейшае паляпшэнне работы органаў пракуратуры.

«У бліжэйшы час мы сумесна з вамі вызначым дадатковыя напрамкі дзейнасці Канстытуцыйнага суда, якія з'яўляецца асаблівым органам. Думка канстытуцыйных суддзяў павінна быць вызначальнай пры прыняцці ключавых рашэнняў у жыцці нашай дзяржавы. Я чакаю ад Канстытуцыйнага суда канкрэтных прапаноў», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Канстытуцыйны суд ажыццяўляе кантроль за непахіснасцю святая святых — Канстытуцыі нашай краіны, забяспечваючы яе вяршэнства, умацоўвае законнасць у праватворчасці і правапрымяненні», — сказаў Прэзідэнт. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы дадаў, што сутнасць кантролю за канстытуцыйнасцю нарматыўна-прававых актаў не павінна звадзіцца выключна да іх крытыкі. «Павінны быць канкрэтныя канструктыўныя прапановы», — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка.

«Канстытуцыйны суд павінен бачыць перспектыву развіцця нацыянальнага заканадаўства не толькі з пункту гледжання падручнікаў і замежнага вопыту, а зыходзячы з існуючых сацыяльна-эканамічных і грамадска-палітычных рэалій у нашай дзяржаве і ў жыцці наогул», — сказаў Прэзідэнт. КС не павінен быць замкнёнай сістэмай, адарванай ад дзяржавы і грамадства. «Нельга выпускаць з-пад увагі галоўнае — работа Канстытуцыйнага суда істотна ўплывае на стабільнасць у нашай дзяржаве», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, адной з функцый Канстытуцыйнага суда павінна быць ацэнка дзейнасці пракуратуры і праваахоўных органаў краіны.

«Аб'ектыўна ацэньваючы зробленае, можна сказаць, што пад кіраўніцтвам Пятра Міклашэвіча пракуратура мае ў цэлым нядрэнныя вынікі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Прэзідэнт дадаў, што органы пракуратуры ўзмацнілі каардынацыю работы па выкараненні злачыннасці, сістэмны характар набыла антыкарупцыйная дзейнасць, вялікая ўвага ўдзялялася ўстараненню бюракратычных перашкод пры звароце грамадзян. Разам з тым кіраўнік дзяржавы жорстка крытыкаваў работу асобных супрацоўнікаў пракуратуры, а таксама даў прынцыповую ацэнку недахопаў дзейнасці гэтага ведамства.

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што мае намер узмацніць кантроль за дзейнасцю пракуратуры, якая, нараўне з іншымі дзяржаўнымі органамі, з'яўляецца падкантрольнай часткай грамадства.

«Галоўнае: пракуратура павінна быць максімальна даступная людзям, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Любы грамадзянін павінен быць упэўнены, што, калі ён звярнуўся ў органы пракуратуры, па яго пытанні будзе прынята правільнае і аб'ектыўнае рашэнне. Пракуратура ажыццяўляе, па сутнасці, вышэйшы нагляд за законнасцю».

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, трэба пастаянна працаваць над умацаваннем аўтарытэту пракурорскай сістэмы, які на сёння крыху пахіснуўся.

Прэзідэнт Беларусі запатрабаваў ад пракуратуры самых рашучых мераў па спыненні чыноўніцкага самавольства, беззаконнасці, зняважлівых адносінаў да грамадзян, фармалізму ў рабоце са зваротамі фізічных і юрыдычных асобаў.

«Мяне вельмі насцярожвае той факт, што апошнія некалькі гадоў знізілася эфектыўнасць пракурорскага нагляду, накіраванага на забеспячэнне своечасовага і поўнага ўстаранення парушэнняў заканадаўства, аднаўленне парушаных правоў грамадзян і арганізацый, непазбежнасці прыцягнення вінаватых да адказнасці», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт запатрабаваў ад генеральнага пракурора неадкладна выправіць сітуацыю: папярэднім расследаваннем займаецца шэраг праваахоўных органаў, а нагляд — гэта выключнае канстытуцыйнае паўнамоцтва органаў пракуратуры. «Сёння органы пракуратуры з'яўляюцца ядром сістэмы органаў крымінальнага праследавання і абавязаны забяспечыць яе дакладнае функцыянаванне. Пракуратура адказвае за тое, каб расследаванне ўсіх злачынстваў вялося якасна і аператыўна, каб злачынец сядзеў на лаве падсудных і адказваў за ўчыненае ў адпаведнасці з законам», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Правы і законныя інтарэсы грамадзян пры расследаванні крымінальных спраў павінны няўхільна выконвацца. Ніводзін грамадзянін Беларусі не павінен быць неабгрунтавана падвергнуты крымінальнаму праследаванню або асуджаны.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ёсць нямала прэтэнзій да якасці следства. У 2007 годзе праваахоўныя органамі неабгрунтавана прыцягваліся да крымінальнай адказнасці 227 чалавек, судовы разгляд 368 крымінальных спраў адкладваўся з-за неабходнасці збору дадатковых доказаў і перапрад'яўлення абвінавачанняў. Прэзідэнт лічыць недапушчальнай такую сітуацыю, бо за гэтымі лічбамі лёсы людзей і, вядома, характарыстыка дзейнасці праваахоўных органаў.

На якасна новы ўзровень неабходна ўзняць і падтрыманне пракурорамі дзяржаўнага абвінавачання ў судах. Не павінен чалавек, які прад'яўляе абвінавачанне ад асобы дзяржавы, быць прафесійна ніжэйшы, чым адвакат, сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Сёння ў грамадстве абгрунтавана ўзнімаюцца пытанні аб неабходнасці больш рэзультатыўнага процідзеяння злачыннасці, іншым правапарушэнням, забеспячэння надзейнай абароны асабістых і маёмасных правоў грамадзян», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

На думку Аляксандра Лукашэнкі, праглядаюцца сур'ёзныя пралікі ў наглядзе за выяўленнем і спыненнем злачынных замахаў на дзяржаўную ўласнасць.

Пракуратура таксама павінна забяспечыць своечасовае рэагаванне на непрыняцце адэкватных мераў па кампенсацыі прычыненага злачынствамі ўрону, што з'яўляецца для пацярпелых грамадзян найбольш важным і адчувальным.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што пакуль на нізкім узроўні знаходзіцца і прафілактыка правапарушэнняў.

«Дзяржава чакае ад пракуратуры больш актыўнай ролі ў арганізацыі выканання палажэнняў трох дырэктыў прэзідэнта», — сказаў Прэзідэнт. Ён падкрэсліў, што ні адзін дзяржаўны орган не павінен знаходзіцца па-за кантролем.

«Але пры гэтым хачу асабліва падкрэсліць, што бясчынства ў краіне не будзе. Пракуратуры і яе работнікам трэба свае асобныя амбіцыйныя і самалюбівыя планы пакінуць дома, або пакінуць работу, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Непрафесіяналізму, які часам прыступнічае ў дзейнасці пракуратуры, быць не павінна. Што засмучае, гэта адбываецца не таму, што вы не ведаеце, як працаваць, а таму, што вам часам перашкаджаюць вашы амбіцыі. Гэту крытыку я ў поўнай меры адношу і да сябе, таму што з майго боку вельмі шмат было даверу пракуратуры, і таму склалася такая сітуацыя».

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Дом, убачаны ў сне

Фота Анатоля КЛЕЩУКА.

— Усё пачалося з каменя. Я як толькі ўбачыў на звалцы брукаванку — яе вывезлі туды, калі будавалі мост на Аранскай: асфальт паднялі, а пад ім — брук, — так адразу дом гэты і ўявіў — нібы ў сне ўбачыў, — расказвае гаспадар сядзібы «У Прылессі» Сяргей Рукшта. — Набыў тады ўчастак пад Мінскам, побач са спартыўным комплексам «Стайкі», завёз на яго 43 прычэпы гэтага каменю — 250 тон, і пачаў будавацца.

(Заканчэнне на 6-й стар.)

КОЛАЙ
раскрытых душ і дзвярэй

ВЯСКОВЫ ТУРЫЗМ МАЕ ДОБРЫЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ

Сёння Белаграпрамбанк правядзіць спецыялізаваную канферэнцыю «Аграэкатурызм у Рэспубліцы Беларусь — стан і перспектывы развіцця». І тэма, і ініцыятар мерапрыемства не выпадковыя: Белаграпрамбанк — першы банк, якім прынята рашэнне аказваць сістэмную дапамогу гаспадарам сельскіх сядзіб. Невыпадкова і тое, што «Звязда» прыняла прапанову выступіць інфармацыйным спонсарам канферэнцыі: вось ужо тры гады яна публікуе на сваіх старонках нарысы пра людзей, якія расчынілі дзверы сваіх дамоў для ўсіх ахвотных, і свае душы — для тых, каму цікава, на якой зямлі яны жывуць. Напярэдадні канферэнцыі мы сустрэліся з адным з распрацоўшчыкаў банкаўскай праграмы развіцця аграэкатурызму Святланай КОНЧЫЦ, начальнікам упраўлення карпаратыўнага бізнэсу. Тэма размовы: удзел банка ў развіцці сельскага турызму.

— Наколькі я разумею, зусім невыпадкова Белаграпрамбанк падтрымлівае сельскі турызм? Тут нават у назвах ёсць агульныя карані.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

— Так, прычым гэта ініцыятыва менавіта самога банка. Указ Прэзідэнта № 372, у рамках якога суб'екты аграэкатурызму атрымалі падтрымку ў выглядзе льготнага крэдытаабкладання, не прадугледжвае фінансавання гэтых праектаў. Але многія з тых, хто вырашыў прымаць турыстаў, не мае дастатковых сродкаў, каб належным чынам падрыхтаваць сядзібу. І банк тут выступіў як крыніца сродкаў.

Разам з тым банк як фінансавы інстытут не дасканала ведае спецыфікі аграэкатурызму. Таму мы вырашылі падключыць да сваёй праграмы яшчэ двух удзельнікаў: Беларускае грамадскае аб'яднанне «Адпачынак у вёсцы» і аблвыканкамы.

(Заканчэнне на 6-й стар.)

Стартуе Міжнародны год моў

ЮНЕСКА аб'явіла аб пачатку Міжнароднага года моў. Пачынаючы з 2000 года, 21 лютага рэгулярна адзначаецца Міжнародны дзень моў. Цяпер вось надышла чарга года моў. Адказнасць за яго правядзенне і кардынацыю ўсіх мерапрыемстваў ААН усклала на ЮНЕСКА.

На думку генеральнага дырэктара гэтай арганізацыі Каіціра Мацуура, мовы з'яўляюцца не толькі аб'ектамі аналізу для спецыялістаў, але і ляжаць у аснове ўсіх праяў сацыяльнага, эканамічнага і культурнага жыцця. Таму ЮНЕСКА падкрэслівае вялікую важнасць моўнай разнастайнасці і выступае за заахвочванне выкарыстання родных моў. Далёка не ўсе мовы маюць аднолькавыя правы. Больш за палову з усіх 6700 моў, на якіх размаўляюць зямляне, маюць у доўгатэрміновай перспектыве пагрозу знікнення. У сярэднім кожныя два тыдні са сферы ўжывання знікае адна мова. На 96 працэнтах моў размаўляе менш за 4 працэнты насельніцтва планеты. Таму ў год моў асаблівая ўвага будзе нададзена выкананню міжнародных дамоўленасцяў, якія замацоўваюць стандарты выкарыстання моў. 21 лютага ў штаб-кватэры ЮНЕСКА пройдзе семінар, дзе плануецца абмеркаваць ход рэалізацыі Еўрапейскай хартыі рэгіянальных моў і моў меншасцяў.

Леанід ТУГАРЫН.

Памер працоўных пенсій у Беларусі павялічаны ў сярэднім амаль на 6 працэнтаў

Указ аб іх павышэнні з 1 лютага Прэзідэнт Беларусі падпісаў 19 лютага. Так, памер працоўных пенсій па ўзросце ў сярэднім у лютым складзе больш як Br365 тыс. Такім чынам дзяржава зрабіла чарговы рэальны крок па паляпшэнні матэрыяльнай забяспечанасці беларускіх пенсіянераў.

Прэс-службa Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ПЕРШЫ ТОМ ВЯЛІКАГА ГІСТАРЫЧНАГА АТЛАСА БЕЛАРУСІ ЎБАЧЫЦЬ СВЕТ УЖО СЁЛЕТА

Аб гэтым журналістам паведаміў старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Рэспублікі Беларусь Георгій Кузняцоў. Згаданы атлас будзе складацца з трох тамоў з гістарычнай і картаграфічнай інфармацыяй аб нашай краіне пачынаючы з часоў каменнага веку да нашых дзён.

Кіраўнік камітэта па маёмасці ўпэўнены, што ў краіне падрыхтаваны ўсе неабходныя заканадаўчыя акты, якія дазволяць краіне ў бліжэйшыя два гады пазбавіцца ад усіх аб'ектаў нерухомай маёмасці, якія выкарыстоўваюцца неэфектыўна. Вядома, што спецыялісты камітэта рыхтуюць пералік прамысловых прадпрыемстваў рэспубліканскай уласнасці, якія падлягаюць акцыянаванню ў гэтым годзе. Сапраўды буйных і моцных айчынных прадпрыемстваў у гэтым пераліку не будзе.

Паводле слоў дырэктара Фонду дзяржаўнай маёмасці Дзяржаўнага камітэта па маёмасці РБ Наталлі Жарнасек, цяпер у рэспубліканскай камунальнай уласнасці знаходзіцца каля 17,5 тысячы аб'ектаў, нерухомая маёмасць якіх не выкарыстоўваецца ў гаспадарчым абароце. Асобныя з іх будуць перададзены для выкарыстання пад дзяржаўныя патрэбы або ў арэнду іншым суб'ектам гаспадарання. Разам з тым Наталля Жарнасек лічыць, што каля 25—30 працэнтаў такіх аб'ектаў з неліквіднай маёмасцю будзе прадавацца на аўкцыёнах, дзе можа выкарыстоўвацца механізм першапачатковай цаны ў памеры адной базавай велічыні. Летась падобным чынам у краіне прададзена 80 не вельмі прывабных аб'ектаў.

Сяргей КУРКАЧ.

У ВІЦЕБСКУ ПАЧАСЦІЛІСЯ СПРОБЫ КРАДЗЯЖУ ОРДЭНАЎ І МЕДАЛЁЎ У ВЕТЭРАНАЎ ВАЙНЫ

Аб гэтым паведаміў ваенны камісар Віцебскай вобласці Уладзімір Селязнёў.

Апошнім часам у гарадскі ваенкамат ад ветэранаў вайны сталі паступаць паведамленні аб тым, што да іх пад выглядам супрацоўніка ваенкамата прыходзіў мужчына 40—50 гадоў, цікавіўся ўзнагародамі, а затым у пэўны час і дзень запрашаў у мясцовы ваенкамат быццам для таго, каб атрымаць матэрыяльную дапамогу. Пасля таго як ветэраны ў прызначаны дзень ішлі ў ваенкамат, у іх кватэры беспаспяхова спрабавалі пранікнуць невядомыя — дома ў старых заставаліся сваякі. Толькі ў адным выпадку злачынцу ўдалося скрасці два ордэны Чырвонага Сцяга.

Дзіяна КУРЫЛА, БЕЛТА.

БПС-БАНК

С 21 февраля 2008 года ОАО «БПС-Банк»
для размещения денежных средств предлагает
физическим лицам новые банковские продукты:

1. Срочный банковский депозит в белорусских рублях «Практичный»

Сроки привлечения	Процентная ставка (годовая, плавающая)
1 месяц	8
3 месяца	11
6 месяцев	12
1 год	13
2 года	14
3 года	14,5

- дополнительные взносы без ограничения суммы и периодичности внесения;
- автоматическое переоформление депозита;
- ежемесячная капитализация процентов;
- оформление депозита на имя другого лица;
- при досрочном востребовании депозита проценты выплачиваются по льготной шкале ставок.

2. Сберегательные сертификаты (именные и на предъявителя)

Срок обращения	Процентная ставка (годовых, фиксированная)	Номинальная стоимость (рублей)	Периодичность выплаты процентов
6 месяцев	13,5	от 500 000	Одновременно с погашением сберегательного сертификата

Одновременно ОАО «БПС-Банк» информирует вкладчиков о следующем:

В связи с прекращением с 21.02.2008 приема средств на «Условиях срочного банковского депозита на 1 месяц с автоматическим переоформлением в белорусских рублях» от 14.04.2003 № 01-05/48 автоматическое переоформление депозитов на указанных условиях осуществляется до 21.05.2008.

На депозиты, невостребованные после прекращения автоматического переоформления, начисление процентов будет производиться по ставке текущих счетов физических лиц в белорусских рублях.

Дополнительную информацию можно получить в любом учреждении ОАО «БПС-Банк» или по телефону в г. Минске 289 46 06.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 11.07.2007 года на осуществление банковской деятельности.
Возврат средств физических лиц в ОАО «БПС-Банк» гарантируется в соответствии с законодательством Республики Беларусь. УНП 100219673

Вучыць беражлівасці РУБЛЁМ

Ва ўрадзе

У Беларусі сёння ёсць энергарэсурсы, аднак тыя айчынныя вытворцы, якія дапусцілі перарасход энергіі, не павінны яе атрымліваць звыш запланаванага, толькі калі па іншых — рынкавых — цэнах, заявіў на ўчарашнім пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі.

На пасяджэнні разглядаліся мерапрыемствы па выкананні ў 2008 годзе Дзяржаўнай комплекснай праграмы мадэрнізацыі асноўных вытворчых фондаў Беларускай энергетычнай сістэмы, энергазберажэння і павелічэння долі выкарыстання ў рэспубліцы мясцовых паліўна-энергетычных рэсурсаў на перыяд да 2011 года. Дарэчы, паводле інфармацыі старшыні Дзяржстандарта Валерыя Карашкова, у студзені ў краіне было дадаткова зрасходавана каля 250 тон умоўнага паліва.

Прадпрыемствы неабходна на працягу 2—3 гадоў перавесці на энергазберагальны прынцып працы, зазначыў Сяргей Сідорскі. І за гэты час у краіны ёсць унікальная магчымасць выбудаваць новую энергасістэму нашых прадпрыемстваў. «Газ у рэшце рэшт будзе каштаваць 300 долараў, цана рэсурсаў таксама будзе расці — гэта зразумела ўсім», — падкрэсліў прэм'ер. Таму за адведзены час краіне неабходна выкарыстаць спрыяльныя магчымасці, атрыманыя ў выніку дамоўленасці Прэзідэнта Беларусі з Расіяй, і перавесці прадпрыемствы на энергазберагальны прынцып працы, зніжаць энергазатраты на вытворчасць адзінкі прадукцыі.

Між тым, тлумачачы перарасход паліва ў студзені, Валерый Карашкоў паведаміў, што гэта было звязана з умовамі надвор'я, павелічэннем загрузкі кампрэсарных станцый, зніжэннем імпарту электраэнергіі. Аднак у гэтым годзе, запэўніў ён, адыходу ад запланаваных паказчыкаў не будзе — для гэтага будуць прыняты неабходныя меры. Ён таксама праінфармаваў прысутных, што сёлета плануецца знізіць энергаёмістасць ВУП на 8 працэнтаў. Калі галіновыя і рэгіянальныя праграмы будуць выкананы ў поўным аб'ёме, то ў гэтым годзе можа быць зэканомлена каля 1 мільёна 628 тысяч туп.

Міністр энергетыкі Аляксандр Азярэц, які агучыў планы па сваёй галіне, паведаміў, што ў 2008 годзе ў эксплуатацыю будзе ўведзена 397 МВт электрычнай магутнасці. Рэалізацыя мерапрыемстваў па выкананні дзяржпраграмы дазволіць павысіць надзейнасць і эфектыўнасць забеспячэння галін эканомікі і насельніцтва энергіяй за кошт мадэрнізацыі энергетычных крыніц, будаўніцтва і рэканструкцыі электрычных і цеплавых сетак. Сёлета мяркуецца, у прыватнасці, рэалізаваць 5 інвестыцыйных праектаў па ўводзе энергетычных магутнасцяў, сярод якіх Лукомльская ГРЭС, ЦЭЦ-2, Лідская ЦЭЦ, Мінская ЦЭЦ-3. На мадэрнізацыю энергасістэмы і энергазберажэння Беларусі ў 2008 годзе плануецца накіраваць больш за 1,56 мільярда долараў ЗША.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Новае прызначэнне

ПРЫЯРЫТЭТЫ ДЗМІТРЫЯ КАРЗЮКА



За ўсю гісторыю сталічнай Дзяржаўтаінспекцыі такога маладога начальніка яшчэ не было. Нядаўна прызначанаму галоўнаму мінскаму «даішніку» Дзмітрыю Карзюку 36 гадоў. Праўда, гэта якраз той выпадак, калі маладосць — не загана. Ды і практыка ў Дзмітрыя Міхайлавіча таксама багатая. Ён прайшоў усе «прыступкі даішнай лесвіцы». Пачынаў з шараговага інспектара дарожна-патрульнай службы, узначальваў спецпадраздзяленне па забеспячэнні дарожнай бяспекі ўпраўлення сталічнай Дзяржаўтаінспекцыі, кіраваў аддзелам ДАІ Партызанскага раёна Мінска. А крыху больш як месяц таму Дзмітрый Карзюк быў прызначаны начальнікам УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама. Сёння Дзмітрый Міхайлавіч госць «Звязды».

(Заканчэнне на 7-й стар.)

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 08033 >

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.02.2008 г. (для б/н разлікаў)	
1 долар ЗША	2 147,00
1 еўра	3 139,42
1 латвійскі лат	4 532,88
1 літоўскі літ	914,94
1 чэшская крона	125,08
1 польскі злоты	884,18
1 расійскі рубель	87,56
1 украінская грыўня	426,69

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў	
Цэнтрабанк РФ	
USD	24,5206
10 UAH	48,1032
1000 BYR	11,4043
EUR	36,0992
Курс у гандлёвых кампаніях (на 19.02.2008 г.)	
USD	2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

УП «ГІПРАСЕЛЬБУД»: У АВАНГАРДЗЕ БУДАЎНІЦТВА НА ВЁСЦЫ

ДЛЯ ДАВЕДКІ. *УП «Гіпрасельбуд» з'яўляецца пераемнікам інстытута «БелНДІгіпрасельбуд», які быў створаны 5 мая 1945 года з мэтай распрацоўкі праектна-каштарыснай дакументацыі для аднаўлення вытворчай базы і жылога фонду калгасаў і саўгасаў рэспублікі.*

У 1959 годзе ўпершыню ў краіне інстытут пачаў састаўленне схем і праектаў раённых планіровак сельскіх населеных пунктаў, якія цяпер з'яўляюцца асновай для праектавання забудовы пасёлкаў і аграгарадкоў. У забудове беларускай вёскі шырокае прымяненне знайшлі тыпавыя і эксперыментальныя праекты жылых будынкаў, дамоў культуры, гандлёвых цэнтраў і іншых устаноў, распрацаваныя спецыялістамі інстытута.

З 1967 года інстытут удзельнічаў у рабоце па комплексным праектаванні эксперыментальна-паказальных гаспадарак, такіх, як Верцялішкі, Леніна, Сноў і іншых, а таксама ў ажыццяўленні комплекснай праграмы развіцця беларускага Палесся, якое стала сёння рэгіёнам індустрыяльнага земляробства і жывёлагадоўлі.

Па праектах інстытута ўзведзены буйныя жывёлагадоўчыя комплексы, птушкафабрыкі і цяплічныя камбінаты — такія, як агракомплексы «Мір» і «Лошыца», цяплічныя камбінаты ў саўгасах «Мінскі» і «Ждановічы», бройлерныя птушкафермы «Смалявіцкая», «Дзяржынская», «Маладзечанская» і шэраг іншых.

(Заканчэнне на 6-й стар.)

Заслужаны архітэктар рэспублікі Нона НЯДЗЕЛЬКА (справа) з маладымі калегамі Аленай ЧАРНАВУС і Марыяй КАЧАНОЎСКАЙ.

ГАШЫШ І МАРЫХУАНА ПАСАДЗІЛІ МІЛІЦЫЯНЕРА ЗА КРАТЫ

Было гэта ў Гомелі, калі малады старшы лейтэнант міліцыі трапіў у поле зроку ўпраўлення Камітэта дзяржаўнай бяспекі ў злачынным набыцці, захоўванні, перавозцы і збыце наркатычных сродкаў. Ён быў арыштаваны якраз у той момант, калі ў аўтамабілі прадаў за 150 «баксаў» пакет марыхуаны незнаёмцу. А пры асабістым вобыску ў яго знайшлі яшчэ і гашыш. Наркотыкі, акрамя гэтага, былі выяўлены і ў яго гаражы. І вось сумны вынік: на чатыры гады — за краты...

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

САМКА ЗУБРА ЗАГІНУЛА Ў ПЯТЛІ

Пры правядзенні прыродаахоўнага рэйду работнікі Бягомльскай міжрайінспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету сумесна з супрацоўнікамі дзяржаўнай прыродаахоўнай установы «Бярэзінскі біясферны запаведнік» атрымалі звесткі аб знойдзеных рэштках загінулага зубра. Па прыбыцці на месца было ўстаноўлена, што самка зубра трапіла нагой у металічную пятлю, якая была ўстаноўлена на сцежцы дзікоў, і загінула ад знясілення каля двух-трох месяцаў таму. Паколькі прыродным рэсурсам быў нанесены ўрон у асабліва буйным памеры — 285 базавых велічынь, на месца выклікаліся прадстаўнікі арандатара паляўнічых угоддзяў і следча-аператыўная група Барысаўскага РУУС.

Сяргей РАСОЛЬКА.

КАНСТЫТУЦЫЙНЫ КАНТРОЛЬ ПАВІНЕН БЫЦЬ УЗМОЦНЕНЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пры гэтым Прэзідэнт падкрэсліў, што яму не хапае інфармацыі аб сітуацыі ў праваахоўных органах, не хапае прафесійнай і адэкватнай ацэнкі: «Я адчуваю, што вакол мяне пачынаюць дзейнічаць нейкія актыўныя асобы, каб кіраваць пракуратурай. Рыгор Аляксеевіч, калі хочаце працаваць, майце на ўвазе: гэта катэгарычна недапушчальна».

Прэзідэнт адзначыў, што ў нас некаторыя суддзі і некаторыя пракуроры «заняліся палітыкай»: «Бачыце, іх хвалюе, як на нас паглядзіць Амерыка або Еўрасаюз. Гэта не вашы праблемы, гэта праблемы Прэзідэнта краіны, часткова прэм'ер-міністра, мы будзем разбірацца з гэтымі палітычнымі пытаннямі. А ў вас ёсць закон, дзейнічайце ў адпаведнасці з ім, супастаўляючы свае дзеянні з запытамі нашага грамадства».

Аляксандр Лукашэнка прывёў прыклад у сувязі з гэтым: «Нядаўна быў на «Віцязі». З-за галавацяпства МУС прадпрыемства не можа выйсці з таго становішча, у якое яго загналі. А дзе была пракуратура, чаму аказалася, што следства вядзецца абы-як столькі часу? Стаўцеся да людзей па-чалавечы, асабліва да кіраўнікоў, бо мы можам у момант апынуцца ў такім жа стане. Калі вы прад'яўляеце прэтэнзіі да кіраўнікоў высокага ўзроўню, то прад'яўляйце іх так, каб нельга было выкруціцца. А то пайшла практыка, што нехта некаму сказаў, указанне даў, цяпер на свабодзе ходзіць з тэлефонам, давайце службовую асобу пасадзім, а злачынец, які быццам бы хабар даў і злачынства ўчыняў, ён сёння на свабодзе».

Прэзідэнт таксама папярэдзіў Адміністрацыю Прэзідэнта: «Ніякага націску на вышэйшыя органы дзяржаўнай улады быць не павінна. Ціснуць, ствараць нейкі арэол непраўдападобнасці вакол службовых асобаў — гэтага быць не павінна, гэтаму неабходна пакласці канец. Вы спецыялісты, эксперты, памочнікі Прэзідэнта. Вы — фільтр. Вы павінны прафільтраваць усю інфармацыю і прадставіць Прэзідэнту сваю пазіцыю, свой пункт гледжання. Хоць дзесяць пунктаў гледжання, чым больш, тым лепш — я іх усе чытаю і раблю адпаведныя вывады». Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ў бліжэйшы час пытанні дзейнасці пракуратуры і праваахоўных органаў будуць асобна абмеркаваны на вышэйшым узроўні.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

Мікалай Чаргінец: «У галіне літаратуры павінна быць адзіная дзяржаўная палітыка»

Учора прайшло пашыранае пасяджэнне праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Старшыня грамадскага аб'яднання «Саюз пісьменнікаў Беларусі» Мікалай Чаргінец узнагародзіў Нацыянальную бібліятэку дыпломам за ўклад у развіццё літаратуры і перадаў ад імя аб'яднання «Бібліятэку саюза пісьменнікаў Беларусі» — творы членаў творчага аб'яднання, выдадзеныя летась. Першым сакратаром СПБ стаў Віктар Праўдзін, ён змяніў на гэтай пасадзе Анатоля Аўруціна.

Мікалай Чаргінец падвёў вынікі работы арганізацыі ў мінулым годзе. Зараз членамі Саюза пісьменнікаў Беларусі з'яўляюцца каля 400 літаратараў, 200 з якіх перайшлі з саюза беларускіх пісьменнікаў. Дзейнічаюць 6 абласных і мінская гарадская арганізацыі, апошняя — самая вялікая (каля 200 пісьменнікаў). Вялікія арганізацыі ў Мінскай (40), Віцебскай (39) і Гомельскай (35) абласцях. Створаны секцыі прозы, паэзіі, крытыкі, дзіцячай, ваенна-патрыятычнай літаратуры. Летась арганізаваны штогадовы конкурс на літаратурныя прэміі (ўпершыню ўзнагароды былі ўручаны ў Шклове) акрамя таго, тут з'явіліся вуліцы ў гонар беларускіх класікаў Янкі Купалы і Якуба Коласа. Пачала выходзіць і «Бібліятэка саюза пісьменнікаў Беларусі», што паводле слоў Мікалая Чаргінца, не зрабіла дагэтуль ні адна іншая пісьменніцкая арганізацыя. Дзякуючы гэтаму летась выдадзена каля 180 кніг беларускіх аўтараў. Пачатак пакладзена выданне твораў класікаў Якуба Коласа, Янкі Купалы, Івана Чыгрынава, Максіма Танка, Івана Мележа, Івана Шамякіна.

«Цяпер пачынаецца трэці этап развіцця Саюза пісьменнікаў Беларусі», — адзначыў Мікалай Чаргінец. І разам з новымі задачамі, якія стаяць перад саюзам пісьменнікаў, старшыня грамадскага аб'яднання акрэсліў і недахопы, над якімі трэба папрацаваць. У прыватнасці, што датычыцца некаторых пісьменнікаў з высокімі пасадамі, то чым вышэй яны падняліся, тым больш павінны цаніць працу тых, хто абраў іх на гэту пасаду. «Творчыя калектывы заўсёды вызначаліся духам спаборніцтва і нават саперніцтва. Таму вельмі асцярожна трэба падыходзіць да пытанняў ацэнкі адзін аднаго. Нам трэба не змагацца адзін супраць аднаго, а служыць на карысць літаратуры і яе развіцця. У галіне літаратуры павінна праводзіцца адзіная дзяржаўная палітыка», — зазначыў Мікалай Чаргінец.

Алена КРАВЕЦ.

«Прамая лінія»

ПРАЦОЎНАЯ «РАСКЛАДКА»: ЗАРОБКІ, ВОДПУСКІ, КАНТРАКТЫ

Напэўна, нельга сустрэць чалавека, у якога б, прынамсі, аднойчы не ўзніклі непаразуменні, а то і спрэчкі на рабоце. Таму невыпадкова, што наша чарговая «прамая лінія» па працоўным заканадаўстве аказалася па-сапраўднаму «гарачай». Кантракты, размеркаванні, водпускі, некаторыя асаблівасці занятасці інвалідаў, працоўны час і ўмовы працы — гаворка аб усім гэтым працягвалася больш чым паўтары гадзіны. Але аб усім па парадку. Такім чынам, на пытанні чытачоў «Звязды» адказвае намеснік дырэктара дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Ірына Фёдараўна ШЫЛЯЕВА.



☎— З'яўляюся інвалідам II групы, паводле заключэння МРЭК магу працаваць 35 гадзін у тыдзень. У сувязі з гэтым патлумачце, як мне павінна выплачвацца зарплата: выходзячы з поўнай стаўкі ці прапарцыянальна адпрацаванаму часу?

Вольга Мікалаеўна Ваўкавец, г. Мінск

— Для працуючых інвалідаў ўмовы працы (і ў тым ліку аплата, рэжым працоўнага часу, часу адпачынку, працягласць водпуску) вызначаюцца працоўным дагаворам ці калектыўным дагаворам. Прычым пагаршэнне становішча ці абмежаванне правоў інвалідаў у параўнанні з іншымі работнікамі з'яўляюцца недапушчальнымі.

Для інвалідаў I і II груп вызначаецца скарочаная працягласць працоўнага часу — не больш за 35 гадзін у тыдзень. Пры гэтым аплата іх працы робіцца ў такім жа памеры, як аплата працы работнікаў адпаведных прафесій і пасад пры поўнай працягласці працоўнага часу.

☎— Непакоюць з Мінска. Ці маю я права, як інвалід III групы са скарочаным працоўным тыднем, атрымліваць поўную зарплату?

— Атрымліваць поўную зарплату па адпаведнай прафесіі і пасадзе ў выпадку няпоўнага працоўнага часу маюць толькі інваліды I і II груп. А вось інвалідам III групы аплата павінна робіцца прапарцыянальна адпрацаванаму часу.

☎— У мяне адразу два пытанні. Па-першае, якая працягласць водпуску зараз вызначана для інвалідаў II групы? А, па-другое, ці ёсць у інваліда II групы права на скарочаны працоўны дзень паводле новага Працоўнага кодэкса?

Георгій Іванавіч, г. Навагрудак

— Тэрмін асноўнага водпуску для работнікаў, якія з'яўляюцца інвалідамі, складае 30 каляндарных дзён. Што ж да другога пытання, то варта паўтарыцца — працягласць працоўнага часу для інваліда II групы не можа перавышаць 35 гадзін у тыдзень.

Наймальнік абавязаны вызначыць няпоўны працоўны дзень або няпоўны працоўны тыдзень згодна з медыцынскімі рэкамендацыямі. Прычым няпоўны працоўны час вызначаецца паводле дамоўленасці паміж работнікам і наймальнікам як пры прыёме на работу, так і ў далейшым. Так, пры прыёме ўмова няпоўнага працоўнага часу ўключаецца ў працоўны дагавор. А пераход на рэжым няпоўнага часу ў перыяд працоўнай дзейнасці афармляецца загадам або распараджэннем.

☎— Ці могуць патрапіць пад скарачэнне інваліды III групы? І ці можа наймальнік звольніць па стане здароўя ў выпадку, калі інвалід выконвае работу, якая проціпаказана яму ўрачэбна-кансультацыйнай камісіяй?

Яўгенія Іванаўна Грушэўская, Карэліцкі раён

— Ніякіх дадатковых пераваг падчас скарачэння ў інвалідаў III групы няма. Аднак пры роўнай вытворчасці працы і кваліфікацыі перавага ў пакіданні на працоўным месцы павінна аддавацца менавіта інвалідам незалежна ад іх групы.

Што ж да другога пытання, то ў выпадку медыцынскіх проціпаказанняў да выканання той ці іншай работы звольніць інваліда наймальнік проста абавязаны.

☎— Патлумачце, якім чынам наймальнік можа зменшыць работніку дадатковыя меры стымулявання?

Аляксандр Кузьміч, г. Мінск

— Калі гаворка ідзе аб мерах дадатковага стымулявання працы пры пераводзе на кантракт або пры яго заключэнні, то трэба адзначыць, што зменшыць іх магчыма толькі паводле падстаў, прадугледжаных у тых жа кантрактах.

Калі ж гаворка ідзе аб прэміях ці дадатковых узнагароджаннях, то зменшыць іх можна паводле падстаў, прадугледжаных зноў-такі ў кантракце ці ў палажэнні аб аплаце працы.

☎— Ці могуць зняць надбаўку за шкодныя ўмовы ў сувязі з тым, што ў арганізацыі не праведзена новая атэстацыя працоўных месцаў?

Аляксандра Анатольеўна, г. Гомель і іншыя чытачы

— Новае палажэнне аб правядзенні атэстацыі працоўных месцаў павінна з'явіцца ў самы бліжэйшы час, а пакуль тут дзейнічаюць ранейшыя нормы. Прычым, калі надбаўкі былі раней, то яны павінны захоўвацца, прынамсі, да моманту правядзення наступнай атэстацыі. Зрэшты, каб разабрацца ў сітуацыі дэталёва, я раю вам звярнуцца да дзяржінспектара па экспертызе працы ў Камітэце па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гомельскага гарвыканкама або ў Гомельскае абласное ўпраўленне дзяржінспекцыі працы.

☎— Летась мне нехта казаў, што ёсць такое правіла: калі муж і жонка працуюць на адным прадпрыемстве, ім прадастаўляць водпуск у адзін і той жа час. Ці так гэта? Маё начальства, напэўна, з чыста чалавечых памкненняў, менавіта так і робіць. Але ж іншыя задаюць пытанне: «А чаму яны павінны адпачываць разам?»

Святлана Ярмалюк, г. Брэст

— Чарговасць прадастаўлення працоўных водпускаў вызначаецца графікам, які зацвярджаецца наймальнікам па ўзгадненні з прафкамам або, у выпадку адсутнасці прафсаюза, наймальнікам па ўзгадненні з работнікам. Пры гэтым канкрэтная дата пачатку водпуску вызначаецца паводле дамоўленасці паміж работнікам і наймальнікам.

Варта мець на ўвазе, што ў заканадаўстве прадугледжваецца шэраг катэгорый работнікаў, якім наймальнік абавязаны запланаваць водпуск у летні ці іншы зручны час. Да такіх катэгорый адносяцца асобы ва ўзросце да 18 гадоў; ветэраны Вялікай Айчыннай вайны і баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў; жанчыны, якія маюць дваіх і больш дзяцей ва ўзросце да 14 гадоў або дзіця-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў; работнікі, якія перанеслі прамянёвую хваробу ў выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС; работнікі, якія сталі ў выніку катастрофы на ЧАЭС інвалідамі; работнікі, якія бралі ўдзел у ліквідацыі наступстваў аварыі на ЧАЭС у 1986—1989 гадах у зоне эвакуацыі (адчужэння) і ў 1986—1987 гадах у зоне першачарговага адсялення ці ў зоне наступнага адсялення; работнікі, якія былі эвакуяваныя і адселеныя з зонаў эвакуацыі (адчужэння), першачарговага і наступнага адсялення, а таксама работнікі, якія пакінулі гэтыя зоны пасля аварыі на ЧАЭС самастойна; донары, што маюць знакі «Ганаровы донар Рэспублікі Беларусь», «Ганаровы донар СССР» ці «Ганаровы донар таварыства Чырвонага Крыжа БССР», а таксама ў іншых выпадках, вызначаных у калектыўным ці працоўным дагаворы.

Апроч таго, водпуск павінен прадстаўляцца ў пэўны перыяд наступным катэгорыям: работнікам, якія навучаюцца ў вячэрніх ці зменных агульнаадукацыйных установах і ўстановах, што забяспечваюць атрыманне прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі і адукацыі пасля заканчэння ВНУ, спецыяльных вучэбна-выхавачых установ, спецыяльных установ адукацыі, спецыялізаваных установ вытворчага навучання (у летні час); жанчынам перад водпускам па цяжарнасці і родах ці пасля яго; працуючым жонкам (мужам) ваеннаслужачых — адначасова з водпускам іх мужоў (жонак).

Такім чынам, адначасовае прадстаўленне водпуску мужу і жонцы, якія працуюць у адной арганізацыі, з'яўляецца правам, але не абавязкам наймальніка. І вельмі прыемна, што тут наймальнік на самай справе ідзе вам насустрач.

☎— Ці прадастаўляецца цяпер дадатковы водпуск за працяглы стаж работнікам жыллёва-камунальнай гаспадаркі і работнікам лазні? І, да слова, колькі трэба адпрацаваць гадоў для «працяглага стажу», і ці могуць быць у працяглым стажы перапынкі?

Пётр Васільевіч Ляхновіч, г. Сянно

— Работнікам, якія маюць працяглы стаж работы ў адной арганізацыі ці галіне, наймальнік можа вызначыць дадатковы водпуск за кошт уласных сродкаў працягласцю да 3 каляндарных дзён. Пры гэтым парадак, умовы і працягласць такога водпуску вызначаюцца калектыўным дагаворам, працоўным дагаворам або наймальнікам.

☎— Якая павінна быць працягласць працоўнага дня ў лабаранта клінічнай і біяхімічнай лабараторый? Ці павінны даплачваць лабарантам за аказанне платных паслуг? І яшчэ. Ці могуць патрабаваць, каб мы пісалі заявы аб пераводзе на 0,5 стаўкі ў сувязі з тым, што ў зімовы час запаўняльнасць санаторыя складае не 600, а 300 чалавек?

Юрый Аляксеевіч, Віцебскі раён

— Давайце па парадку. Першае. Для работнікаў, якія занятыя ў шкодных ці небяспечных умовах, вызначаецца скарочаная працягласць працоўнага часу — не больш за 35 гадзін у тыдзень. Прычым сам спіс вытворчасцяў, цэхаў, прафесій і пасад са шкоднымі ўмовамі, работа на якіх дае права на скарочаную працягласць працоўнага часу і дадатковы водпуск, зацверджаны пастановай Міністэрства працы ад 29 ліпеня 1994 года № 89, а парадак выкарыстання гэтага Спісу зацверджаны пастановай Міністэрства працы ад 20 сакавіка 1995 года № 28. Па-другое. Формы і сістэмы аплаты працы (і ў тым ліку стымулюючага і кампенсацыйнага характару) работнікаў арганізацый, якія фінансуюцца з бюджэту і карыстаюцца дзяржаўнымі датацыямі, вызначаюцца наймальнікам на падставе калектыўнага дагавора, пагаднення ці працоўнага дагавора, а памеры аплаты працы — урадам ці ўпаўнаважаным ім органам. Таму па тлумачэнні наконт аплаты за аказанне платных паслуг лепш за ўсё звярнуцца ў міністэрства ці ведамства, якому падпарадкоўваецца ваша арганізацыя.

І па-трэцяе. У сувязі з абгрунтаванымі вытворчымі, арганізацыйнымі ці эканамічнымі прычынамі наймальнік мае права з папярэджаннем не пазней чым за месяц змяніць істотныя ўмовы працы работніка пры працягу ім работы па той жа, раней вызначанай у працоўным дагаворы, спецыяльнасці, кваліфікацыі ці пасадзе. Да слова, пад істотнымі ўмовамі працы маюцца на ўвазе сістэмы і памеры аплаты працы, рэжым работы, гарантыі, разрад, назва прафесіі ці пасады, вызначэнне ці адмена няпоўнага працоўнага часу, сумяшчэнне прафесій і г.д.

Прычым варта заўважыць: у выпадку адмовы работніка ад працягу работы ў сувязі са зменай істотных умоў працы, працоўны дагавор спыняецца з выплатай выхадной дапамогі ў памеры не менш за двухтыднёвы сярэдні заробак.

(Працяг будзе.)

Матэрыялы «прамой лініі» падрыхтаваў Сяргей ГРЫБ. Фота аўтара.

Абзац

● У Мінску а палове дзевятай раніцы ў цаху сталічнага прамысловага прадпрыемства загінуў 36-гадовы рабочы. Як удакладнілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзеле інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, здарэнне адбылося ў цаху Мінскага домабудаўнічага камбіната. Паводле папярэдняй інфармацыі, фармоўшчык па неасцярожнасці трапіў у механізм станка і ад атрыманых цялесных пашкоджанняў загінуў на месцы здарэння.

● **Ахвярай агню сталі двое старых жыхароў вёскі Сігневічы Бярозаўскага раёна. Пажар узнік позна ўвечары. Паводле меркавання спецыялістаў, прычынай яго стала няспраўная печка. 90-гадовы гаспадар і яго 81-гадовая жонка загінулі.**

● 455 дрэў вольхі, бярозы, асіны былі незаконна высечаны грамадзянінам, што працуе вартаўніком на Райтанаўскім вытворчым участку ААТ «Бараневічы-хлебапрадукты». Прычым аб'ектам сваёй «здабычы» ён выбраў насаджэнні ў водаахоўнай зоне ракі Свідроўка Ляхавіцкага раёна. Гэты факт быў выяўлены супрацоўнікамі Ганцавіцкай міжрайінспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету. Урон прыродным рэсурсам быў зафіксаваны ў асабліва буйным памеры — 297,8 базавай велічыні.

● **У вёсцы Любішчыцы Івацэвіцкага раёна 56-гадовы мужчына моцна збіў жонку. У бальніцу яе даставілі з траўмай жывата і разрывам селязёнкі. Дэбашыр затрыманы. Суда ён будзе чакаць у следчым ізалятары. А ў Баранавічах асуджана жанчына, якая абліла палюбоўніцу мужа едкай вадкасцю. На судзе яна атрымала абмежаванне волі на чатыры гады, акрамя таго, мусіць кампенсаваць пацярпелай затраты на лячэнне.**

● Ледакольны цеплаход «Сібір» выкарыстаны для ачысткі рэчышча Прыпяці ад ледзяных таросаў. За 14 кіламетраў ад Мазыра ўніз па цячэнні ракі ў выніку нядаўна прайшоўшага ледаходу ўтварыўся затор.

● **З Кафедральнага сабора бельгійскага горада Турнэ скрадзена бясцэнная рэліквія — візантыйскі крыж з частачкай крыжа, на якім быў распяты Хрыстос. Двое ўзброеных людзей з кувалдамі і бітамі разбілі шкло сховішча і скралі 13 каштоўных прадметаў. Крыж не застрахаваны, паколькі лічыцца бясцэнным. Адзін раз на год яго даставалі са сховішча для Вялікай працэсіі, і тады яго страхавалі на 25 млн еўра.**

● У Мінскім метрапалітэне зарэгістраваны летась 392 злачынствы, у тым ліку 319 крадзяжоў маёмасці. 121 раз кралі кашалькі, 57 — дакументы, каля 20 — асабістыя рэчы, 141 — мабільныя тэлефоны.

Поўны абзац

Нядаўна ў Вялікабрытаніі быў вынайдзены бюстгальтар, у які можна заліваць алкаголь. Аксесуар «Вінная стойка» выглядае як звычайны бюстгальтар спартыўнага тыпу, аднак у яго ўшыты поліурэтанавы пухір, запаўняць які можна любой вадкасцю, у тым ліку і алкаголем, паведамляе The Sun. Унутры «Вінной стойкі» ёсць трубка, пры дапамозе якой вадкасць з ліфчыка можна пакрысе піць. Чым болей заліта ў ліфчык-фляжку, тым большым робіцца памер бюсту яе ўладальніцы. Усяго ў бюстгальтар змяшчаецца бутэлька віна (750 мл — пры гэтым памер грудзей павялічваецца на два поўных памеры. Першыя партыі бюстгальтараў (каштуе ён каля 40 $) разышліся праз Інтэрнэт амаль імгненна.

● **У Швецыі праведзена першая ў Еўропе аперацыя па выдаленні апендыкса праз рот. Паводле слоў урачоў, 30-гадовая пацыентка адчувае сябе добра і ўжо выпісана з бальніцы, паведамляе РІА «Навіны» са спасылкай на шведскі тэлеканал ТВ 4. У бліжэйшай будучыні шведскія ўрачы плануюць правесці каля трыццаці такіх умяшанняў. Аперацыя заснавана на ўвядзенні гібкіх эндаскапічных інструментаў праз рот у страўнік. Адтуль з дапамогай невялікага праколу інструменты ўводзяць у брушную поласць, дзе робіцца выдаленне запалёнага апендыкса. Выдалены орган дастаецца такім жа чынам. Перавагай новай тэхнікі з'яўляецца поўная адсутнасць шрамаў па целе і скарачэнне перыяду аднаўлення, змяншаецца рызыка інфекцыйных ускладненняў. На думку некаторых спецыялістаў, такія аперацыі больш гуманныя і эканамічна выгадныя, чым традыцыйныя. Раней аперацыі па выдаленні апендыкса праз рот праводзіліся толькі ў Індыі і ЗША.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармацыйных агенцтваў.

Спорт-тайм

СПАРТЫЎНЫ «ОСКАР» ДАСТАЎСЯ...

У панядзелак у канцэртнай зале Марыінскага тэатра Санкт-Пецярбурга адбылася ўрачыстая цырымонія ўручэння ўзнагарод лепшым спартсменам 2007 года — Laureus World Sports Awards.

Расія стала гаспадыняй спартыўнага «Оскара» ўпершыню. У цырымоніі ўзяў удзел прэзідэнт Уладзімір Пуцін. Лепшымі спартсменамі мінулага года былі названы тэнісісты — бельгійка Жусцін Энэн (на фота) і швейцарац Ражэ Федэрэр. У катэгорыі «Адкрыццё года» першым стаў брытанец Льюіс Хэмілтан, віцэ-чэмпіён свету па «Формуле-1», а ў намінацыі «Вяртанне года» перамагла яго суайчынніца, бягуння на доўгія дыстанцыі Пола Рэдкліф. Лепшай камандай года аказалася зборная ПАР, якая заваявала тытул чэмпіёна свету па рэгбі. Сярод прадстаўнікоў актыўных відаў спорту вызначыўся амерыканскі сноўбардыст Шон Уайт. Лепшай спартсменкай з абмежаванымі магчымасцямі прызнана галандская тэнісістка-калясачніца Эстэр Вергеэр. Прэмію «За выдатныя спартыўныя дасягненні і ўклад у развіццё спорта» дасталася вядомаму скакуну з шастом Сяргею Бубку. Экс-прэзідэнт WADA Рычард Паунд атрымаў спецыяльную прэмію «За высокі спартыўны дух». Амерыканцам Брэндану і Шону Туохі ўручылі прэмію «Спорт у імя дабрыні».

ЖАНОЧАЯ ЭСТАФЕТА СТАЛА ПЯТАЙ

Жаночай эстафетай 4 па 6 км 17 лютага ў шведскім Эстэрсундзе завяршыўся чэмпіянат свету па біятлоне. Зборная Беларусі ў складзе Людмілы Калінчык, Дар'і Домрачавай, Вольгі Назаравай і Вольгі Кудрашовай заняла пятае месца з вынікам 1 гадзіна 11 хвілін 59 секунд (0 штрафных кругоў, 6 дадатковых патронаў). На чацвёртым этапе Вольга Кудрашова бегла трэцяй, аднак ёй не хапіла хуткасці, каб утрымаць бронзавую пазіцыю. Залаты медаль у каманды Германіі, сярэбраны — у біятланістак Украіны, бронзавы — у францужанак.

МІРНЫ НАРЭШЦЕ ВЫЙГРАЎ

Першага ў сёлетнім сезоне поспеху дасягнулі беларус Максім Мірны і брытанец Джэймі Мюрэй. 17 лютага ў фінале парнага разраду на турніры ў Дэльрэй-Біч (Фларыда, ЗША), яны адолелі наймацнейшы дуэт свету — амерыканцаў Боба і Майкла Браянаў. 30-гадовы Мірны выйграў 34-ы турнір у парным разрадзе, яго партнёр, якому 13 лютага споўнілася 22 гады, — чацвёрты. Перамога над братамі Браянамі стала рэваншам за студзеньскае паражэнне на турніры ў Сіднэі.

«АРКАТРОН» У ЧВЭРЦЬ ФІНАЛЕ КУБКА ВЫКЛІКУ

Мінскі гандбольны клуб «Аркатрон» выйшаў у чвэрцьфінал еўрапейскага Кубка выкліку. У 1/8 фіналу сталічная каманды па выніках дзвюх сустрэч (29:16 дома і 36:37 у гасцях) абыграла «Прышціну» з Косава.

«АРСЕНАЛ» ПРАВАЛІЎСЯ

У 1/8 фіналу Кубка Англіі «Манчэстар Юнайтэд» не пакінуў каменя на камені ад лонданскага «Арсенала». Тры мячы ў вароты Йенса Лемана ўляцелі яшчэ да перапынку. Фінальны свісток зафіксаваў канчатковы вынік 4:0. Акрамя «Арсенала» з Кубка выбыў яшчэ і «Ліверпуль», які прайграў на сваім полі камандзе «Барнслі» — 1:2.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ГЕНСЕК ААН НЕ ЗБІРАЕЦЦА АНУЛЯВАЦЬ НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ КОСАВА

Савет Бяспекі не змог выпрацаваць адзіную пазіцыю па пытанні аб аднабаковым абвяшчэнні незалежнасці Косава.

Расія, Кітай, ПАР, В'етнам, Лівія і Інданэзія прынялі бок Сербіі, а Бельгія, Харватыя, Германія, Італія, Францыя, ЗША і Вялікабрытанія заявілі, што Косава павінна стаць незалежнай дзяржавай, паведамляецца на сайце ААН. Кіраўнік Аб'яднаных Нацый Пан Гі Мун адмовіўся ініцыяваць працэс і аспрэчваць незалежнасць Косава, як таго жадала Расія. Ён заявіў, што незалежнасць прызнаецца дзяржавамі, а не сакратарыятам ААН.

Расія лічыць дзеянні косаўскага парламента незаконнымі і патрабуе, каб кіраўнік Місіі ААН у Косаве абвясціў акт абвяшчэння незалежнасці несапраўдным і не маючым сілы. Пастаянны прадстаўнік Расіі Віталь Чуркін заявіў, што дэкларацыя аб незалежнасці Косава і яе прызнанне іншымі дзяржавамі ствараюць небяспечны прэцэдэнт. Паводле яго слоў, Расія будзе прызнаваць Сербію ў яе ранейшых дзяржаўных межах.

РЭВАЛЮЦЫЯ ПРАЦЯГВАЕЦЦА. БЕЗ ФІДЭЛЯ?

Кубінскі лідар Фідэль Кастра абвясціў, што адмаўляецца ад вышэйшага дзяржаўнага паста — старшыні Дзяржаўнай рады Рэспублікі Куба, паведамляе брытанскі тэлеканал Sky news са спасылкай на мясцовыя СМІ.

«Маім дарагім суграмадзянам, якія аказалі мне невымерны гонар абраць мяне членам парламента, у якім будуць прынятыя найважнейшыя для лёсу Рэвалюцыі рашэнні, я паведамляю, што не маю намеру і не дам сваёй згоды на тое, каб заняць пост старшыні Дзяржрады і Галоўнакамандуючага», — гаворыцца ў заяве Кастра. «Я здрадзіў бы майму сумленню, прымаючы на сябе абказнасць, якая патрабуе мабільнасці і поўнай самаадданасці, якіх я пазбаўлены па фізічных прычынах. Я кажу гэта без драматызму», — заявіў камандантэ.

«УСЕМАГУТНЫ ШЧЫТ» ЯПОНІІ ЎРЭЗАЎСЯ Ў РЫБАЦКУЮ ШХУНУ

Пяць вартавых суднаў і чатыры верталёты вядуць пошукі двух зніклых без вестак рыбакоў са шхуны, якая затанула ў аўторак пасля сутыкнення з самым сучасным японскім караблём проціракетнай абароны «Атаго», абсталяваным найноўшай камп'ютарнай сістэмай сачэння і навядзення.

«Атаго» ўрэзаўся ў невялікае судна і раскалоў яго напалам, нягледзячы на спакойнае мора і адносна добрую бачнасць. Праверка паказала, што менавіта вайсковы карабель быў віноўнікам інцыдэнту, які адбыўся прыкладна за 125 км на поўдзень ад Токіо. На борце шхуны былі толькі два рыбакі — бацька і сын.

Сутыкненне адразу выклікала вялікі шум у Японіі: высветлілася, у прыватнасці, што ВМС рапартавалі ўраду аб надзвычайным здарэнні са значным спазненнем. Здзіўленне ў краіне выклікала і тое, што нашпігаваны электронікай і найноўшымі радарамі карабель не заўважыў перад сабой лодку даўжынёй 15 метраў. «Усемагутны шчыт, закліканы перахапляць усе ракеты, якія ляцяць на Японію, прадэманстраваў нечаканую слепату», — кантатуе мясцовае інфармацыйнае агенцтва.

МАБІЛЬНЫЯ ТЭЛЕФОНЫ СПРЫЯЮЦЬ РАКУ СЛІННЫХ ЗАЛОЗ?

Частыя гутаркі па мабільным тэлефоне павышаюць рызыку развіцця раку слінных залоз.

Аб гэтым сведчыць даследаванне ізраільскіх навукоўцаў, у якім узялі ўдзел каля пяцісот пацыентаў, што пакутавалі пухлінамі слінных залоз. Высветлілася таксама, што найболей схільныя да захворвання жыхары сельскай мясцовасці.

Проектная декларация объекта долевого строительства

ОАО «Белбуд» информирует юридических и физических лиц о создании объекта долевого строительства многоквартирного жилого дома № 18 (по генплану) в границах ул. Притыцкого — ул. Лобанка — ул. Одинцова в г. Минске.

Сведения о застройщике

Открытое акционерное Общество «Белбуд» создано и утверждено общим собранием учредителей 06.09.1994 года. Учредителем Общества являются крупнейшие строительные тресты и заводы строительной индустрии Республики Беларусь.

Целью создания Общества является реализация инвестиционных проектов в различных сферах экономики Республики Беларусь, осуществление любых видов хозяйственной деятельности, не запрещенных законодательством.

Основным видом деятельности Общества является разработка и реализация проектов по строительству.

ОАО «Белбуд» зарегистрировано 18.11.1994 Минским горисполкомом. Прошло перерегистрацию 10.02.2000 и решением Мингорисполкома № 149 зарегистрировано в ЕГР за № 100794022. УНН 100794022. ОКПО 28650455.

Юридический адрес и местонахождение Общества: 220113, город Минск, улица Восточная, дом 133, офис 1. Тел./факс 237 29 50.

Режим работы: понедельник — пятница с 8.30 до 17.30. Обеденный перерыв с 13.00 до 14.00.

Сведения о проектах строительства

В течение трех последних лет реализованы следующие инвестиционные проекты:

1. 6-7-8-9-этажный жилой дом на 48 квартир со встроенными административными помещениями и подземным гаражом по ул. Могилевской, 18.

2. Паркинг на 288 машино-мест со встроенными административными помещениями на первом этаже по ул. Восточной, 131.

3. 99-квартирный жилой дом по ул. Кропоткина, 112.

4. 180-квартирный 10—15-этажный жилой дом со встроенными помещениями по ул. Сырокомли, 38 в микрорайоне «Лошица-3».

Специальное разрешение (лицензия) на право осуществления деятельности «Проектирование и строительство зданий и сооружений I и II уровней ответственности и проведению инженерных изысканий для этих целей» № 02250/0264004 действительна до 14.03.2010 года.

Информация о проекте строительства

Цель проекта строительства — выполнение программы Мингорисполкома по жилищной программе.

Объект долевого строительства — многоквартирный жилой дом № 18 (по генплану), не относящийся к жилым домам повышенной комфортности (размещается во Фрунзенском районе, в границах улиц Притыцкого — Лобанка — Одинцова на свободном от застройки земельном участке в смешанной многоквартирной высокоплотной зоне). Состоит из 4-х 9-этажных жилых секций общей площадью квартир 7570 кв.м, технического подполья, где расположены тепловой узел, водомерный узел, помещение кондоминиума и технического этажа. Количество квартир в доме —123, в т.ч. однокомнатных 33, двухкомнатных 65, трехкомнатных 15, четырехкомнатных 10. В плане дом имеет размеры 17,14х89,0 м. В техническом подполье размещены помещения ТС жилого дома. Высота этажей 2.8 м. Лоджии застеклены. Архитектурное решение здания характеризуется простой конфигурацией плана здания, обусловленной общим планировочным решением застройки. Здание обеспечивается всеми современными видами инженерного оборудования. Конструктивная схема здания — монолитный железобетонный каркас. Стены — газосиликатные блоки, наружная отделка — краска фасадная акриловая, декоративная полимерная штукатурка. Внутренняя отделка стен и перегородок — штукатурка без чистовой отделки. Благоустройство территории включает организацию подъездов, проездов и автостоянок, пешеходных тротуаров и дорожек, устройство детских площадок, оборудование территории малыми архитектурными формами, озеленение.

Объектами долевого строительства являются:

1. Однокомнатные квартиры общей площадью:

№№ 20, 106 — 45,32 кв.м, №№ 44, 48, 49 — 39,34 кв.м, № 45 — 40,40 кв.м, №№ 62, 66, 74 — 39,27 кв.м, №№ 63, 71, 75 — 40,20 кв.м, № 84 — 35,40 кв.м.

2. Двухкомнатные квартиры общей площадью:

№ 15 — 61,61 кв.м, №№ 21, 113 — 64,02 кв.м, №№ 61, 64, 72 — 57,77 кв.м, № 79 — 63,6 кв.м, № 103 — 60,52 кв.м.

3. Трехкомнатные квартиры общей площадью:

№№ 4, 7, 13 — 89,07 кв.м, №№ 5, 8, 17 — 83,62 кв.м, № 1 — 89,75 кв.м.

4. Четырехкомнатные квартиры общей площадью:

№№ 33, 35, 37, 41 — 96,29 кв.м, №№ 36, 38, 40 — 98,63 кв.м.

Стоимость метра квадратного общей площади квартиры 4 081 200 бел. рублей.

Проект жилого дома разработан проектным отделом ЗАО «ИНСервис-Строй» на основании решения Мингорисполкома от 01.02.2007 г., пункт 162, согласован Комитетом архитектуры и градостроительства Мингорисполкома от 08.05.2007 г. № 05-08/55Ф и Минским городским комитетом природных ресурсов и окружающей среды № 35-17/1662 от 06.04.2007 г. в составе квартала застройки, заключением РУП «Белгосэкспертиза Минстройархитектуры» № 1616-5/07 от 23.07.2007 г. рекомендован к утверждению.

Строительство разрешено решением Мингорисполкома № 2290, пункт 2, от 11.10.2007 г. на земельном участке площадью 1,0056 га. Акт выбора места размещения земельного участка рассмотрен на заседании комиссии 12.12.2006

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

20 лютага 2008 г. № 7 (110)

ДЫЯЛОГ

ЧАМУ МЯЛЬЧЭЮЦЬ «МАЛОЧНЫЯ РЭКІ»?

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Старшыня Нясвіжскага раённага Савета дэпутатаў Анатоль ДРАГАВЕЦ наведвае тры-чатыры сельсаветы на тыдзень. Хацеў бы, магчыма, і больш, ды аб'ехаць усю тэрыторыю раёна нават за тыдзень вельмі складана. Але на працягу месяца ў кожным сельсавеце ён бывае дакладна. І графік работы будуе так, каб абавязкова папрысутнічаць на сесіі ці пасяджэнні сельвыканкама.

— Прыехаўшы на месца, вы, Анатоль Мікалаевіч, на што ў першую чаргу звяртаеце ўвагу?

— Напэўна, старшыня раённага Савета, ад'ехаўшы ад райцэнтра, павінен звяртаць увагу на ўсё, і ў першую чаргу на «болевыя кропкі», адносна якіх паступілі скаргі ад людзей. Акрамя гэтага, гляджу, як добраўпарадкавана тэрыторыя сельсавета, наведваю школы, дзіцячыя садкі, сацыяльныя ўстановы. Ды і вытворчыя аб'екты, калі трэба — фермы, прадпрыемствы. Абавязкова наведваю магазіны — шмат пытанняў узнікае сёння па наяўнасці, асартыменту тавараў. З нагоды той жа якасці вулічнага асвятлення званкі ідуць пастаянна — ёсць праблемы з набыццём лямпачак напальвання, хоць у бюджэт кожнага сельсавета закладзены на гэта пэўны аб'ём сродкаў. Вулічнае асвятленне вызначана ў бюджэце асобным радком, і ў мінулым годзе на гэтыя мэты мы патрацілі 525 мільёнаў рублёў. З іх толькі на лямпачкі пайшло 34 мільёны.

З добраўпарадкаваннем нас вельмі выручаюць аграгарадкі. Іх у раёне пабудавана дзевяць, за гэты год з'явіцца яшчэ тры — у Юшавіцкім, Лявонавіцкім і Гарадзейскім сельсаветах. Так што на цэнтральных сядзібах праблема навядзення парадку — а гэта асфальтаванне вуліц, пракладка водаправода, прывядзенне ў парадак фасадаў дамоў, установка прыстойнай агароджы — будзе вырашана. Пераключым увагу на невялікія населеныя пункты, маленькія вёсачкі.

— А матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне сельскіх Саветаў асабіста вас задавальняе? Да той жа аддаленай вёсачкі старшыні трэба на чымсьці дабрацца...

— Ва ўсякім выпадку, у параўнанні з іншымі раёнамі Мінскай вобласці тут мы выглядаем на ўзроўні. Дзе-нідзе ў раёнах засталіся сельскія Саветы, якія не маюць сваіх аўтамабіляў, але ў нас гэта пытанне было вырашана адназначна яшчэ пяць гадоў таму. (Дзве машыны сёлета заменім на новыя.) Дапамагло тое, што практычна ўсе сельскія Саветы на тэрыторыі Нясвіжскага раёна займаюцца арганізацыяй і зборам лішкаў малака ў насельніцтва. Акрамя Сноўскага сельсавета, дзе ўласная вытворчасць мяса-малочнай прадукцыі даведзена да такой ступені, што людзі забяспечаны ёю поўнасцю і не хочуць трымаць скаціну. Усе прадукты яны могуць набыць у сваім магазіне.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

СЕМЕЖАВА — НЕ ТОЛЬКІ ГІСТОРЫЯ

Капыльская вёска Семежава, узрост якой пераўзышоў 400 гадоў, асабліва вялікая сярод знаўцаў і прыхільнікаў традыцыйнага народнага мастацтва. Семежаўскія жанчыны заўсёды славіліся самародным ткацтвам і дагэтуль некаторыя з іх садзяцца за кросны, удзельнічаюць у абласных і рэспубліканскіх святах і фестывалях народнай творчасці. Нездарма Капыльскі раённы музей ткацтва знаходзіцца не ў райцэнтры, як прынята, а менавіта ў Семежаве.

Але, зразумела, вяскоўцы жывуць не толькі гэтымі клопатамі. Сёння Семежава — адзін з прывабных аграгарадкоў і па-ранейшаму наймацнейшая гаспадарка раёна. Сельскі Савет амаль два гады ўзначальвае Мікалай Кулік, колішні намеснік старшыні вытворчага сельскагаспадарчага кааператыва.

— Тэрыторыя дзеяння нашага Савета — тры вёскі і два пасёлкі, — расказвае Мікалай Міхайлавіч. — А гэта без малога тысяча семсот жыхароў.

Застаць старшыню ў сваім кабінеце не заўсёды атрымліваецца. Такі стыль яго працы прадыктаваны самім жыццём. Сацыяльныя пытанні патрабуюць часцей бываць сярод людзей, ведаць іх жыццёвыя ўмовы, сачыць за ўпарадкаванасцю вуліц, быць у курсе ўсіх спраў будоўлі і рэканструкцыі жылля. Напэўна, няма такой сядзібы, гаспадароў якой старшыня не ведае ці не знаёмы з іх патрэбамі.

— Асаблівая ўвага ў нас — да людзей старэйшага пакалення. Пенсіянераў у сельсавеце амаль як і працаздольных — больш за шэсцьсот чалавек, сярод іх цалкам адзінокіх — 48,— працягвае гутарку Мікалай Міхайлавіч. — У Савеце наладжана праца сацыяльных работнікаў, дапамагаюць і вясковыя старасты, якіх у нас сёння шэсць чалавек.

Здымак *(уверсе)* быў зроблены якраз у той момант, калі старшыні Семежаўскага сельскага Савета трэба было ад'язджаць у раён, але да яго падыходзілі людзі, раіліся аб нечым, задавалі пытанні. Працоўны дзень толькі пачынаўся. Для большасці семежаўскіх жыхароў Мікалай Кулік не толькі кіраўнік Савета — у першую чаргу ён іх аднавясковец, сусед і проста добры чалавек.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

ТРЫ СПІСЫ БЛАГАВІЦКАГА СЕЛЬСАВЕТА

У сельсаветах Чавускага раёна збіраюць звесткі пра людзей, якія не трымаюць падсобныя гаспадаркі, пра тых, якія з'ехалі на заробкі ў Расію і, нарэшце, пра тых, якія зусім не працуюць. Мяркуецца прапаноўваць гэтым людзям працу і ствараць умовы для развіцця сельскагаспадарчай вытворчасці.

Дапамога ці абуза?

Уладзімір Мачульскі ўзначальвае Благавіцкі сельскі Савет дэпутатаў дваццаты год. Ён можа ўспомніць розныя часы, прыкмета ж цяперашняга часу — капітальна адрамантаваны будынак сельвыканкама, добраўпарадкаваная тэрыторыя навокал, праца з камп'ютарамі, а ў недалёкай перспектыве — новы аўтамабіль. У 2010 годзе, паводле планаў, Благавічы стануць аграгарадком.

Мясцовы люд працуе ў дзвюх гаспадарках — СВК «Светлы шлях» і «Святло кастрычніка». Праўда, нягледзячы на «светлыя» назвы, сельскагаспадарчыя кааператывы лічацца «сярэднімі». Сярэднія заробкі ў іх вагаюцца ад 270 да 340 тысяч рублёў. Шчыра казаць, за такія грошы цяжка пражыць і ў сельскай мясцовасці. Асабліва калі сям'я не трымае падсобную гаспадарку.

Сам Уладзімір Мачульскі разам з жонкай маюць карову, ёсць на падворку свінні і куры. Карова дае шмат плюсаў: гэта сваё малако і натуральныя малочныя прадукты, а яшчэ прыбаўка ў бюджэт — можна прадаць дзяржаве малако і здаць цяля. Калі маеш свіней ды курэй — мясам і яйкамі можна забяспечыць і сябе, і сваякоў. Але і працаваць даводзіцца: калі ёсць падсобная гаспадарка, трэба аддаць ёй дзве гадзіны раніцай, і столькі ж — увечары, і яшчэ гадзіну ў абед. Усё гэта — асабісты час, патрэбны для адпачынку, але ахвяраваны дзеля ўласнага дабрабыту.

— У наш першы спіс трапілі 26 сем'яў, якія не трымаюць падсобную гаспадарку, — гаворыць старшыня сельскага Савета. — Прычым гэта вясковыя людзі працаздольнага ўзросту, у іх ёсць гаспадарчыя пабудовы. На пачатак мінулага года ў нас была 161 карова, а сёлета на 1 студзеня — ужо 115.

Прычын такой сітуацыі некалькі. Па-першае, вёска старэе, а ў састарэлых людзей не хапае сілаў трымаць кароў ды іншую жывёлу.

З іншага боку, абслугоўванне людзей у вёсцы за апошнія гады палепшылася. Працуюць крамы спажыўсаюза, а ў выхадныя дні прыязджаюць прыватныя гандляры. Прычым прадпрымальнікі свой тавар і да хаты падвязуць, і пазычаць тым, у каго цяпер не стае грошай, але ёсць перспектыва іх заплаціць.

— Цяпер склалася такая эканамічная сітуацыя, што вырабляць самім сельскагаспадарчую прадукцыю проста нявыгадна, а прасцей набыць у краме, — лічыць старшыня Чавускага раённага Савета дэпутатаў Аляксандр Чыканаў. — У раёне такіх падворкаў больш за 600. Прычым пенсіянераў і нямоглых у разлік не бралі. Што ж, будзем працаваць з людзьмі, адсочваць сітуацыю. Аднак пакуль закупачная цана малака такая нізкая, тут зрухі наўрад ці будуць.

У спісе сем'яў, якія не трымаюць падсобную гаспадарку, ёсць асобная графа для ўказання прычын: альбо няма жадання, альбо няма магчымасці. Адны лянуюцца, хоць грошай не хапае. Іншыя не хочуць мець лішніх клопатаў у жыцці.

— Можа, тэарэтычна і трэба аддаваць 8 гадзін вытворчасці, потым адпачываць, а на зароблены грошы ўсё набываць у краме, — разважае Мачульскі. — Але гэта пакуль не для нас. У нас без жывёлы і гаспадаркі проста не выжыць.

Расійскі спіс

Чавускі раён знаходзіцца на ўсходнім напрамку, і для тутэйшых мужчын праца ў расійскім замежжы — даволі распаўсюджаная з'ява.

— У нас ездзіць у Расію 12 чалавек, — гаворыць Уладзімір Мачульскі. — У большасці гэта маладыя і моцныя мужчыны. Самы працаздольны ўзрост — ад 25 да 35 гадоў. Ніхто не з'язджае ў Расію на пастаяннае месца жыхарства і не збіраецца гэтага рабіць. Яны працуюць сезонна і вяртаюцца дадому.

Зразумела, што людзі паехалі туды не ад добрага жыцця, а па добрыя заробкі, каб забяспечыць свае сем'і — бацькоў, жонак і дзяцей. Калі казаць шчыра, то многім удалося зарабіць і на абстаноўку, і на бытавую тэхніку. Яны могуць вярнуцца, але... — Трэба прапанаваць ім больш выгадныя ўмовы працы і не меншыя грошы, — і над гэтым трэба думаць, — зазначаюць кіраўнікі раёна.

Не працуюць і не хочуць

Самы цяжкі спіс, у ім — 14 чалавек.

— Гэта ў асноўным п'яніцы, — тлумачаць у сельсавеце. — Некаторых выгналі з працы за неаднаразовае парушэнне дысцыпліны. Ды яны і самі працы не хочуць: ходзяць да старых, робяць для іх, атрымліваюць у якасці падзякі грошы альбо спіртное. З імі перыядычна выпадае разбірацца каардынацыйнаму савету па ахове правапарадку пры сельвыканкаме.

— Такіх трэба прымушаць працаваць, — упэўнены Уладзімір Мачульскі. — У сельскіх гаспадарках якраз не хапае людзей у жывёлагадоўлі і раслінаводстве.

У Чавускім раёне прапануюць памяняць прафесію альбо атрымаць больш высокую кваліфікацыю: праз цэнтр занятасці можна вывучыцца на дзяржаўныя грошы, напрыклад, на механізатараў альбо зваршчыкаў, якіх не хапае.

— Будзем іх працаўладкоўваць, каб не боўталіся і працавалі, — сказаў Аляксандр Чыканаў. — Пакуль працоўныя месцы маюцца ў СВК. Заробкі там не самыя вялікія, але зрухі ўжо ёсць: па 2-3-4 чалавекі на сельсавет уладкаваліся на працу. І гэта нядрэнна. Калі ў выніку хоць бы палова з тых, хто не працуе, усё ж выйдзе на палі і фермы, гэта будзе поспех.

Самая вялікая бяда сучаснай вёскі — гэта п'янства. Раней, узгадвае Уладзімір Мачульскі, людзей больш выхоўвалі, прафілактыка давала плён, алкаголікі як агню баяліся таварыскіх судоў, і людзі працавалі. Цяпер жа вясковы гандаль перавыконвае план не ў апошнюю чаргу за кошт алкагольных напояў.

Калі ў гаспадарцы выплачваюць заробак, няма спакою ад п'янак яшчэ з тыдзень. Тым больш што з Расіі актыўна вязуць сурагаты і тэхнічныя спірты. Хоць апошнім часам меней стала гэтай халеры, аднак выкараніць з'яву канчаткова не ўдаецца.

* * *

У сельскіх гаспадарках Благавіцкага сельсавета можна атрымаць працу і за кошт будучых заробкаў узяць карову.

Напрыклад, сям'я Мурашак з Каменкі. Яна — вартаўніца ў школе, ён — вадзіцель у арганізацыі. Побач з 4-кватэрным домам яны пабудавалі пуню і трымаюць карову. За студзень сям'я здала ледзь ці не тону малака — 922 кілаграмы, і атрымала нядрэнны прыбытак.

Альбо сям'я Харытонавых з вёскі Благавічы: жонка працуе ў школе, муж — вадзіцель у гаспадарцы, трымаюць дзвюх кароў і ў студзені здалі 790 літраў малака.

— Усё залежыць ад людзей, — упэўнены Уладзімір Мачульскі. — Яны хочуць жыць добра, але для гэтага неабходна працаваць і ў сельскай гаспадарцы, і на сваім падворку, выкарыстоўваць магчымасць атрымліваць даходы ад сваёй падсобнай гаспадаркі.

Ілона ІВАНОВА.

Чавускі раён.

КАМУНАЛЬНАЯ СЛУЖБА НЕ ПАЧУЛА ЗАПЫТУ...

На сесіі Аршанскага раённага Савета дэпутатаў выступленне Сяргея Захарэнкі было самым вострым. Распавёўшы пра сваю дэпутацкую дзейнасць сярод выбаршчыкаў вёскі Казловічы-2 , ён папракнуў раённыя службы: не заўсёды звяртаюць увагу на запыты па праблемах вясковых жыхароў. Выказацца крытычна яго прымусіў зварот жыхароў вёскі Казловічы-2.

Падчас першага дэпутацкага прыёму да яго з гэтай вёскі звярнулася шмат вяскоўцаў. Большасць з іх непакоілі два пытанні: як аднавіць ачышчальныя збудаванні каля двухпавярховых дамоў і адрамантаваць дахі гэтых дамоў. Дэпутат намагаўся дапамагчы, але да гэтай пары дахі працякаюць, а ачышчальныя збудаванні не адрамантаваны... На дэпутацкія прыёмы цяпер рэдка хто з вяскоўцаў ідзе. Кажуць: калі не дапамог у галоўным, дык няма сэнсу турбаваць па іншых, менш важных праблемах.

— Не па сваёй віне я страчваю аўтарытэт сярод выбаршчыкаў, — паведаміў з трыбуны Сяргей Захарэнка. — Звяртаўся па ўсіх інстанцыях, гаварыў пра неабходнасць дзеянняў. Але мяне не пачулі ў тым жа «Райжылфондзе». Дырэктар гэтага прадпрыемства спаслаўся на тое, што ачышчальныя збудаванні ў Казловічах не перададзены на баланс «Райжылфонду». Але можна свядома не ставіць іх на баланс, каб не адказваць за аб'ект...

Казловічы-2 — вялікая вёска на 53 двары, дзе налічваецца 204 жыхары. Большасць будынкаў тут — звычайныя аднапавярховыя хаты. Рамантуюць дахі, чысцяць падворкі, вывозяць смецце ў адведзенае для гэтага месца самі гаспадары. У двухпавярховых жа дамах, дзе жыве 30 сем'яў, кватэраздымшчыкі плацяць камунальнай службе за ўсе паслугі гэтак жа, як гарадскія жыхары. У спісу тых паслуг — і капітальны рамонт, і каналізацыя. За трохпакаёўку зімой даводзіцца плаціць звыш 150 тыс. рублёў у месяц.

Уладальніца аднапакаёўкі, адзінокая жанчына, гэтым летам зрабіла рамонт: паклеіла новыя шпалеры, пафарбавала столь. А восенню дах працёк ізноў. І ўвесь яе рамонт, даруйце, «накрыўся». Альбо яшчэ прыклад. У адным з гэтых дамоў у непагадзь вада цячэ са столі пад'езда. Кожны з жыльцоў адчувае дыскамфорт, бо сутыкаецца з непавагай камунальнай службы да сябе асабіста. Мабыць, варта сказаць і пра тое, як у дождж зацякаюць электралічыльнікі і люстры пад столлю. І недалёка ў такім выпадку да бяды.

Жыльцы пры такіх умовах яшчэ не дадумаліся да пратэсту: своечасова плацяць за камунальныя паслугі. Праўда, толькі за апошні час апусцелі шэсць кватэр у гэтых дамах. Людзі знайшлі іншае жыллё. Але ж большасць сем'яў яшчэ трымаецца.

Непрыглядная карціна і з ачышчальнымі збудаваннямі гэтых дамоў. Каналізацыйныя сцёкі ўтварылі цэлае балота праз дарогу. «Водар» дакучае жыльцам не толькі шматпавярховых дамоў, але і прыватных. Трэба сказаць, што гэта застарэлая праблема. Балота ўтварылася гадоў з дзесятак таму. Вяскоўцы пісалі звароты, абівалі парогі кабінетаў чыноўнікаў і дэпутатаў, але так нічога і не дабіліся.

Вольга ШУТАВА.

АД ПЕРШАЙ АСОБЫ

ДЭПУТАТ НЕ ЎСЯСІЛЬНЫ, АЛЕ...

Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў 25-га склікання налічвае 55 чалавек. Дваццаць з іх былі абраны не ўпершыню, астатнія — навічкі. Такая прапорцыя дазваляе захаваць пераемнасць работы, дае магчымасць дэпутатам «са стажам» перадаць свой вопыт, а маладым калегам больш аператыўна ўнікнуць у сутнасць дэпутацкіх абавязкаў. У новым складзе народныя абраннікі Мінскага гарадскога Савета 25-га склікання працуюць ужо год. Аб тым, што зроблена за гэты перыяд, расказвае старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Міхаіл МАТУСЕВІЧ.

— Мінск як сталіца мае асобы статус. Думаю, не памылюся, калі выкажу меркаванне, што і ў рабоце сталічнага дэпутацкага корпуса павінна назірацца пэўная спецыфіка, абумоўленая гэтым статусам?

— Безумоўна, такая спецыфіка ёсць. Мінскі **гарадскі Савет** валодае **паўнамоцтвамі абласнога тэрытарыяльнага ўзроўню,** у адрозненне ад іншых гарадскіх Саветаў нашай рэспублікі. Гэтыя паўнамоцтвы замацаваны за ім Законам «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні». Справа ў тым, што на тэрыторыі Мінска сёння размяшчаецца шмат прадпрыемстваў не толькі камунальнай, але і рэспубліканскай формы ўласнасці, шматлікія ўстановы органаў кіравання. Усё гэта, вядома ж, накладвае пэўны адбітак на дзейнасць дэпутацкага корпуса гарадскога Савета дэпутатаў. Яго рашэнні абавязковыя для выканання ўсімі арганізацыямі, размешчанымі на тэрыторыі сталіцы.

— На ваш погляд, дэпутаты сталічнага Савета сёння валодаюць рэальнай уладай?

— Як я ўжо казаў, рашэнні Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў абавязковыя для выканання на тэрыторыі сталіцы. Не так даўно на сесіі мы зацвердзілі бюджэт горада Мінска на 2008 год, дзе прадугледзелі мясцовыя падаткі і зборы. Яны папоўняць гарадскую казну. Гэта рэальнае права, якое рэалізавалі дэпутаты, і ўсе суб'екты гаспадарання, што знаходзяцца на тэрыторыі горада, павінны ім кіравацца.

— З якімі пытаннямі да гарадскіх дэпутатаў часцей звяртаюцца мінчане?

— На жаль, у сталіцы яшчэ застаецца шэраг праблемных момантаў, якія пакуль не цалкам удаецца вырашыць, яны выклікаюць справядлівыя нараканні з боку жыхароў. Бясспрэчным лідарам у спісе праблем з'яўляецца пытанне паляпшэння жыллёвых умоў. Сёння на ўліку ў гарвыканкаме як маючыя патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў стаяць больш за 200 тысяч мінчан. Прычым тэрмін чакання ў чарзе дасягае 20 гадоў. Гэта абумоўлена не толькі тым, што ў сталіцы будуецца мала жылля, а тым, што ў адпаведнасці з новым заканадаўствам значна змяніліся ўмовы для пастаноўкі на ўлік. Напрыклад, як маючыя патрэбу цяпер прымаюцца маладыя сем'і незалежна ад колькасці метраў, якія прыпадаюць на аднаго чалавека.

Для выпраўлення становішча з жыллёвымі чэргамі напрыканцы мінулага года Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў прыняў Праграму развіцця будаўнічага комплексу і паляпшэння жыллёвага будаўніцтва ў горадзе Мінску на 2008—2012 гады. (Папярэдне гэтая праграма была распрацавана і разгледжана Мінгарвыканкамам.) У адпаведнасці з ёй у бліжэйшыя 5 гадоў мы плануем удвая павялічыць аб'ёмы жыллёвага будаўніцтва для грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

— Якую з праблем у сталічным рэйтынгу вы б паставілі на другое месца пасля праблемы паляпшэння жыллёвых умоў?

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

— Мяркуючы па зваротах да нас грамадзян, гэта пытанні жыллёва-камунальнага, медыцынскага, транспартнага абслугоўвання. Скажам, праблема медыцынскага абслугоўвання сёння асабліва актуальная для новых мікрараёнаў (Малінаўка, Сухарава, Лошыца). Увогуле, гэта праблема не аднаго дня: так склалася, што спачатку будуецца жыллё, а сацыяльныя аб'екты (дзіцячыя садкі, школы, паліклінікі, магазіны) часта адыходзяць на другі план. Думаю, гэта абумоўлена хранічным недахопам фінансавання, будаўнічых магутнасцяў і ў некаторым сэнсе — менталітэтам чыноўнікаў. Асабліва патрэбна ўлічваць гэтую праблему зараз, калі значна ўзраслі будаўнічыя аб'ёмы ў сталіцы. Паліклініка ў Малінаўцы, разлічаная на 50 тысяч наведванняў у змену, сёння абслугоўвае звыш 90 тысяч чалавек. Нашы дэпутаты неаднаразова ўзнімалі пытанне аб неабходнасці паскарэння тэмпаў будаўніцтва другой паліклінікі ў Малінаўцы. Пасля разгляду дэпутацкага запыту старшыня Мінгарвыканкама даў даручэнне падрадным арганізацыям паскорыць тэмпы будаўніцтва.

— Напэўна, добраўпарадкаванню дваровых тэрыторый значна перашкаджае асабісты аўтатранспарт, які жыхары на ноч паркуюць пад сваімі вокнамі?

— Вы маеце рацыю. Праблема парковак увогуле адна з самых актуальных для сталіцы. Штогод Мінск «прырастае» на дзесяткі тысяч аўтамашын. Вядома ж, пры праектаванні дваровых тэрыторый, якое вялося 10—20 гадоў таму, такая колькасць асабістага транспарту не прадугледжвалася. Мінгарвыканкам звяртае на праблему парковак асаблівую ўвагу. Цяпер распрацоўваецца праграма па будаўніцтве ў сталіцы (у тым ліку ў «спальных» мікрараёнах) шэрагу платных парковак, якія, як плануецца, павінны «разгрузіць» двары, забяспечыць пад'езд камунальнага транспарту, машын МНС і хуткай дапамогі. Жыхарам горада будзе прапанавана захоўваць свае аўто ў такіх стацыянарных паркінгах, якія ў большасці сваёй размесцяцца ў межах пешаходнай даступнасці. Акрамя таго, пры будаўніцтве жылля павышанай камфортнасці (а такіх дамоў у горадзе даволі многа). Пад імі таксама прадугледжаны месцы для захоўвання транспарту.

— Міхаіл Васільевіч, ці прадугледжана планамі развіцця Мінска ператварэнне некаторых вуліц цэнтральнай часткі горада ў цалкам пешаходныя і офісныя? У прыватнасці апошнім часам шмат гаворкі вядзецца вакол вуліцы Карла Маркса.

— Распрацоўкі ў гэтым накірунку праектнымі інстытутамі вядуцца. Разглядаюцца вуліцы Верхняга горада, Траецкага прадмесця, а таксама некаторыя іншыя вуліцы цэнтральнай часткі горада, у тым ліку і вуліца Карла Маркса. Што тычыцца менавіта яе, канчатковае рашэнне аб наданні ёй статусу пешаходнай яшчэ не прынята.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ЁСЦЬ МАГАЗІН — ВЁСКА ЯШЧЭ ЖЫВЕ

Бываючы ў вёсках, часта даводзіцца бачыць дамы, дзе ў свой час былі магазіны. Стаіць на скрыжаванні мураваны будынак і глядзіць на вуліцу пустымі вокнамі.

А вось у вёсцы Агарэвічы Ганцавіцкага раёна ў двухпавярховым будынку быў зроблены рамонт. На першым паверсе сёння там магазін, а на другім адкрылі кавярню. Акрамя гэтага ўзвялі і новыя гандлёвыя пункты. Магазіны ўжо працуюць у Люсіне і Любашаве, а ў Хатынічах і райцэнтры пабудавалі па два магазіны.

— Толькі за студзень тавараварот у гандлі вырас на 32 працэнты, і гэты факт абнадзейвае, — гаворыць старшыня Ганцавіцкага райсавета Віктар Дрозд. — Модулі магазінаў выраблюцца на прадпрыемстве ў Ганцавічах, і кошт аднаго прыкладна 50 млн рублёў. Скажу, што магазіны маюць добрыя якасці — яны вельмі цяплозберагальныя, збудаваны з сучасных матэрыялаў і цешаць вока. Хатынічы ці Агарэвічы — буйныя населеныя пункты, магазіны там ужо былі, і калі ўзводзяцца яшчэ, то гэта значыць, што вёска жыве і ў яе ёсць перспектыва. Магазіны ёсць практычна ва ўсіх населеных пунктах. А калі вёсачка маленькая, то туды дастаўляе прадукты аўтакрама. Узвядзенне падобных магазінаў будзе працягвацца і ў іншых вёсках раёна, справа за пакупніком.

Адзначу, што не толькі магазіны будуюць у раёне. У тых жа Хатынічах аднавілі мясцовую бібліятэку, у якой 1335 чытачоў на 2600 чалавек насельніцтва, давялі да ладу і Дом быту.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ДЭПУТАТ НЕ ЎСЯСІЛЬНЫ, АЛЕ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Пры гэтым хачу падкрэсліць, што ў любым выпадку будзе ўлічвацца і меркаванне грамадзян, і спецыфіка сталіцы. Употайкі ад грамадскасці ніхто нічога вырашаць не стане. Сёння на гэтай вуліцы ёсць шмат участкаў, якім патрэбна добраўпарадкаванне. Цяпер разглядаецца магчымасць будаўніцтва паркінга ў бліжэйшым мікрараёне, дзе змогуць захоўваць свае аўтамабілі жыхары і вуліцы Карла Маркса. А прапаноў наконт таго, каб зрабіць яе цалкам офіснай і адсяліць усіх жыхароў у «спальны» мікрараён, я не чуў. Паніка тут заўчасная і неабгрунтаваная.

— З гэтага года найманальнікі ў Мінску атрымалі права самастойна вырашаць пытанне аб прыёме на працу іншагародніх работнікаў. Раней яны папярэдне павінны былі абавязкова ўзгадніць канкрэтную кандыдатуру ў Мінгарвыканкаме і заплаціць за іншагароднята супрацоўніка ў гарадскі бюджэт пэўную суму. Чым выклікана адмена гэтага рашэння і што яна дасць на практыцы?

— Сапраўды, з 1992 года існавала агульнае правіла аб прыёме на працу ў сталіцу іншагародніх грамадзян. Рашэннем Мінгарвыканкама ад 15 лістапада 2007 года яно было адменена. У першую чаргу гэта было абумоўлена скасаваннем інстытута прапіскі ў краіне ў цэлым. Акрамя таго, як мы казалі вышэй, Мінск сёння мае патрэбу ў кваліфікаваных кадрах, асабліва гэта актуальна для будаўнічага комплексу. Адзначу, што ўзровень беспрацоўя сярод мінчан сёння вельмі нізкі: 0,4 працэнта ад эканамічна актыўнага насельніцтва. Гэта значыць, што жыхары сталіцы знаходзяць сабе працоўныя месцы. А недахоп спецыялістаў усё роўна адчуваецца.

— Якія яшчэ, на ваш погляд, важныя для горада рашэнні прыняў Мінскі гарадскі Савет за мінулы год?

— Усяго ў 2007 годзе Саветам было прынята 114 рашэнняў. Лічу, што ўсе яны важныя для горада. Зусім нядаўна дэпутаты зацвердзілі бюджэт горада і план сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2008 год. Адзначу, што расходная частка бюджэту сёлета складзе каля 4,4 трлн рублёў. Гэта дастаткова вялікія грошы, і вельмі важна, каб яны былі выкарыстаны рацыянальна і эфектыўна, на карысць мінчан. Усе 9 дэпутацкіх камісій па сваіх накірунках будуць пастаянна сачыць за гэтым працэсам.

Летам мінулага года дэпутаты прынялі рашэнне «Аб мерах па стымуляванні працы работнікаў устаноў адукацыі, фізічнай культуры і спорту, якія фінансуюцца з бюджэту горада Мінска». Згодна з гэтым рашэннем з 1 верасня мінулага года больш за 30 тыс. работнікаў атрымліваюць дадатковую надбаўку да зарплаты за кошт сродкаў гарадскога бюджэту (сёння гэта крыху больш за 100 тыс. рублёў на аднаго чалавека).

У адпаведнасці з зацверджанымі сесіяй Савета мерапрыемствамі аб прадастаўленні сацыяльнай дапамогі асобным катэгорыям жыхароў Мінска на 2008 год малазабяспечаныя мінчане сёлета атрымаюць з гарадскога бюджэту каля 25 млрд рублёў. **Гэта перш за ўсё шматдзетныя сем'і з непаўналетнімі дзецьмі, інваліды, састарэлыя.** Акрамя таго, напрыканцы мінулага года дэпутаты прынялі тэрытарыяльную праграму дзяржаўных гарантый па забеспячэнні медыцынскім абслугоўваннем насельніцтва горада Мінска на 2008 год. Яна вызначае пералік відаў і аб'ёмы медыцынскай дапамогі, а таксама ўмовы іх прадастаўлення жыхарам горада. Затраты на рэалізацыю праграмы сёлета складуць больш за 686 млрд рублёў.

— Некаторыя жыхары сталіцы наракаюць на недахоп інфармацыі наконт работы абраных імі дэпутатаў гарадскога Савета...

— Гэтай праблеме не адзін дзесятак гадоў. Многія выбаршчыкі справядліва заўважалі, што падчас выбарчай кампаніі кандыдаты ў дэпутаты праводзяць сустрэчы з насельніцтвам, абяцаюць вырашыць іх праблемы, а пасля абрання дэпутата не знайсці. Але сёння на кожнага дэпутата гарсавета прыходзіцца каля 23 тысяч выбаршчыкаў. Праінфармаваць такую колькасць народу аб сваёй дзейнасці значна цяжэй. Нашы дэпутаты выступаюць у СМІ, у працоўных калектывах, на сходах па месцы жыхарства, аднак, магчыма, недастаткова. Папрок грамадзян тут справядлівы. Тым не менш кожны наш дэпутат штомесяц праводзіць прыём грамадзян. Інфармацыя аб месцы і часе сустрэчы разам з нумарам тэлефона дэпутата вывешваецца ў адміністрацыях раёнаў.

Часам выбаршчыкі застаюцца незадаволеныя работай свайго дэпутата, бо той не дапамог вырашыць іх пэўную праблему. Аднак дэпутаты не ўсясільныя. Яны працуюць у межах існуючага заканадаўчага поля. Скажам, прыходзіць на прыём жанчына, якая пражывае ў аднапакаёвай кватэры з дарослай дачкой, і патрабуе дапамагчы палепшыць яе жыллёвыя ўмовы. Аднак яна не мае льгот, чарга на паляпшэнне жыллёвых умоў яшчэ не падышла, і вырашыць яе просьбу ў межах дзеючага заканадаўства немагчыма. Нягледзячы на тлумачэнні, чалавек застаўся незадаволеным вынікам размовы з дэпутатам.

— Магчыма, ёсць сэнс павялічыць дэпутацкі корпус Мінскага гарадскога Савета?

— Не думаю. Паверце майму вопыту: колькасць яшчэ не значыць якасць.

Гутарыла Інга МІНДАЛЁВА.

ЧАМУ МЯЛЬЧЭЮЦЬ «МАЛОЧНЫЯ РЭКІ»?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Трымаць карову — гэта вельмі працаёмкі занятак...

— І ўсё ж пэўны час менавіта ён праносіў нядрэнныя грошы ў сельсавецкую кішэню. Пакуль колькасць буйной рагатай жывёлы на падворках вяскоўцаў не пачала змяншацца. Прычым сёння тэмпы гэтага змяншэння сталі амаль катастрафічнымі. Толькі за апошні год мы «страцілі» 406 галоў, а валавы паказчык закупленага ў людзей малака зменшыўся на 1,5 тысячы літраў. Такімі тэмпамі за чатыры-пяць гадоў можна дайсці і да нуля, хоць пакуль што Нясвіжскі раён па «валу» малака ўваходзіць у пяцёрку лепшых па вобласці... Ведаеце, з чаго пачынаецца мой працоўны дзень? Са збору інфармацыі аб тым, як закупляецца малако. У Нясвіжскім раёне гэты працэс ідзе няспынна, без «скідак» на пару года. Яшчэ тры-чатыры гады таму за грошы, зароблены ад здадзенага дзяржаве малака, сельскія Саветы куплялі аўтамабілі... Сёння гэты занятак ужо не прыносіць прыбытку, збор малака становіцца стратным. У мінулым годзе, напрыклад, сельвыканкамы зарабілі на гэтым 392 мільёны 126 тысяч рублёў. А затрацілі (на зарплату, паліва і г.д.) больш за 415 мільёнаў. Расходы перавысілі даходы, толькі некалькі сельсаветаў засталіся з «плюсам»... Сёння паўстаюць пытанні, як, за кошт чаго кампенсаваць затраты? Дзе ўзяць грошы?

— І як не дапусціць скарачэння статку свойскай жывёлы?

— Мне здаецца, мы ўсё робім для гэтага. Усё, што ў нашых сілах, прадпрымаем, каб падтрымаць зацікаўленасць у насельніцтва. Дапамагаем набыць жывёлу, забяспечыць яе кормам — па дзве тоны сена заўсёды выдзяляем кожнаму, хто трымае скаціну на падворку. Пра салому ўжо не кажу — бярыце колькі хочаце. Работнікі СВК яе і прывязуць, і скінуць самі — усё бясплатна. Кожнаму падворку, дзе ёсць жывёла, гарантаваныя 10 «сотак» у палях агульнага севазвароту — а значыць, 300—400 кг зерня чалавек заўсёды атрымае па сабекошце. Ды і ўвогуле, калі што трэба — кіраўнікі гаспадарак ідуць насустрач, з гэтым праблем няма. Адзіная праблема, на якую мы не ў стане паўплываць, — дэмаграфічная. Прыкладна 500 чалавек у год памірае ў раёне — нярадасныя лічбы. Ды і пустых дамоў становіцца больш. Іх у нас 268 — тых, што трэба зносіць. Праблематычна шукаць спадкаемцаў, асабліва за межамі рэспублікі. А на знос дома без дазволу гаспадароў не кожны старшыня сельскага Савета адважыцца. Ды і я заўсёды настройваю іх на тое, каб да гэтага пытання падыходзілі вельмі сур'ёзна.

— Вы задаволены тэмпамі зносу?

— Хутчэй, не. Зразумела, што пустыя, безгаспадарчыя дамы зносіць трэба. Але неабходны і сродкі, якіх сёння няма. Як мінімум, 1 мільён рублёў патрэбны для зносу дома. Сёлета па Мінскай вобласці на гэтыя мэты будзе выдзелена 2,5 млрд рублёў — думаю, цяпер справа пойдзе.

Да таго ж, пры Ліпскім сельвыканкаме створаны КУП — камунальнае ўнітарнае прадпрыемства, магчымасці якога мы таксама збіраемся выкарыстаць падчас зносу дамоў. Са старшынёй райвыканкама Ігарам Мікалаевічам Макарам ужо абмеркавалі гэта пытанне, але спачатку дапаможам КУПу набыць магутны пагрузчык. Пры ўмове, што нам пачнуць выдзяляць грошы на знос, КУП здолее справіцца з усімі старымі дамамі ў раёне.

Увогуле сёння на балансе сельвыканкамаў знаходзіцца 6 трактароў і 9 машын, якія забяспечваюць вывяз смецця. Думаю, гэты моцны «касцяк» і КУП дапамогуць навесці парадак на тэрыторыі.

— А чаму не жыллёва-камунальныя службы?

— ЖКГ сёння церпяць страты. Працаваць з імі сельвыканкамам нявыгадна, дорага. А КУП можа заключыць дагавор на вываз смецця з жыхарамі аднаго сельсавета, другога, трэцяга — усяго за 1,5 тысячы з чалавека ў месяц... Але асноўная яго задача — дапамога вяскоўцам у вядзенні падсобнай гаспадаркі, сельгаспрацаў. Наш КУП першапачаткова працаваў толькі на тэрыторыі свайго сельсавета. Але цяпер разгарнуўся, заключыў дагаворы з іншымі сельскімі Саветамі, нават з пасялковым. І эфект ад яго работы больш відавочны, чым ад работы ЖКГ. І ён усё паспявае, нават вуліцы падсыпаць. Там працуюць чатыры чалавекі. За мінулы год яны зарабілі 41 мільён, інакш кажучы, самі сябе акупілі, бо грошы пайшлі на паліва і на зарплату. А вось на развіццё амаль нічога не засталося, таму КУПы трэба падтрымліваць. Буду прасіць у вобласці, каб падтрымалі, тэхніку добрую выдзелілі. У мінулым годзе, дарэчы, добра дапамаглі — на 34 мільёны. Мы набылі раскідвальнікі і бульбакапалкі... Але КУП быў створаны да выхаду указа № 21, а значыць, усе пералічаныя ў гэтым дакументе льготы на яго не распаўсюджваюцца. Між тым, людзям, якія працуюць у КУПе, таксама неабходна даць нармальную зарплату. А пакуль што ў сельгаспрадпрыемствах работнікі атрымліваюць больш...

Яшчэ тры-чатыры гады таму за грошы, зароблены ад здадзенага дзяржаве малака, сельскія Саветы куплялі аўтамабілі...

— Ёсць сэнс ствараць такія структуры пры кожным сельскім Савеце?

— Няма. Няхай лепш у раёне будуць адзін-два КУПы плюс гаспадарча-разліковыя звёны — і яны дапамогуць усяму раёну. І заробяць грошы.

— Напэўна, перадача сістэм водазабеспячэння і водаадвядзення ў сельскіх населеных пунктах на баланс ЖКГ у вас яшчэ не завершана — зыходзячы з фінансавых цяжкасцяў гэтага прадпрыемства?

— Камунальнікі ставяць умовы: адрамантуйце і аддайце нам водаправодныя сеткі ў добрым стане. Дык калі мы іх адрамантуем, навошта тады аддаваць? Але ўказ № 21, які патрабуе перадаць водазабеспячэнне, трэба выконваць, і ён будзе выкананы. Цікавы факт: там, дзе гаспадарка больш моцная, увогуле адмаўляюцца ад паслуг ЖКГ. Мне кіраўнік агракамбіната «Сноў» гаворыць: не трэба нам ЖКГ, мы самі разбяромся. І ён мае рацыю. Плаціць круглыя сумы за паслугі сёння ніхто не хоча.

— А хто абслугоўвае сістэму водазабеспячэння невялікіх вёсак?

— Пакуль што сельскагаспадарчыя прадпрыемствы — СВК. Яны займаюцца і рамонтам, і кантролем. Тут ёсць пэўныя складанасці. Калі сістэма будавалася, не было ні картаў, ні схем. Сёння неабходна іх зрабіць, патрэбна дакументацыя. Акрамя таго, грошы на рамонт... Але ж СВК у першую чаргу павінен думаць аб вытворчых праблемах. Пытанне, я думаю, паступова вырашыцца. Пакрысе ўсё перададзім спецыялізаваным арганізацыям: і водазабеспячэнне, і ўнутрыпасялковыя дарогі, якія таксама сёння ніхто не хоча забіраць на баланс... Але няхай людзі не хвалююцца: пакуль ёсць сельскі Савет і СВК, дарогі будуць і дагледжаны, і расчышчаны.

— Вы ўжо вызначыліся з крыніцамі папаўнення бюджэтаў пярвічнага звяна? Вось у Віцебскай вобласці вырашылі пакідаць сельсаветам падаходны падатак.

— Кожная вобласць па-свойму падыходзіць да вырашэння фінансавых праблем... Нясвіж мае самабытную гісторыю, і гэта грэх не выкарыстаць. Сёлета плануецца аднаўленне старога млына і будаўніцтва гасцявых домікаў у вёсцы Макашы — пад рэалізацыю праекта выдзелена 500 мільёнаў рублёў з раённага бюджэту. Калі ўсё атрымаецца, будзе добра. Таксама плануем стварыць зону адпачынку па дарозе з Гарадзеі ў Нясвіж, каб людзі маглі тут спыніцца, перакусіць, цікава адпачыць... Думаем рэстаўраваць нашу гасцініцу, дабудаваць яшчэ адзін паверх.

Для вывучэння вопыту па арганізацыі турыстычных паслуг я пабываў у Літве — у іх ні адзін стары млын, ні адзін стары будынак не стаіць без справы, усё падлічана, кожны квадратны метр працуе з аддачай. У Польшчы таксама пазнаёміўся з работай аграсядзіб... Уявіце, стаіць звычайны дом, каля яго, на вуліцы, альтанкі. Піва, віно, вада... І вось турыстаў запрашаюць пакатацца на джыпе... Прыгналі звычайны «ўазік», толькі без тэнта, пасадзілі людзей і павезлі. І ўсім весела. Галоўнае — прыдумаць «фішку», «разыначку».

На ўзроўні нашых сельсаветаў існуюць пакуль што толькі задумы. Усё вырашае наяўнасць грашовых сродкаў — спачатку ж трэба нешта ўкласці, праўда? Магчыма, у кагосьці на тэрыторыі прыгожы парк захаваўся ці крынічка з «жывой» вадой, ці іншае цікавае месца... А калі ўсё толькі за вушы прыцягнута — хто туды паедзе? Людзей трэба чымсьці здзівіць, хоць бы «ўазікам» у ролі джыпа...

Гутарыла Наталля КАРПЕНКА.
Нясвіжскі раён.

ПРА ДАРОГІ, ЛАЗНІ, ЗВАЛКІ І ШМАТ ПРА ШТО ЯШЧЭ

Гутарка на выніковым семінары-нарадзе па рабоце органаў кіравання і самакіравання Брэсцкай вобласці , які адбыўся ў Баранавічах.

Пленарнае пасяджэнне пачалося з даклада старшыні абласнога Савета дэпутатаў Сяргея Ашмянцава. Ён падрабязна прааналізаваў шэраг праблем жыццезабеспячэння насельніцтва, упор зрабіў на недахопах работы органаў мясцовага кіравання і самакіравання. Была зроблена выснова, што работа па закупе малака і іншых прадуктаў сельскагаспадарчай вытворчасці ў насельніцтва вядзецца недастаткова актыўна. Паводле пераканання Сяргея Ашмянцава, калі б вясковец атрымліваў дзейсную дапамогу пры нарыхтоўцы кармоў, то малака з прыватнага сектара паступала б значна больш.

Разгляд пытанняў пра добраўпарадкаванне населеных пунктаў і работу сацыяльнай сферы пачаўся з прагляду відэакадраў. Усе прысутныя ўбачылі звалкі смецця літаральна за ваколіцай, наглуха закрытыя дзверы лазні, разбітыя непадсыпаныя дарогі. Справаздачу давялося трымаць гаспадарам тэрыторый, дзе здымалася «кіно»...

Яна СВЕТАВА.

ЗЕМЕЛЬНЫЙ ВОПРОС

УЧАСТОК НА ДВОИХ. ГРАМОТНОЕ РАЗДЕЛЕНИЕ

После вступления в силу Указа Президента Республики Беларусь от 27 декабря 2007 года № 667 «Об изъятии и предоставлении земельных участков» прошло немногим больше месяца, но у наших подписчиков накопилось уже множество вопросов на земельную тематику.

На вопросы читателей газеты отвечает заместитель председателя Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь Андрей ГАЕВ.

— У меня есть неприватизированный дачный участок недалеко от Минска. Каким образом изменится процесс приватизации земельных участков после вступления в силу указа № 667?

Андрей ПЕТРОВСКИЙ,
Минский район.

— Все правила, которые были установлены для получения участков в собственность, сохраняются и сейчас. Вам надо подать соответствующее заявление в райисполком и далее действовать по уже отлаженной процедуре. Участок возможно при желании выкупить в собственность по кадастровой стоимости либо получить его в пожизненно наследуемое владение.

— Многие граждане начали процесс приватизации в прошлом году...

— Закончить приватизацию земельных участков возможно и сейчас по старым правилам. Уточню, данный указ касается только тех граждан, которые уже в этом году будут заново получать абсолютно новые земельные участки для строительства жилья либо для других целей. Для граждан, которые хотят только документально оформить право на свой земельный участок в садоводческом товариществе, никаких усложнений и изменений указ не предусматривает.

— Мы вместе с сестрой имеем земельный участок в столице площадью 15 соток. На участке стоит дом и хозпостройки. В составе этой земли я имею свои 6 соток огорода, которые и обрабатываю. Могу ли я сейчас выделить из общего участка свои 6 соток, чтобы потом продать?

Людмила Васильевна,
г. Минск.

— Целевое назначение данного участка — строительство и обслуживание жилого дома. Дом на участке есть. Строение на долевом праве принадлежит, видимо, обеим сестрам. Простой раздел цельного участка Людмиле Васильевне не поможет. Сегодня соответствующим указом установлен запрет на отчуждение (продажу) свободных земельных участков, предоставленных для строительства и обслуживания жилого дома, кроме дарения близким родственникам. Подобный свободный участок сегодня можно или подарить близкому родственнику, или произвести его отчуждение исполкому, либо, если участок приобретался на аукционе, совершать с ним сделки без наличия строения.

В данном случае вам надо определиться по нескольким вопросам. Можно ли разделить этот участок? Соответствует ли это генеральному плану? Нужно обратиться в администрацию района и согласовать там этот вопрос. Нужно зарегистрировать раздел этого участка на две части и зарегистрировать права на них вместе с сестрой. Ведь целый участок был на долевом праве, значит и маленький будет на долевом праве. После чего необходимо получить разрешение на строительство, строить там дом, а после завершения строительства совершать сделку.

Подготовил Сергей КУРКАЧ.

НЕ ПАМЯНЯЛІ БАТАРЭЙКУ...

— На працягу пяці гадоў дзяржава бясплатна ўстанаўлівала аўтаномныя пажарныя апавяшчальнікі ў дамах, дзе жывуць інваліды, адзінокія і састарэлыя грамадзяне, шматдзетныя сем'і. А сёння там адбываюцца трагедыі па той прычыне, што жыхары не палічылі патрэбным замяніць батарэйку ў прыборы, — б'е трывогу начальнік Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС Анатоль БАБІЙ.

Начны пажар, да прыкладу, нарабіў бяды ў вёсцы Грандзічы Гродзенскага раёна. Дзве сям'і засталіся без даху і яшчэ пашчасціла, што ніхто з людзей не пацярпеў. Аднак наступствы маглі быць не такімі сур'ёзнымі, калі б сваю місію выканаў аўтаномны пажарны апавяшчальнік. Для чаго толькі і патрабавалася своечасова замяніць батарэйку.

Толькі летась на Гродзеншчыне ў 7597 домаўладаннях адрамантаваны печы, у 8276 дамах — электраправодка. Устаноўлена 73 867 аўтаномных пажарных апавяшчальнікаў. У будынках павышанай этажнасці адрамантаваны ўсе сістэмы дымавыдалення. Такім чынам, дзеля стварэння ўмоў для бяспечнага жыцця затрачваюцца вялізныя сродкі. Але належнай аддачы ад іх не будзе, пакуль ігнаруюцца прапісныя ісціны, як у вышэйпамянёным выпадку з батарэйкай да АПА.

Супрацоўнікі МНС праводзяць адпаведную растлумачальную работу з насельніцтвам, аднак без дапамогі тых жа старастаў, дэпутатаў сельскіх і пасялковых Саветаў ім не абысціся.

І яшчэ адна праблема вельмі непакоіць Анатоля Бабія — марудныя тэмпы абсталявання аб'ектаў з масавым і кругласутачным знаходжаннем людзей аўтаматычнай пажарнай сігналізацыяй, што неабходна для прафілактыкі і мінімізацыі магчымых страт ад надзвычайных сітуацый. У вобласці застаюцца «няўзброенымі» 210 аб'ектаў. Найбольш іх — на тэрыторыі Смаргонскага (32), Ваўкавыскага (31) і Слонімскага (28) раёнаў. У асноўным гэта інтэрнаты і сельскія клубы.

У мінулым годзе ў Бераставіцкім раёне ні на адным аб'екце не была змантыравана АПС, тады як у Лідскім — 9, у Зэльвенскім — 8, у Дзятлаўскім, Астравецкім, Слонімскім, Шчучынскім, Ваўкавыскім раёнах і ў абласным цэнтры — па 7.

Крыху лепш ідуць справы з сістэмамі апавяшчэння аб пажары. У Ваўкавыскім раёне такая сістэма адсутнічае на чатырох аб'ектах, у Лідскім — на трох. А вось у дзесяці раёнах вобласці гэту праблему вырашылі стопрацэнтна.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

«ПРЫНАДА» ДЛЯ ІНВЕСТАРА

Перспектыву таго ці іншага рэгіёна вызначае шэраг розных фактараў. Аднак бадай што аднымі з асноўных сёння становяцца спрыяльныя ўмовы для суб'ектаў гаспадарання — як дзяржаўных, так і прыватных. У выніку з'яўляецца перспектыўная вытворчасць, а таксама новыя працоўныя месцы, што для невялікіх населеных пунктаў надзвычай актуальна. Але ці прывабліваюць інвестараў прапановы? Яшчэ некалькі гадоў таму ў большасці выпадкаў нейкай асаблівай актыўнасці тут не назіралася. Цяпер сітуацыя паступова змяняецца да лепшага — у гэтым пераканаўся, што называецца, на ўласныя вочы падчас нядаўняй камандзіроўкі на Уздзеншчыну.

СА СТАЛІЦЫ — НА УЗДЗЕНШЧЫНУ

Прамысловыя прадпрыемствы раёна можна літаральна пералічыць па пальцах: участак Слуцкага сыраробнага камбіната, кааппрам, швейная фабрыка, камерцыйнае аб'яднанне «Волат-1». Вось практычна і ўвесь вытворчы сектар невялікага горада. Зразумела, што прамысловасці яўна недастаткова, таму бюджэт раёна больш чым на 60 працэнтаў датацыйны. Вялікая сацыяльная сфера (бальніца, фельчарска-акушэрскія пункты, установы адукацыі і культуры), якую неабходна ўтрымліваць у належным стане. А сродкі, што выдаткоўваюцца на адпаведныя патрэбы, даволі абмежаваныя. Паўстае пытанне наконт дадатковых крыніц фінансавання. І такія варыянты з'яўляюцца. У тым ліку і за кошт прыватнага сектара эканомікі.

— У адпаведнасці з нарматыўнай базай, якая дзейнічае цяпер, прыватнікі атрымліваюць адчувальныя прэферэнцыі, — заўважае намеснік старшыні Уздзенскага райвыканкама Тэрэза Шкель. — Цяпер у раёне працуюць 260 індывідуальных прадпрымальнікаў і 35 малых прадпрыемстваў, што, пагадзіцеся, нямала. Шмат сталічных фірмаў пачалі рэгістравацца на Уздзеншчыне — надзвычай станоўчы працэс.

Каб прывабіць інвестара, трэба стварыць вартую прапанову, і на Уздзеншчыне такая «прынада» знайшлася. У райцэнтры ёсць пэўная колькасць будынкаў, якія па розных прычынах доўгі час пуставалі і не выкарыстоўваліся па прызначэнні. Раённыя ўлады апраўдана лічаць, што гэта самы сапраўдны рэзерв, якім нельга не скарыстацца. У прыватнікаў даволі адчувальная патрэба ў вытворчых плошчах. Гэта датычыцца як сталіцы, так і шэрагу прысталічных раёнаў. Таму адпаведныя прапановы заўсёды карыстаюцца вялікім попытам. Тым больш на Уздзеншчыне, якая знаходзіцца ў «межах дасягальнасці» адносна сталіцы. Як адзначыла Тэрэза Шкель, шэраг «пустых» будынкаў у райцэнтры ўжо выстаўляўся летась на аўкцыён, сёлета такую практыку мяркуюць працягваць. Такім чынам можна адначасова вырашыць адразу некалькі надзённых задач. Па-першае, прыватнікі разгорнуць новыя вытворчасці, адпаведна, з'явіцца больш прапаноў на рынку працы, а будынкі, якія дагэтуль пуставалі, будуць даведзены да ладу.

БУДАЎНІЧЫ «БУМ»

На працягу некалькіх гадоў працягваецца рэканструкцыя ўздзенскага гарадскога аўтавакзала — выконваецца комплекс работ па цеплавой рэабілітацыі будынка, замене кацельні. На другім паверсе тут мяркуюць абуладкаваць гандлёвыя месцы. Абноўлены вакзал мяркуюць увесці ў эксплуатацыю ўжо ў сакавіку. Таксама хутка распачнецца будаўніцтва раённага Дома культуры — гэта адзін з буйных інвестыцыйных праектаў, якія будуць увасоблены ў жыццё ў бліжэйшы час. Цяпер РДК размешчаны ў... мясцовым касцёле, дарэчы, помніку архітэктуры XVIII стагоддзя. Сёлета будзе распрацавана праектна-каштарысная дакументацыя на ўзвядзенне Дома культуры. Акрамя гэтага, мяркуецца ўвесці ў эксплуатацыю новыя будынкі ЗАГСа, ваеннага камісарыята, суда і пракуратуры.

У хуткім часе ў горадзе з'явіцца і сучаснае маладзёжнае кафэ, а таксама аўтастаянка. Дарэчы, апошні аб'ект узвядзе прыватнік, які выкупіў «пусты» будынак. Стаянку на 100 аўтамабіляў, у тым ліку на 9 велікагрузных, адкрыюць ужо ў сакавіку (сёння ніводнай стаянкі ва Уздзе няма). А яшчэ, як плануецца, тут адкрыецца сэрвісны цэнтр рамонту аўто. Вялікі аб'ём работ выкананы па добраўпарадкаванні. І шмат яшчэ трэба зрабіць — да прыкладу, у раёне аўтавакзала давядуць да ладу парк і вадаём, каб стварыць добрую зону адпачынку для мясцовых жыхароў і гасцей горада. Планы вялікія, галоўнае, каб усе яны спраўдзіліся.

Адна з адметнасцяў цяперашняга часу — актыўнае жыллёвае будаўніцтва. Усяго летась было здадзена ў эксплуатацыю каля 23 тысяч кв. метраў жылля. У мінулым годзе быў заселены 75-кватэрны дом, сёлета плануецца распачаць узвядзенне яшчэ некалькіх, прынамсі, ЖБК ужо сфарміраваныя. Як адзначыла Тэрэза Шкель, чарга на атрыманне жылля рухаецца даволі хутка, таму гэтаму варыянту аддаюць перавагу многія, што ў выніку прывяло да скарачэння індывідуальнага будаўніцтва. У вёсцы — таксама сапраўдны будаўнічы «бум».

— Сельгаспрадпрыемствы ў мінулым годзе ўзвялі 57 дамоў, што нават больш, чым папярэдне плануецца, — гаворыць архітэктар Уздзенскага раёна Міхаіл Рабаў. — У тым ліку 6 катэджаў былі пабудаваны ў рэфармаваных гаспадарках. Сёлета плануецца здаць у эксплуатацыю 55 дамоў. Будаваць жыллё ў вёсцы імкнёмся адразу цэлымі кварталамі. Агульная плошча катэджаў (звычайна прапаноўваецца тры-чатыры праекты на выбар), што атрымліваюць тут людзі, складае ад 73 да 83 квадратных метраў. Такое жыллё, як правіла, мае ўсе «гарадскія» выгоды.

Дарэчы, утульнае, камфартабельнае жыллё выдзяляецца не толькі спецыялістам сельгаспрадпрыемстваў, але і работнікам сацыяльнай сферы — тым жа ўрачам. З кожным годам на Уздзеншчыне павялічваецца колькасць аграгарадкоў — сёлета адпаведны статус набудуць вёскі Магільнае і Войкава. Усяго на абуладкаванне вытворчых і сацыяльных аб'ектаў з розных крыніц тут плануецца выдзеліць каля 14 мільярдаў рублёў. Сума, безумоўна, значная, аднак такія інвестыцыі апраўданыя, бо трэба зрабіць усё як мае быць — аднойчы і на доўгія гады. Для таго, каб стварыць для вяскоўцаў вартыя ўмовы. Многія гаспадаркі могуць дазволіць сабе вялікае жыллёвае будаўніцтва, паколькі стабільна павялічваюць аб'ёмы вытворчасці.

З БЕСПРАЦОЎНЫХ — У ПРАДПРЫМАЛЬНІКІ

Працоўная міграцыя для аграрных раёнаў з нязначнай прамысловай сферай па-ранейшаму — пытанне «нумар адзін». Не выключэнне і Уздзеншчына, дзе тутэйшыя жыхары ўвесь час адчувалі недахоп вартых прапаноў для занятасці. Знайсці перспектыўнае месца з добрым заробкам — заўсёдная праблема. Аднак апошнім часам штогод актыўна ствараюцца новыя працоўныя месцы. Вынікі не прымусілі сябе чакаць — на Уздзеншчыну перасяляюцца жыхары з іншых раёнаў. Летась пераехалі пяць сем'яў, прычым, што цікава, дзве — з гарадоў. Гэтыя людзі атрымалі фінансавую дапамогу (каля 11 мільёнаў рублёў), а таксама жыллё. Такія ўмовы прывабліваюць многіх — ужо сёлета ў адну з тутэйшых гаспадарак перасяліліся спецыялісты з Барысаўшчыны.

Сумленным работнікам заўжды рады, у мясцовых таксама з'яўляюцца новыя магчымасці. Знайсці працу становіцца прасцей — летась уладкаваліся амаль 500 чалавек.

— На пачатак гэтага года на ўліку знаходзіліся 82 беспрацоўныя, што значна менш, чым пазалетась, — адзначае намеснік начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Уздзенскага райвыканкама Ала Каваленя. — У выніку ўзровень беспрацоўя скараціўся з 1,3 да 0,7 працэнта.

Напрыканцы студзеня на рынку працы было заяўлена 73 вакансіі, пераважная большасць якіх (65) — на рабочыя спецыяльнасці. Надзвычай запатрабаванымі застаюцца будаўнікі, аднак адпаведных прапаноў недастаткова. Мясцовы ліцэй рыхтуе спецыялістаў сельскагаспадарчага профілю. Дарэчы, на базе гэтай навучальнай установы праходзяць навучанне і групы, якія сфарміраваны з тых, хто стаіць на ўліку ў раённай службе занятасці, — пасля неабходнай перападрыхтоўкі ўсё ж лягчэй уладкавацца.

Беспрацоўныя зусім не супраць пачаць уласную справу і даволі актыўна такой магчымасцю карыстаюцца. Як паведаміла Ала Каваленя, на працягу мінулага года ў прадпрымальнікі падаліся 10 чалавек, «на раскрутку» яны атрымалі 48,7 мільёна рублёў. Былыя беспрацоўныя пачалі аказваць цырульніцкія паслугі, а таксама заняліся правядзеннем рамонтна-будаўнічых работ. Менавіта з роднымі мясцінамі ўсё больш людзей звязваюць сваю будучыню.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.
Уздзенскі раён.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
САВЕТ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,
ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,
УСТАНОВА «РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»

ГРАМАДСКІ САВЕТ:
МАЛАФЕЕЎ А. А., старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню;
САСОНКА М. П., старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту;
СЯЛІЦКІ В. С., старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў;
СІВАКОЎ В. А., старшыня Аршанскага гарадскога Савета дэпутатаў;
ЯРКОВІЧ В. І., старшыня Круглянскага сельскага Савета Магілёўскай вобласці.

АДКАЗНАЯ ЗА ВЫПУСК: Наталля КАРПЕНКА.
Кантактны тэлефон 292 21 03.

Краіна здароўя

Выпуск № 9 (65)

ДЭФІЦЫТ МЕДЫЦЫНСКІХ КАДРАЎ У МІНСКУ ВЫРАШАЮЦЬ З ДАПАМОГАЙ НАДБАВАК ДА ЗАРПЛАТЫ І ПРАДАСТАЎЛЕННЕМ ЖЫЛЛЯ

Мінгарвыканкам мае намер вырашыць праблему дэфіцыту медыцынскіх кадраў у сістэме аховы здароўя сталіцы, паведамілі ў камітэце па ахове здароўя мэрыі.

У цяперашні час укамплектаванасць урачамі ў сталіцы складае 68 працэнтаў, сярэднім медперсаналам — 70 працэнтаў, канстатавалі спецыялісты. Нягледзячы на тое, што прагнозныя паказчыкі па росце сярэдняй заработнай платы ў галіне выкананы (за снежань 2007 года сярэдняя зарплата склала $341), па ўзроўні аплаты за 1 гадзіну работы сістэма аховы здароўя Мінска працягвае саступаць іншым галінам сацыяльнай сферы. Сярэдняя заработная плата ўрачоў сталіцы, нават з улікам каэфіцыенту сумяшчальніцтва, у 1,3 ніжэйшая, чым ва ўрачоў у рэгіёнах. Акрамя таго, захоўваецца розніца ў больш нізкі бок пры аплаце працы маладых спецыялістаў, якія ў пераважнай колькасці накіроўваюцца на ўзровень пярвічнай медыка-санітарнай дапамогі. Перагрузка — таксама адна з асноўных прычын звальнення персаналу. Існуючая кадравая сітуацыя можа адбіцца на інтэнсіўнасці развіцця галіны, зменшыць эфект ад рэсурсаў, якія ўкладваюцца ў перааснашчэнне сістэмы, занепакоены ў камітэце па ахове здароўя.

Замацаванню ўрачоў на месцах будзе садзейнічаць распрацаваная праграма мераў. Так, у горадзе ўжо ўведзены дадатковыя даплаты асобным катэгорыям медработнікаў, разглядаецца пытанне па павелічэнні ўзроўню аплаты вузкім спецыялістам. Таксама прынята рашэнне аб будаўніцтве сямейнага інтэрната для ўрачоў пярвічнага звяна. Акрамя таго, у 2007 годзе горадам па спісах аховы здароўя выдзелена 100 кватэр, яшчэ 47 — на ўзроўні раёнаў. «Неабходны комплекс мераў па вяртанні кадраў у галіну, у тым ліку і маладых спецыялістаў, і прафесіяналаў у пенсійным узросце. І меры такія прымаюцца», — падкрэслілі ў камітэце па ахове здароўя.

Кар. БЕЛТА.

«МІНУСЫ» НЕАБАРОНЕНАГА КАХАННЯ

Яшчэ літаральна 20 гадоў таму пра гэтыя «мінусы» ніхто і не здагадваўся...

Упершыню ў сталіцы пройдзе Дзень прафілактыкі захворванняў, якія перадаюцца палавым шляхам. Мінскі гарадскі цэнтр здароўя абраў для гэтай мэты 21 лютага. Што ж, цудоўны момант: паміж падзеямі 14 лютага і двума наступнымі святамі «па палавой прымесе». Карацей кажучы, самы час наведаць венеролага — падрыхтавацца да вясны...

Для падлеткаў 21 лютага ў цэнтрах дружалюбных адносінаў да гэтай катэгорыі грамадзян (цэнтры працуюць на базе шасці дзіцячых паліклінік), будуць праведзены тэматычныя асветніцкія семінары. Дарослым жа прапануецца перамагчы сваю неадукаванасць у галіне палавых інфекцый з дапамогай спецыялістаў інфа-лініі 226 31 93, якая будзе працаваць 21 лютага з 9.00 да 18.00.

Паводле слоў загадчыка амбулаторнага скурна-венералагічнага аддзялення Мінскага гарадскога скурна-венералагічнага дыспансэра Уладзіміра ЯРОМІЧА, першае за апошняе дзесяцігоддзе зніжэнне ў рэспубліцы колькасці выпадкаў венерычных захворванняў і інфекцый, якія перадаюцца палавым шляхам, прыпала на 2006 год. Аднак гэта станоўчая тэндэнцыя захавалася і летась: скажам, колькасць выпадкаў сіфілісу знізілася на 15 працэнтаў, ганарэі — на 5, хламідыёзу — на 24, трыхаманозу — таксама на 24, анагенітальнага герпесу — на 48...

Спецыялісты перакананыя, што вялікі ўклад у гэту справу ўнесла актыўная прафілактычная работа, досыць шырокае асвятленне адпаведнай праблематыкі ў СМІ, а таксама даступнасць ананімнага абследавання. А скептыкам з добрым пачуццём гумару прыходзяць на памяць словы некаторых псіхолагаў і сэксолагаў, на думку якіх у беларусаў проста не ўсё гладка з лібіда.

Так ці інакш, але кожны сучасны чалавек павінен «добра плаваць» у моры інтымнай інфармацыі, паколькі легкадумная неабачлівасць можа пагражаць сапраўды сур'ёзнымі наступствамі, напрыклад, істотным падрывам здароўя або немагчымасцю мець дзяцей. Акрамя таго, наяўнасць палавой інфекцыі спрыяе больш лёгкаму заражэнню ВІЧ.

Паводле звестак Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, для любой краіны характэрна найбольшая распаўсюджанасць хламідыйнай, урэаплазмознай і мікаплазмознай інфекцый, якія практычна не праяўляюцца. Вось венерычныя захворванні — сіфіліс і ганарэя — зусім іншая справа. Іх праяўленні, наадварот, звычайна цяжка не заўважыць. Па гэтай прычыне іх раней выяўляюць і лечаць. Праўда, не ананімна, паколькі гаворка ідзе пра захворванні сацыяльна небяспечныя, здольныя не толькі моцна падарваць здароўе, але і адняць жыццё.

Інфекцыі, якія перадаюцца палавым шляхам (іх пакуль вядома крыху больш за трыццаць) — таксама не зусім бяскрыўдныя. Да іх ліку адносяцца, скажам, не толькі педыкулёз ці кароста, але і гепатыты, ВІЧ-інфекцыя. У цэлым жа нават вышэй пералічаныя ІППШ небяспечныя сваёй здольнасцю выклікаць запаленчыя працэсы і, як следства, бясплоднасць. Варта нагадаць, што ў нашай краіне з праблемай бясплоднасці сутыкнулася ўжо кожная шостая сямейная пара. Прычым у палове такіх выпадкаў сітуацыя тлумачыцца якраз перанесенымі ў маладыя гады палавымі інфекцыямі.

Як часта трэба наведвацца да венеролага (гінеколага, уролага) з мэтай абследавацца на ІППШ? Па сутнасці, варта арыентавацца на інтэнсіўнасць палавога жыцця, частату змены партнёраў, але не меней за раз на год. Варта мець на ўвазе, што ў розных палавых хвароб — розны інкубацыйны перыяд (час ад моманту заражэння да праяўлення захворвання). Так, пры ганарэі гэта — ад некалькіх гадзін да некалькіх сутак, пры хламідыёзе — да некалькіх тыдняў. І ўвесь гэты час інфіцыраваны можа заражаць іншых. Згодна з даследаваннямі, жанчыны маюць большую рызыку заражэння, чым мужчыны. Наогул жа ў справе заражэння важнымі будуць некалькі момантаў. Скажам, моц імуннай сістэмы, наяўнасць пашкоджанняў на слізістай, інтэнсіўнасць палавога кантакту, наяўнасць «крытычнай колькасці» інфекцыйных агентаў... Вось чаму не абавязкова пры аднаразовым кантакце з заражаным партнёрам здаровы павінен падвергнуцца заражэнню. Хоць наўрад ці варта выпрабоўваць лёс. Лепшай абаронай у гэтай справе быў і застаецца прэзерватыў.

А вось які метад дыягностыкі лічыцца самым дакладным, сказаць у прынцыпе немагчыма, паколькі для кожнай інфекцыі ён свой. Для выяўлення сіфілісу выкарыстоўваюць, напрыклад, мазкі-адбіткі, сераалагічныя рэакцыі крыві, нарэшце, знешні агляд, пры ганарэі — мазкі і пасеў на спажыўнае асяроддзе, хламідыях і ўрэаплазмах — стары добры бактэрыяскапічны метад, рэакцыю імунафлюарысцэнцыі, імунаферментны аналіз, палімеразна-ланцуговую рэакцыю, пасеў на культурнае асяроддзе.

— Найбольш правільна — абследавацца на тыя ж хламідыі не адным спосабам, — кажа Уладзімір Яроміч. — Праўда, дадатковыя метады будуць адносіцца да ліку платных паслуг. Акрамя таго, такі метад, як ПЛР наогул робіцца ў горадзе платна. Варта таксама мець на ўвазе, што гэты дарагі спосаб абследавання немэтазгодна выкарыстоўваць пры пошуку, скажам, урэаплазмаў ці гарднерэл. Дарэчы, на працягу гэтага года дыспансэр таксама будзе ўкараняць ПЛР-дыягностыку...

Нават калі тая ці іншая інфекцыя была вынайдзена толькі ў аднаго партнёра, урачы рэкамендуюць пралячыцца і другому, а пасля праходжання лячэбнага курсу — прайсці кантрольнае абследаванне.

Святлана БАРЫСЕНКА.

«АДСТУПЛЕННЕ» ГРЫПУ ПАЧАЛОСЯ З ЗАХОДНІХ РЭГІЁНАЎ

За апошні тыдзень (з 11 па 17 лютага) на грып і ВРВІ ў кантрольных гарадах Беларусі захварэлі 77 279 чалавек, што на 7,5 працэнта менш за паказчык папярэдняга тыдня. У сталіцы на мінулым тыдні з сімптомамі прастуды і грыпу ў медыцынскія ўстановы звярнуліся больш як 32 тысячы мінчан (на папярэднім тыдні — каля 37 тысяч чалавек). Усяго з пачатку эпідэмічнага пад'ёму колькасць захварэлых у Мінску дасягнула 123 тысяч чалавек, што складае каля 7 працэнтаў насельніцтва горада.

Паводле інфармацыі рэспубліканскай санэпідслужбы, правядзенне проціэпідэмічных мерапрыемстваў адмененае ўжо ў трох кантрольных гарадах: Брэсце, Гродне і Лідзе (менавіта яны ў студзені «загрыпавалі» першымі). Выйшлі з эпідэміі грыпу таксама Брэсцкі, Драгічынскі, Лідскі, Гродзенскі, Свіслацкі, Беластавіцкі і Іўеўскі раёны. На сёння працягваюць «грыпаваць» 8 кантрольных гарадоў (Мінск, Барысаў, Бабруйск, Салігорск, Баранавічы, Маладзечна, Магілёў і Віцебск) і 30 адміністрацыйных тэрыторый.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Бяспечнае харчаванне

Перапынак на «чайкоўскага»

Чай разам з фруктамі можна ўнесці ў спіс прадуктаў, якія складаюць аснову здаровага харчавання. Гэты напой валодае бактэрыцыдным дзеяннем, прычым, чым вышэй гатунак чаю, тым вышэй антыбактэрыяльная актыўнасць. Гэты напой нармалізуе работу кішэчніка і карысны для жанчын у клімактэрычны перыяд.

Што датычыцца, напрыклад, зялёнага чаю, то варта мець на ўвазе адну акалічнасць: яго колер з'яўляецца ледзь ці не асноўным наглядным паказчыкам якасці. Чым больш светлае зялёнае адценне мае ліст, тым вышэйшы гатунак.

Існуе неверагодна вялікая колькасць гатункаў чорнага чаю. Яго можна назваць яшчэ «спелым»: лісце паступова наліваецца сокам і чарнее на паветры накшталт разрэзанага яблыка.

Аматары чаю з бергамотам маюць права ведаць, што гэта маленькая цытрусавая расліна па знешнім выглядзе нагадвае лімон. Кажуць, што пры вонкавым выкарыстанні такі чай ачышчае скуру, танізуе і звужае поры, а таксама спрыяе знікненню пігментных плям. Гэты напой цудоўна дапамагае зняць нервовае напружанне і пазбавіцца стомленасці.

Чай проціпаказаны:

- дзецям да 10 гадоў;
- цяжарным жанчынам на апошніх тэрмінах, асабліва калі ёсць рызыка развіцця таксікозу;
- гіпертонікам з цяжкай формай хваробы;
- людзям, якія пакутуюць ад бяссонніцы;
- лёгка ўзбуджальным;

vтым, у каго ёсць індывідуальная непераноснасць кафеіну (яе сімптомы — нематываваны неспакой, гіперрухавасць, пачашчанае сэрцабіццё, галаўныя болі);

- людзям у стане алкагольнагаап'янення.

Са старажытных часоў у Кітаі лічылі, што чай не спалучаецца з алкаголем. Чай пасля віна шкодзіць ныркам, паясніца і бёдры наліваюцца цяжарам, мачавы пузыр халадзее і баліць, акрамя таго назапашваецца макрота і з'яўляецца ацёчнасць ад выпітай вадкасці. Сучасная медыцына таксама не бачыць у гэтым нічога добрага. З яе пункту гледжання, чай і алкаголь надта ўзмацняюць дзеянне адзін аднаго, а занадта — заўсёды дрэнна.

Ніколі не варта забывацца на ўмеранасць. 5—6 кубкаў у дзень не вельмі моцнага чаю — дастаткова для дарослага чалавека, для пажылога — не больш за 4 кубкі, для дзяцей пасля 10 гадоў — 2—3. Наогул лепей піць чай пакрысе, але абавязкова свежапрыгатаваным і цёплым, а не гарачым.

Старажытныя кітайскія трактаты рэкамендуюць: «Вытрымайце час, які патрабуецца для таго, каб зрабіць тры ўдыхі і тры выдыхі, і наліце чай у кубак, а пасля, каб чай аддаў свой водар вадзе, выліце яго назад у чайнік. Зноў пачакайце (тры ўдыхі, тры выдыхі), пасля чаго прапануйце чай гасцям». Майце таксама на ўвазе, што праз 10 хвілін пасля гатавання ў напой выходзяць такія фракцыі, якія пагаршаюць якасць і смак, дадаюць горыч.

Харчовыя прадукты, з якімі можна ўжываць чай, дзеляцца на пяць груп:

— цукар і іншыя прысмакі (цукеркі, варэнне, мёд);

— малако і малочныя прадукты (вяршкі, сметанковае масла);

— мука, крупы (рыс, проса) і мучныя вырабы;

— лімон і іншыя цытрусавыя, натуральныя сокі і фрукты, ягады;

— прыправы (імбір, карыца, перац, кардамон, мята, кмен).

Некаторыя забароны:

1. Не піце чай на пусты страўнік (халодная прырода чаю ахалоджвае селязёнку і страўнік).

2. Не піце надта гарачы чай (у горле, страваводзе, страўніку могуць узнікнуць хваравітыя змяненні).

3. Не піце халодны чай (цёплы надае бадзёрасці, а халодны правакуе застой холаду і змацаванне макроты).

4. Не злоўжывайце моцным чаем (гэта можа стаць прычынай бяссонніцы і галаўнога болю).

5. Не запівайце чаем лекі (чай іх разбурае).

6. Не піце чай да ці пасля ежы (патрэбны перапынак на 20—30 хвілін).

7. Не піце перастаялы чай (літаральна праз 20—30 хвілін пасля гатавання пачынаецца працэс акіслення некаторых складнікаў).

8. Не разбаўляйце заварку шмат разоў (гэта і шкодна, і бессэнсоўна — карысных рэчываў у напоі ўжо няма).

9. Не злоўжывайце колькасцю (не вельмі моцны чай варта ўжываць у аб'ёме 4—5 кубкаў у дзень).

Святлана БАРЫСЕНКА.

У Першамайскім раёне г. Віцебска прайшло культурна-спартыўнае свята «Дзень здароўя», прысвечанае Году здароўя. Больш як 1000 жыхароў і працаўнікоў раёна ўзялі ўдзел у спартыўных спаборніцтвах, конкурсах і віктарынах, гульнях, катанні на санках і конях.

Фота Аляксандра ХІТРОВА, БЕЛТА.

Лекі ад хваробы — пацыентам. А «таблеткі для сумлення» — фармвытворцам і ўрачам

Кожны год, як толькі распачынаецца ў нашай краіне сезон прастудных захворванняў, на беларусаў літаральна абрушваецца лавіна рэкламы. «У вас заложаны нос? — спагадліва пытаецца ў наведвальніка аптэкар. — А ў вас высокая тэмпература? А вас непакоіць кашаль?». І прапаноўвае ўсім адзін і той жа новы айчынны лекавы прэпарат. Некаторыя фразы з тэлевізійнай рэкламы становяцца «крылатымі» і ходзяць у народзе: «Як я вас разумею», «Не, вы мяне не разумееце», «Цудоўна разумею». Менавіта дзякуючы яркай і запамінальнай рэкламе беларусы «змятаюць» з аптэчных прылаўкаў фервекс і эфералган, тэрафлекс і прастамол, фестал і мезім фортэ, бо героі рэкламных ролікаў настойліва раяць: «З'еў лішняга? Дык дапамажы свайму страўніку...» Пытанні этычнага і неэтычнага прасоўвання лекавых сродкаў аказаліся ў цэнтры ўвагі ўдзельнікаў рэспубліканскай нарады, якая прайшла ў сценах Міністэрства аховы здароўя.

— Доўгі час на фармацэўтычным рынку прысутнічалі толькі дзве дзеючыя асобы: гэта пацыент і ўрач. У сярэднявечча з'явіўся трэці ігрок — аптэкар. А ў XX стагоддзі адбыліся проста грандыёзныя змяненні, калі на фармацэўтычны рынак прыйшоў вытворца лекавых прэпаратаў, — разважае **загадчык кафедры клінічнай фармакалогіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Міхаіл КЕЎРА.** — І мы не можам сёння адмаўляць той факт, што сур'ёзны прагрэс у лячэнні тых ці іншых захворванняў, якога нам удалося дасягнуць у апошнія дзесяцігоддзі, звязаны, у першую чаргу, з укараненнем у медыцынскую практыку сучасных лекавых прэпаратаў новага пакалення. Іх з'яўленню мы абавязаны буйным фармацэўтычным кампаніям. Для распрацоўкі аднаго арыгінальнага лекавага прэпарата патрабуецца ад 800 млн да 1,5 млрд долараў ЗША і дзесяцігоддзі карпатлівай працы. Як бачна, выдаткі на стварэнне новых лекаў проста фантастычныя, таму цалкам лагічна, што іх трэба неяк кампенсаваць, плюс яшчэ і атрымаць прыбытак. Вось фармацэўтычныя вытворцы і пачынаюць прасоўваць свой прэпарат на рынак. Але ці заўсёды этычна?

Упершыню этычныя крытэрыі прасоўвання лекавых сродкаў былі сфармуляваныя на 41-й Сусветнай асамблеі аховы здароўя ў Рэзалюцыі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя ў 1988 годзе. У Беларусі сфера абароту лекавых сродкаў рэгулюецца Законам «Аб лекавых сродках», пастановамі Савета Міністраў, Міністэрства аховы здароўя і іншымі нарматыўнымі прававымі актамі. І ўсё ж такі неабходнасць рэгулявання этычных нормаў і ўстанаўлення пэўных правілаў паводзінаў усіх суб'ектаў фармацэўтычнага рынку застаецца.

— Міністэрства аховы здароўя не хавае сваёй заклапочанасці сітуацыяй, звязанай з прасоўваннем лекавых сродкаў, — падкрэсліў у сваім выступленні **намеснік міністра аховы здароўя нашай краіны Валерый ШАЎЧУК.** — Асобныя кампаніі ці прадстаўнікі замежных кампаній, што працуюць на беларускім фармацэўтычным рынку, дапускаюць шэраг парушэнняў этычнага характару, якія выражаюцца ў прамым ці ўскосным стымуляванні ўрачоў і фармацэўтычных работнікаў, каб тыя пры выпісцы рэцэптаў, прызначэнні лячэння і выдачы рэкамендацый захоўвалі інтарэсы толькі пэўных вытворцаў. Да таго ж Міністэрства аховы здароўя неаднаразова звяртала ўвагу фармацэўтычных вытворцаў на недапушчальнасць правядзення рэкламных гульняў ці якіх-небудзь іншых акцый і мерапрыемстваў з выкарыстаннем стымулаў для заахвочвання распаўсюджвання ці набыцця тых ці іншых лекавых прэпаратаў.

Намеснік начальніка ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі міністэрства Людміла ЖЫЛЕВІЧ прызналася, што пры фарміраванні Пераліку асноўных лекавых сродкаў Міністэрству аховы здароўя давялося сутыкнуцца з моцным супраціўленнем. Гэты пералік уключае толькі жыццёва важныя прэпараты з даказанай эфектыўнасцю. І менавіта ім кіруюцца ўрачы пры выпісцы хворым рэцэптаў. І вось тут раптам высветлілася, што дзякуючы агрэсіўнай рэкламе фармацэўтычных кампаній у некаторых пацыентаў ужо паспелі сфарміравацца пэўныя стэрэатыпы, што той ці іншы прэпарат ім проста жыццёва неабходны. І калі яны не знаходзілі яго ў зацверджаным пераліку, людзі пісалі скаргі ў міністэрства.

— Я лічу проста недапушчальным уцягваць пацыентаў у нашы гульні. Такія паводзіны павінны ўсімі асуджацца. Адказнасць за жыццё і здароўе пацыента ў рэшце рэшт нясе ўрач. І апошняе слова павінна быць за медыцынскім работнікам, — падкрэсліла Людміла Жылевіч.

Між іншым, а наколькі добра нашы ўрачы арыентуюцца ва ўсіх навінках фармацэўтычнага рынку? У Беларусі, напрыклад, зарэгістравана больш як 6 тысяч найменняў лекавых сродкаў (а ў свеце іх налічваецца каля 300 тысяч найменняў). На думку Міхаіла Кеўры, асноўную інфармацыю аб новых леках урачы атрымліваюць сёння ад іх вытворцаў, хоць фарміндустрыя не можа, не імкнецца і не павінна вучыць урачоў рацыянальнаму выкарыстанню лекавых сродкаў. Гэта задача спецыялістаў па фармакатэрапіі і Міністэрства аховы здароўя, якое павінна стварыць сістэму павышэння кваліфікацыі ў галіне лекавай тэрапіі.

Не сакрэт, што некаторыя вытворцы, прасоўваючы лекавыя сродкі, часта не паведамляюць спажыўцу пра пабочныя эфекты ад лячэння прэпаратам, даюць аднабакую інфармацыю, падаючы лякарства як панацэю ад усіх хвароб. Між іншым, згодна з новым Законам «Аб рэкламе», які пачаў дзейнічаць з лістапада мінулага года, рэклама лекавых сродкаў не павінна змяшчаць сцвярджэнняў аб тым, што лячэбны эфект ад прыёму лекавага сродку з'яўляецца абсалютна гарантаваным, а таксама інфармацыю, якая магла б стварыць уражанне, што кансультацыя з урачом — неабавязковая.

— Таксама рэклама лекавых сродкаў не павінна падштурхоўваць здаровага чалавека да думкі аб неабходнасці спажывання лекавага сродку, — тлумачыць **загадчык Рэспубліканскай клініка-фармакалагічнай лабараторыі Цэнтра экспертыз і выпрабаванняў у ахове здароўя Дзмітрый РАЖДЗЕСТВЕНСКІ,** — у яго не павінна скласціся ўражанне, што ў выпадку непрымянення гэтага прэпарата яго здароўе можа пагоршыцца ці палепшыцца. Прыведу некалькі прыкладаў рэкламы з расійскага рынку. На ўпаковцы прэпарата ўтрымліваецца надпіс, з якога вынікае, што мільёны людзей церпяць у сведе ад дэпрэсіі, але не ведаюць, што дэпрэсія — гэта хвароба. Па логіцы, хваробу трэба лячыць. А, можа, у чалавека проста дрэнны настрой? Як ён можа гэта самастойна вызначыць? Тым больш нельга займацца самалячэннем дэпрэсіі. Ці вось яшчэ адзін яскравы прыклад. На прэпарацыі напісана, што «кожная чацвёртая жанчына ў Расіі церпіць ад стрэсавага нетрымання мачы». Выходзіць, што калі ў сям'і чатыры жанчыны, то як мінімум адна з іх павінна карыстацца гэтым прэпаратам. Жанчыны чытаюць на ўпаковцы: «Ты можаш дапамагчы сабе». І нідзе не ўказана, што перш чым выкарыстоўваць дадзены рэкламны прадукт, Дарэчы, не выключана, што менавіта дзякуючы вялікай «рэкламнай хвалі», у Беларусі так масава распаўсюдзілася самалячэнне. Па тэлевізары нам паведамляюць у рэкламе, як жыць з адэномай прастаты, па радыё — даюць парады, як пазбегнуць ускладненняў ад цукровага дыябету ці як прымаць аспірын для прафілактыкі сардэчна-сасудзістых захворванняў...

Сакратар Савета рэспубліканскага грамадскага аб'яднання фармацэўтычных работнікаў «Фармабел» Валянціна САСОНКІНА звярнула ўвагу на праблему навязвання работнікам аптэк прадукцыі тых ці іншых фармацэўтычных вытворцаў: іх тавар выстаўляецца на вітрынах на першым плане, прымяняюцца таксама і іншыя «схаваныя» метады размяшчэння рэкламы ў гандлёвай зале. Прычым такая падтрымка, як правіла, фінансава заахвочваецца.

З аналагічнымі праблемамі сутыкаліся, зразумела, і іншыя краіны свету. Таму, многія інавацыйныя кампаніі, усвядоміўшы высокую адказнасць перад грамадствам, выпрацавалі пэўныя прынцыпы прафесійных паводзінаў і замацавалі іх у этычных кодэксах — зводах правілаў і нормаў, якія вызначаюць адказнасць прадстаўнікоў фармацэўтычных кампаній, урачоў і фармацэўтаў не толькі адзін перад адным, але і перад пацыентамі. Адзін з прыкладаў — Кодэкс маркетынгавай практыкі Асацыяцыі міжнародных фармацэўтычных вытворцаў (AIPM). Гэта некамерцыйная арганізацыя прадстаўляе на беларускім рынку прафесійныя і дзелавыя інтарэсы 18 міжнародных фармацэўтычных кампаній-вытворцаў арыгінальных лекавых сродкаў. У галіне маркетынгу і прасоўвання прэпаратаў кампаніі прытрымліваюцца самых высокіх этычных стандартаў. На нарадзе было прынята рашэнне аб распрацоўцы і зацвярджэнні Правілаў належнага прасоўвання лекавых сродкаў фармацэўтычнымі кампаніямі ў Рэспубліцы Беларусь, а да гэтага часу было вырашана прытрымлівацца палажэнняў Кодэкса маркетынгавай практыкі AIPM, адобранага Міністэрствам аховы здароўя нашай краіны. У рэзалюцыі, прынятай па выніках нарады, утрымліваецца таксама рашэнне аб стварэнні Грамадскага савета з удзелам спецыялістаў Міністэрства аховы здароўя, прадстаўнікоў прафесійных грамадскіх аб'яднанняў і асацыяцый, прадстаўнікоў міжнародных фармацэўтычных вытворцаў у Беларусі, а таксама прадстаўнікоў СМІ па разглядзе выпадкаў неэтычнага прасоўвання лекавых сродкаў фармацэўтычнымі кампаніямі. Высокая канкурэнцыя не павінна стаць перашкодай для фарміравання цывілізаванага рынку, а пацыенты — ахвярамі чужых фінансавых інтарэсаў — вось галоўная выснова прайшоўшай у Міністэрстве аховы здароўя нарады...

Надзея НІКАЛАЕВА.

Восем вядучых гандлёвых найменняў па аб'ёму аптэчных продаж:

Месца ў рэйтынгу		
I палова 2007 г.	II палова 2006 г.	Гандлёвая назва
1	1	Эналапрыл
2	2	Мілдранат
3	12	Дзіратон
4	5	Прастамол Уно
5	11	Тэрафлекс
6	16	Актавегін
7	6	Эсэнцыяле Н
8	4	Амладзін

Прыступ панкрэатыту — «бунт» падстраўнікавай залозы

Востры панкрэатыт сёння займае трэцяе месца сярод хірургічных захворванняў пасля апендыцыту і вострага халецыстыту. Бясспрэчныя «вінаўнікі» такога становішча — злоўжыванне алкаголем, незбалансаванае харчаванне, жоўцекамянёвая хвароба.

Панкрэатыт — запаленне падстраўнікавай залозы.

Старажытнагрэчаскія ўрачы называлі падстраўнікавую залозу «pancreas» («уся з мяса»). Гэта назва дадзена органу з-за яго мясістай кансістэнцыі, бледна-ружовага колеру, падобнага на колер вымачанага мяса. Размяшчаецца яна ў брушной поласці ззаду страўніка, цесна прымыкаючы да дванаццаціперснай кішкі. Падстраўнікавая залоза — другая па велічыні (пасля пячонкі) залоза стрававальнай сістэмы. Унутры залозы праходзіць галоўны праток, які злучаецца з агульным жоўцевым пратокам перад упадзеннем у дванаццаціперсную кішку.

Асноўныя функцыі, якія выконвае падстраўнікавая залоза:

— экзакрынная: выпрацоўка рэчываў-ферментаў, якія ператраўліваюць ежу, што паступае ў дванаццаціперсную кішку;

— эндакрынная: выпрацоўка гармонаў (інсуліну і інш.), якія рэгулююць узровень глюкозы ў крыві.

Такім чынам, адна з задач, пастаўленых перад падстраўнікавай залозай, — забяспечваць перапрацоўку цяжкатраўных прадуктаў, з якімі не змог справіцца страўнік. За дзень залозай выпрацоўваецца каля 1000 г панкрэатычнага соку (сакрэту). Апошні змяшчае набор такіх актыўных у хімічных адносінах ферментаў, што здольны растварыць практычна любыя харчовыя інгрэдыенты, робячы іх прыдатнымі для засваення. Каб засцерагчы сябе ад самаператраўлівання, залоза выпрацоўвае спецыяльныя рэчывы, якія падаўляюць актыўнасць панкрэатычных ферментаў. У норме ферменты і антыферменты ўраўнаважваюць адзін аднаго. Да таго ж унутры залозы ферменты знаходзяцца ў неактыўнай форме і набываюць поўную сілу, ужо трапіўшы ў кішэчнік і змяшаўшыся з ежай.

Аднак здараюцца збоі і ў рабоце гэтага органа. Пад уздзеяннем розных фактараў (напрыклад, калі залоза раптам павялічвае выпрацоўку соку або на яго шляху ўзнікае нейкая перашкода — камень, пухліна, рубец) павышаецца ціск у пратоку залозы, парушаецца адток яе сакрэту. У выніку замест таго, каб ператраўліваць ежу, панкрэатычныя ферменты, дачасна актывізаваўшыся, пачынаюць ператраўліваць тканкі самой залозы. Развіваецца вострае запаленне, якое можа прывесці да ацёку, нагнойвання і амярцвення тканкі. Пры вострым панкрэатыце назіраецца таксама парушэнне работы і іншых органаў стрававальнай сістэмы.

Прыступ вострага панкрэатыту патрабуе тэрміновай шпіталізацыі!

Нярэдка пасля вострай формы захворвання ў чалавека развіваецца хранічны працэс. Пры хранічным захворванні нармальная тканка падстраўнікавай залозы паступова замяняецца рубчастай, развіваецца недастатковасць экзакрыннай і эндакрыннай функцыі залозы, што можа стаць прычынай з'яўлення цукровага дыябету.

Фактары, якія правакуюць запаленне падстраўнікавай залозы: злоўжыванне алкаголем; захворванні жоўцевага пухіра, жоўцевых шляхоў, дванаццаціперснай кішкі; анатамічныя анамаліі пратоку падстраўнікавай залозы (звужэнне, пухліны і г.д.); уздзеянне некаторых лякарстваў і таксічных рэчываў; значныя харчовыя нагрузкі (тлустыя і вострыя стравы); траўмы жывата; сасудзістыя захворванні (часцей у пажылых людзей); інфекцыі; нервова-псіхічнае пераўзбуджэнне.

Дарэчы, верагоднасць «займець» панкрэатыт ёсць не толькі ў хворага на хранічны алкагалізм, але і ў чалавека, які аднаразова выпіў вялікую дозу алкаголю і закусіў пры гэтым тлустай, вострай або смажанай ежай. Хоць больш за ўсё рызыкуюць тыя людзі, хто злоўжывае алкаголем. Уплыў спіртнога на падстраўнікавую залозу шматбаковы. Гэта і прамое таксічнае ўздзеянне (залоза, у адрозненне ад пячонкі, не мае ферменту, які б расшчапляў алкаголь), і ўздзеянне на сасуды, і павышэнне вязкасці сакрэту падстраўнікавай залозы, што садзейнічае парушэнню яго адтоку. Акрамя таго, алкаголь стымулюе сакраторную функцыю залозы.

Як распазнаць панкрэатыт?

У першую чаргу, хворага чалавека непакоіць боль (пры вострым прыступе — боль нясцерпны). Ён узмацняецца пасля яды і лакалізуецца ў «падлыжачнай» вобласці, нярэдка распаўсюджваецца ў левае і правае падрабрынне і аддае ў спіну. Часта боль бывае апаясваючы; узмацняецца, калі легчы на спіну, і слабее, калі сесці і крыху нахіліцца наперад. «Адгалоскі» болю могуць дайсці да вобласці сэрца, імітуючы стэнакардыю. Другі непрыемны спадарожнік панкрэатыту — панос. Стул становіцца кашкападобным, пры гэтым можа змяшчаць часцінкі неператраўленай ежы. Ён мае непрыемны пах, часам пеністую кансістэнцыю, цяжка змываецца са сценак унітаза. Часта адзначаюцца млоснасць, рвота, сухасць у роце, адрыжка, метэарызм. Чалавек страчвае апетыт і хутка худзее.

Дыягнаставаць панкрэатыт бывае даволі складана, таму што падстраўнікавая залоза размешчана вельмі глыбока ў целе чалавека. У гэтым урачу-гастраэнтэролагу дапамагаюць лабараторныя і інструментальныя метады даследавання (УГД органаў брушной поласці, агульны клінічны і біяхімічны аналіз крыві, аналіз мачы і інш.).

Лячэнне вострага панкрэатыту і абвастрэнняў хранічнага праходзіць ва ўмовах стацыянару. Перш за ўсё праводзіцца комплекс процішокавых мерапрыемстваў. Здымаецца боль і максімальна (з дапамогай медыкаментозных сродкаў) падаўляецца панкрэатычная сакрэцыя. На працягу першых 2—5 сутак паказаны холад (лёд) на жывот. Хвораму прызначаецца галаданне (сама меней 2—3 дні), што змяншае страўнікавую сакрэцыю і тым самым стварае фізіялагічны спакой для падстраўнікавай залозы. У цяжкіх выпадках — пры амярцвенні тканак залозы — праводзіцца хірургічнае ўмяшанне.

У лячэнні і прафілактыцы запалення падстраўнікавай залозы першараднае значэнне мае захаванне дыеты. Пры абвастрэннях панкрэатыту ўрачы рэкамендуюць дыету з павышаным утрыманнем бялкоў і паніжанай колькасцю тлушчаў і вугляводаў. Прызначаецца дробнае харчаванне, 5—6 разоў на дзень; ежа павінна быць цёплая, прыгатаваная на пары, запечаная, зрэдку — тушаная (выключаецца ўжыванне вельмі гарачых і вельмі халодных страў). Забараняюцца алкаголь, смажаная, тлустая, вострая ежа, кансервы, субпрадукты (мазгі, пячонка), газаваныя напоі, кіслыя гатункі яблыкаў і кіслыя фруктовыя сокі, квашаная капуста, цытрусавыя. Выключаюцца свежыя чорны хлеб і выпечка, проса, марожанае, наварыстыя булёны, вэнджаныя, марынаваныя прадукты, спецыі, цыбуля, часнок, радыска, шчаўе, белакачанная капуста, хрэн, воцат, гарчыца, грыбы, бабовыя; абмяжоўваецца колькасць яечных жаўткоў, тлустага тварагу і сыру. Падстраўнікавая залоза не любіць шакалад, чорную каву, какаву. Мінеральную ваду лепш ужываць без газу, малако і малочныя прадукты — з мінімальным працэнтам тлустасці, фруктовыя сокі пажадана разбаўляць гатаванай вадой.

Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

Пры хранічным панкрэатыце, у якасці профілактыкі абвастрэнняў, рэкамендуюцца наступныя лекавыя зборы (прымаць пасля кансультацыі з урачом):

* плады кропу, лісце мяты — па 3 часткі; плады глогу, кветкі сухацвету — па 2 часткі; кветкі рамонку — 1 частка. 5 г сумесі заліць шклянкай кіпеню, грэць на вадзяной лазні 30 хвілін, настойваць гадзіну, адціснуць, прымаць па 50 мл 3 разы на дзень праз гадзіну пасля яды (гэты збор нельга піць гіпатонікам, бо глог і мята зніжаюць артэрыяльны ціск);

* 3 ст. лыжкі травы чарады, травы дзівасілу, лісця падбелу ў прапорцыі 2:1:1 заліць 0,5 л вады, кіпяціць 4 хвіліны, настойваць у закрытай пасудзіне 2 гадзіны, прымаць маленькімі глыткамі ў цёплым выглядзе за 30 хвілін да яды;

* лісце мяты і крапівы — па 2 часткі, кара крушыны — 2 часткі, карані аеру і валяр'яну — па 1 частцы. 5 г сумесі заліць шклянкай кіпеню, грэць на вадзяной лазні 30 хвілін, настойваць 10 хвілін, адцадзіць, піць па 50 мл 2 разы на дзень раніцай і вечарам да яды;

* 1 ст. лыжку здробненых к

УП «ГІПРАСЕЛЬБУД»: У АВАНГАРДЗЕ БУДАЎНІЦТВА НА ВЁСЦЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Цяпер УП «Гіпрасельбуд» актыўна ўдзельнічае ў рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця беларускай вёскі на 2005—2010 гады, за што ўзнагароджаны Ганаровай граматай Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва рэспублікі. У ім апошнім часам вялікая ўвага надаецца распрацоўцы тыпавых праектаў жылых і грамадскіх будынкаў для будаўніцтва ў сельскай мясцовасці. Прымяненне тыпавых праектаў з'яўляецца актуальным для масавага будаўніцтва; тым самым значна зніжаецца яго кошт, што, як вядома, пастаўлена сёння найважнейшай задачай.

У інстытуце вырасла нямала заслужаных будаўнікоў і архітэктараў. Гэта народны архітэктар БССР Г.В. Заборскі, заслужаныя архітэктары рэспублікі В.Э. Сакалоўскі, Г.А. Беганская, А.П. Калініньш, П.С. Рудзік, В.Н. Емяльянаў, Н.М. Нядзелька, заслужаны будаўнік рэспублікі В.П. Чарнышоў.

У 2007 годзе на прадпрыемстве распрацавана і сертыфікавана сістэма менеджменту якасці ў адпаведнасці з патрабаваннямі СТБ ИСО 9001-2001.

■ ■ ■

Як ужо бачна з гістарычнай даведкі, «Гіпрасельбуд» мае багатую гісторыю, звязаную з будаўніцтвам на вёсцы, з яе пасляваенным аднаўленнем. Цяпер шэрагі былога шматлікага інстытута, які меў у сваім складзе больш як 700 спецыялістаў, істотна парадзелі. Тым не менш ён і цяпер застаецца ў рэспубліцы базавай арганізацыяй у галіне праектавання будаўніцтва на вёсцы.

Над чым канкрэтна працуюць яго спецыялісты, якія задачы вырашаюць? Пра гэта **расказалі кіраўнікі «Гіпрасельбуда» Вячаслаў Мінейка і Леанід ДАЦЭНКА.**

Яны напачатку назвалі найбольш адметныя аб'екты, якія па праектах «Гіпрасельбуда» будаўнікі ўзвялі або рэканструявалі іх толькі апошнім часам. Што гэта за аб'екты? У першую чаргу ў «Гіпрасельбудзе» называюць пагранічны пераход «Каменны Лог» у Ашмянскім раёне. Гэта пасля Брэста найбольш буйны з пераходаў. Ён прыгожа аформлены, зручны; вельмі добрыя водгукі аб ім з боку суседзяў-літоўцаў. У «Гіпрасельбудзе» называюць таксама стадыён «Будаўнік» у Салігорску, рэканструяваны ў мінулым годзе па яго ж праекце. Гэты стадыён цяпер з крытымі трыбунамі. Ён поўнасцю адпавядае ўсім патрабаванням УЕФА. На рахунку добрых дасягненняў калектыву — грамадска-гандлёвы цэнтр у Бярэзінскім біясферным запаведніку, прыгожы дом культуры ў вёсцы Тышкавічы Іванаўскага раёна, малочнатаварная ферма ў саўгасе «Ждановічы», спраектаваная з улікам усіх сучасных пажаданняў жывёлаводаў, з энергазберагальнай тэхналогіяй, і іншыя аб'екты. «Гіпрасельбуд», падкрэсліваюць тут, заўсёды нямала праектаваў і цяпер шмат праектуе жылых дамоў. Пры гэтым яго праекціроўшчыкамі створана цэлая серыя шматкватэрных дамоў і дамоў сядзібнага тыпу — на любы густ і любыя магчымасці. Гэтыя праекты пераважна прапаноўваюцца для рэалізацыі ў сельскай мясцовасці, у раённых цэнтрах. Апошнім часам шмат праектаў рыхтуецца для будаўніцтва жылля-будаўнічымі кааператывамі. У прыватнасці выкананы праекты дамоў для работнікаў аховы здароўя ў Аксакаўшчыне, дзе размешчана рэспубліканская бальніца; у інстытуце прыступаюць да праектавання дамоў ЖБК у Чэрвені (для работнікаў асветы) і ў іншых населеных пунктах. Зразумела ўжо, што «Гіпрасельбуд» не мог быць не задзейнічаны ў выкананні дзяржаўных праграм па адраджэнні вёскі, а таксама развіцця малых і сярэдніх гарадоў. А яшчэ, як тут удакладняюць, «Гіпрасельбуд» прымае ўдзел у рэалізацыі праграмы па дапамозе шматдзетным сем'ям. У адпаведнасці з апошняй праграмай яго спецыялістамі спраектаваны дамы са шматпакаёвымі кватэрамі, якія цяпер уводзяцца ў Дзяржынску і Капылі. Многія адзначаюць грунтоўнасць гэтых праектаў, у якіх усё прадумана, каб шматдзетныя сем'і жылі ў сваіх вялікіх кватэрах з усімі зручнасцямі. Па праектах «Гіпрасельбуда» цяпер уводзяцца дамы сядзібнага тыпу ў СВК «Вішнёўка» (пад Мінскам), дзе ствараецца свайго роду аграгарадок, СВК «Чарнаград», СВК «Раванічы» і ў іншых месцах.

Галоўны інжынер праекта Іосіф МЕЛЕХ (справа) з прарабам Смалявіцкай ПМК-228 Аляксандрам ІЛЫНСКІМ і дырэктарам ПМК-228 Яўгенам СОКАЛАМ у Азярыцкай Слабадзе Смалявіцкага раёна, дзе па праекту інстытута ўзводзіцца шматкватэрны дом.

Пра патэнцыяльныя магчымасці «Гіпрасельбуда» няблага сведчыць наступны факт: менавіта яго спецыялісты распрацавалі некалі генеральныя планы такіх добра вядомых у рэспубліцы пасёлкаў, як Сноў, Верцялішкі і іншых. Раней у «Гіпрасельбудзе» працаваў вялікі аддзел, які займаўся менавіта стварэннем генеральных планаў населеных пунктаў. Але ўжо даўно гэтага аддзела няма, ад яго засталася невялікая група. А тым часам, як зазначаюць у «Гіпрасельбудзе», толькі работа па карэкціроўцы схем і праектаў раённых планіровак большасці сельскіх населеных пунктаў не праводзіцца ўжо на працягу 45 гадоў. Зразумела, такую работу трэба выконваць, і ў «Гіпрасельбудзе» гатовы працягваць яе. Пры гэтым яго спецыялісты і цяпер могуць спраектаваць пасёлак у чыстым полі. З амбулаторый, бальніцай, домам культуры, кацельняй, ачышчальнымі збудаваннямі, водазаборам, з вытворчымі і жывёлагадоўчымі аб'ектамі. І ўсё ў гэтым пасёлку будзе размешчана кампактна і рацыянальна, з захаваннем усіх санітарных нормаў.

Аднак пытанне да кіраўнікоў «Гіпрасельбуда»:

— Калі развіць вашу думку наконт генеральных планаў, варта зазначыць: перш чым праектаваць у тым ці іншым пасёлку нейкія асобныя збудаванні, няйначай лагічна напачатку мець генеральны план яго развіцця. І гэта актуальна менавіта цяпер, у сувязі з узвядзеннем тых жа аграгарадкоў. Але такі вось прыклад: у аграгарадку Слабада, пад Смалявічамі, жылыя дамы — асобна, а стадыён — за некалькі кіламетраў ад іх. Ці можна тут гаварыць пра нейкую зручнасць?

На гэтыя і іншыя пытанні **адказвае намеснік кіраўніка інстытута Рыгор ФІНТУШАЛ:**

— Якраз мы і праектавалі там свае асобныя аб'екты. Там у гаспадарцы меркавалі наладзіць агратурызм; адпаведна на нашых праектах былі ўзведзены спарткомплекс, сталовая, а таксама асобныя дамы. І ўсе аб'екты — добрыя, арыгінальныя. Але, сапраўды, усё гэта атрымалася неяк раскідана. І ўсё гэта з-за таго, што ў гаспадарцы загадзя не паклапаціліся пра той жа генеральны план развіцця, будаваліся хутчэй па прынцыпу, дзе было свабоднае месца. А ўсё, што датычыць распрацоўкі генеральных планаў, гэта, яшчэ раз падкрэслю, справа саміх гаспадарак, саміх заказчыкаў. Безумоўна, са стварэннем такіх генеральных планаў усё і трэба пачынаць. Нават у невялікіх населеных пунктах. Іншая справа — хто будзе фінансаваць стварэнне такіх планаў, дзе браць сродкі? Якія сродкі маюцца ў сельскіх Саветаў, напэўна, вядома. А кіраўнікі гаспадарак у перспектыўным планаванні, як правіла, не зацікаўлены, у іх хапае іншых клопатаў. У дадзеным выпадку патрэбна бюджэтнае фінансаванне. Што да нашага прадпрыемства, мы зноў маглі б ускласці на сябе функцыі па распрацоўцы генеральных планаў. Тым больш што адпаведны вопыт ёсць.

— У краіне ставіцца пытанне па зніжэнні кошту будаўніцтва, і гэта, вядома ж, датычыцца і вашай арганізацыі, якая ў сваіх праектах, па сутнасці, ужо адразу закладвае пэўны кошт дома або іншага збудавання. Як вы працуеце на выкананне гэтай задачы? Дарэчы, нярэдка наракаюць на кошт праектных работ...

— Адразу ж адхілю гэта абвінавачанне. Кошт праектных работ ад усяго кошту будаўніцтва звычайна складае 3—4 працэнты (ва ўсякім разе, так складваецца ў нас). Для параўнання: у Расійскай Федэрацыі — 10—15 працэнтаў, а ў краінах Заходняй Еўропы — да 30. Іншая справа, можна вырваць з гэтага будаўніцтва асобна, скажам, інжынерныя сеткі, а там набярэца і цэлых 30 працэнтаў (праектаванне сетак — адносна працаёмкая справа). Але ж трэба ўсё браць і лічыць у комплексе.

У сувязі з гэтым таксама адзначу: работу праекціроўшчыкаў нярэдка проста недаацэньваюць. Напрыклад, узвялі будаўнікі нейкі добра заўважны, выдатны аб'ект — хто герої? Вядома ж, будаўнікі. Не хачу іх крыўдзіць, але ж дзе праекціроўшчыкі, тыя, хто напачатку ўсё ў гэтым аб'екце разлічыў да самых дробязяў, на чыіх разліках грунтуецца трываласць і надзейнасць усёй канструкцыі, хто першапачаткова заклаў і яе арыгінальнасць, прыгажосць? Праекціроўшчыкаў як быццам і не было. Увогуле, чаго каштуе спраектаваць той жа аб'ект? Гэта і азначае, што ў першую чаргу трэба выканаць мноства матэматычных разлікаў. Само праектаванне — гэта і ёсць дакладная матэматычная навука. Адным словам, калі праект добры, арыгінальны, то няхай узвядуць па ім аб'ект нават не зусім добрыя будаўнікі, гэты аб'ект захавае ўсю сваю архітэктурную выразнасць і арыгінальнасць. А вось дрэнны, убогі праект не выцягнуць і самыя выдатныя будаўнікі. Уся думка, ідэя аб'екта закладваюцца менавіта праекціроўшчыкам.

Ён жа, праекціроўшчык, калі ён усё добра абдумае, безумоўна, можа ўжо адразу, на паперы, заклаці і адносную таннасць аб'екта. «Гіпрасельбуд» у дадзеным выпадку робіць ухіл, па магчымасці, на выкарыстанне больш танных будаўнічых матэрыялаў. Нямала праектуем збудаванняў з газасілікатных блокаў. Прычым, варта нагадаць, гэтыя блокі добра захоўваюць цяпло, значыць у заказчыка аб'екта адначасова вырашаюцца і пытанні энергазберажэння...

Невялікае аўтарскае адступленне, якое таксама датычыць закранутага пытання. Як расказаў ужо іншы спецыяліст «Гіпрасельбуда», апошнім часам яго работнікі пры праектаванні закладвалі ў якасці дахавага матэрыялу чарапіцу. І прыгожа (асабліва калі выкарыстоўваць чарапіцу рознай афарбоўкі), і экалагічна. У параўнанні са звычайным шыферам. Але шыфер недзе на 15 працэнтаў таннейшы. І вось «Гіпрасельбуду» ўжо настойліва раяць выкарыстоўваць у сваіх праектах шыфер. Хоць, варта нагадаць, на Захадзе шыфер даўно проста забаронены. Як неэкалагічны матэрыял. Словам, як быццам трэба рабіць будаўніцтва таннейшым. Але ж, як правільна заўважаюць у «Гіпрасельбудзе», да ўсяго трэба падыходзіць з галавой.

■ ■ ■

Асноўныя заказчыкі «Гіпрасельбуда» — прадпрыемствы агрmaпрамысловага комплексу, упраўленні капітальнага будаўніцтва райвыканкамаў і іншыя. Звяртаюцца да яго і прадстаўнікі прыватнага бізнэсу. Напрыклад, не так даўно адна з мінскіх фірмаў папрасіла спраектаваць для яе базу адпачынку. Але, як падкрэсліваюць у «Гіпрасельбудзе», у ім аддаюць перавагу заказам дзяржаўных арганізацый. Тут пры гэтым надаюць вялікую ўвагу збору і аналізу інфармацыі аб усіх патрабаваннях і пажаданнях сваіх заказчыкаў (адпаведны пункт запісаны ў «Палітыцы ў галіне якасці»), што дазваляе выконваць праекты практычна без заўваг. Наладжана экспертыза праектаў, яна — 100-працэнтная.

Ужо адзначалася: « «Гіпрасельбуд» удзельнічае ў выкананні важных дзяржаўных праграм. Варта дапоўніць: акрамя адзначаных праграм, «Гіпрасельбуд» задзейнічаны таксама ў рэспубліканскай праграме «Чыстая вада». У прыватнасці, яго спецыялістамі праектуюцца падземныя свідравіны для забору вады з другога падземнага гарызонту, на глыбіню 80—90 метраў, у Смалявіцкім, Чэрвеньскім, Пухавіцкім і іншых раёнах.

Калектыў паспяхова скончыў мінулы год, у якім выканаў праектных работ амаль на 40 працэнтаў больш, чым у папярэднім годзе. Паспяхова выкананы ўсе даведзеныя прадпрыемству мэтавыя паказчыкі.

«Мы маем неблагі партфель заказаў, добра наладжаныя адносіны з заказчыкамі, нашы праекты няблага запатрабаваныя. Гэта дазваляе калектыву жыць і развівацца выключна за свае сродкі», — падкрэсліваюць тут.

І на заключэнне: у адным з кабінетаў УП «Гіпрасельбуд» — Рыгора Фінтушала — на бачным месцы змешчана цікавае і павучальнае настаўленне Пятра I: «Все прожекты зело исправны быть должны, дабы казну зряшно не разорять и Отечеству ущерба не чинить. Кто прожекты станет абы как ляпать, того чина лишу и кнутом драть велю».

— Гэта свайго роду дапаўненне да вашай «Палітыкі ў галіне якасці»? — такое пытанне было зададзена гаспадару кабінета.

— Гэта добры напамінак пра тое, што да справы заўсёды трэба адносіцца сур'ёзна. І тым больш да такой адказнай, як наша...

■ ■ ■

З размовы з Нонай НЯДЗЕЛЬКА, заслужаным архітэктарам.

(Больш за 40 гадоў інстытуцкага стажу ў галоўнага архітэктара праекта, заслужанага архітэктара рэспублікі Ноны Нядзелька. Як яна сама зазначае, па сутнасці, усё сваё працоўнае жыццё аддала яна адраджэнню вёскі, працягвае служыць гэтай справе і цяпер).

— Чым займаецца архітэктар пры вядзенні будаўніцтва? — гаворыць Нона Міхайлаўна. — Мы ствараем, робім кампазіцыю тых ці іншых аб'ектаў. Наша справа — наданне ім пэўнай архітэктурнай выразнасці. Уся мая работа ў інстытуце звязана з будаўніцтвам на вёсцы, і ў першую чаргу — жылля. Найбольш прыемны вынік гэтай работы — пасёлак Малеч у Бярозаўскім раёне. 10 гадоў аддала праектаванню і будаўніцтву гэтага пасёлка. Эксперыментальнага на той час. Атрымалася нядрэнна. У пасёлак потым наладжваліся экскурсіі. Там праводзіліся семінары. За гэту працу атрымала прэмію Савета Міністраў.

— Увогуле, калі яшчэ толькі пачынала працаваць у інстытуце, ужо тады шмат ішло спрэчак наконт таго, якім павінен быць вясковы дом. Жылля трэба было ўзводзіць нямала, і ў выніку вырашылі спыніцца на больш хуткім і больш танным варыянце — будаўніцтве дамоў на некалькі кватэр. Жыццё, аднак, унесла свае карэктывы, і цяпер, як вядома, перавага аддаецца будаўніцтву індывідуальных дамоў сядзібнага тыпу, узвядзенню з іх цэлых аграгарадкоў. Наша прадпрыемства распрацавала цэлую серыю такіх дамоў, заказчыку ёсць што выбіраць. Гэта дамы, у якіх прадугледжаны ўсе зручнасці; тут жа гаспадарчыя прыбудовы, водаправад. Стала больш багатым архітэктурнае афармленне гэтых дамоў, а таксама вуліц, пасёлкаў. Мы ўжо маем цэлыя прыгожыя вясковыя кварталы ў аграгарадках. І работа інстытута ў гэтым напрамку працягваецца.

Іван БАРАНОЎСКІ.
Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.
УНП 100356503.

Узводзіцца аграгарадок у СВК «Вішнёўка». На здымку намеснік кіраўніка «Гіпрасельбуда» Рыгор ФІНТУШАЛ.

З усімі зручнасцямі пабудаваны дамы для працаўнікоў СВК «Першамайскі і К» па праектах інстытута.

Прыгожы дом культуры ў Тышкавічах Іванаўскага раёна — адна з апошніх праектных работ «Гіпрасельбуда».

ДОМ, УБАЧАНЫ Ў СНЕ

КОЛАЙ раскрытых душ і дзвярэй

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сям'я Рукштаў будавалася ў вёсцы Прылессе чатыры гады, улезлі ў даўгі, цяжка было: трое дзяцей, але выручала тое, што многае Сяргей рабіў сваімі рукамі, і сілы з'яўляліся неяк самі сабой. Гэты камень іх натхняў, яны ведалі, што дом будзе незвычайны, на ніводны не падобны, доммара. Напэўна, цудоўна сваімі рукамі сон ператвараць у яву. З гэтага бруку ў Рукштаў сапраўды пачаўся нейкі пад'ём.

Яны з самага пачатку ведалі, што будуць прымаць турыстаў. Таму адразу прадугледзелі банкетную залу на 50 чалавек, камін, танцавальную пляцоўку, чатыры спальні, два санвузлы, кухню. Ідэі нараджаліся ў галаве адна за другой. Сяргей перавёз на сядзібу бацькаву хату з Чэрвеньскага раёна і зрабіў з яе лазню на 10 чалавек: з залай адпачынку, камінам, парыльняй, басейнам, душам... У двары абсталяваў месца для барбекю, мангал, дзе можна павэндзіць рыбу.

Трактарыст па спецыяльнасці, Сяргей, перш за ўсё, — незвычайны чалавек. Як спачатку ён згубіў пакой з-за бруку, так потым гаспадарскім вокам зірнуў на кіноты ў Прылессі кар'ер і ўбачыў... цудоўную лыжную трасу. Расчысціў, купіў лыжы і цюбінгі, але ў другі свой сезон зімы так і не дачакаўся. Збіраецца цяпер купіць квадрацыклы.

— Летам ёсць чым людзям заняцца: тут лес, два цудоўныя возеры, поле, спартыўны комплекс, але я хачу прапанаваць актыўны адпачынак у любы сезон і любое надвор'е, — кажа Сяргей.

Ён адкрыўся ў студзені мінулага года. Летась заключыў 90 дагавораў — у асноўным гэта карпаратыўны адпачынак, сямейныя святы і вяселлі. Любы гаспадар сядзібы, нават калі спецыялізуецца на «застольным» прыёме гасцей (гэта дазваляе найбольш хутка вярнуць грошы, але мае «мінусы», з якімі не кожны змірыцца), перш за ўсё зацікаўлены, каб людзі не «перабралі». Актыўны адпачынак, любая альтэрнатыва сядзенню за сталом працуюць на гэта. Для таго і

Першая памочніца на сядзібе Аксана ЦАРАН.

Інтэр'еры сядзібы аздоблены арыгінальнымі этнакампазіцыямі.

яны цяпер мараць пабудаваць яшчэ адну сядзібу на іншым участку. Тут, праўда, ёсць заказвыка. Па закону, калі гаспадар мае больш за пяць гасцявых пакояў, то яго справа пераходзіць у статус гасцінічнага бізнэсу. Сёння Сяргей укладаецца ў рамкі вясковага турызму. І не сумняваецца, што справу гэту падхопяць дзеці. Дачка Вікторыя, якой зараз 16 гадоў, праяўляе жывы інтарэс да таго, чым займаюцца бацькі. Сяргей да яе паўналецця мог бы завяршыць будаўніцтва, тым больш і сельсавет абавязвае, але крэдыт на гэта ён атрымаць не можа, бо перавысіць ліміт па спальных пакоях. Зараз Сяргей аддаў пакет дакументаў на крэдытаванне бягучага рамонту гасцявога дома. Калі б удалося атрымаць сродкі на гэта (святкаванні ў кожныя выхадныя вяселляў альбо юбілеяў патрабуюць пастаяннага ўкладання грошай у бягучы рамонт), тады даход можна было б пусціць на новы дом. На жаль, наша заканадаўства і самі ўмовы жыцця не настолькі дасканалыя, каб усе мары і задумы можна было ажыццяўляць тады, калі маеш на гэта сілы, жаданне і магчымасці. Тым не менш, развіццё вясковага турызму паказвае, што нашы людзі здольныя пераадольваць любыя цяжкасці, яны ў любых абставінах знаходзяць і ствараюць вакол сябе прыгажосць, а потым дораць яе іншым. Сядзіба «У Прылессі» забраніравана ўжо на першыя выхадныя жніўня...

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У лазні ўсё па адпаведнай традыцыі.

танцзала, і басейн, і спартыўныя пляцоўкі, і лыжныя трасы...

Заняўшыся сельскім турызмам, Сяргей пакінуў сваю асноўную работу. Даход з сядзібы дазваляе карміць усю немалую сям'ю Рукштаў і крыху развівацца. За год работы Сяргей змог вярнуць даўгі за дом і купіць машыну. Яго сядзіба — не з ліку танных, як, дарэчы, амаль усе пад Мінскам. На суткі гаспадары аддаюць «каменны» дом за 150 долараў. Калі сюды прыехаць без начоўкі ў колькасці больш за 20 чалавек — выйдзе па 10 умоўных адзінак з чалавека. Больш даступны варыянт з лазняй, дзе таксама ёсць адзін спальны пакой. Яе гаспадары здаюць за 100 долараў у суткі.

Тым не менш крэдыт, лічаць Рукшты, ім патрэбны. Па-першае,

ВЯСКОВЫ ТУРЫЗМ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Рэгіянальныя ўлады зацікаўленыя ў развіцці сельскага турызму як аднаго з напрамкаў рэалізацыі Нацыянальнай праграмы адраджэння вёскі. Грамадскае аб'яднанне ў сваю чаргу, ведае, якія павіны быць патрабаванні да аграсядзібы, ім таксама распрацаваны стандарты якасці. Сёння сядзібы, падобна таму, як гасцініцы маюць «зоркі», адрозніваюцца па колькасці «пеўнікаў» — ад аднаго да чатырох, у залежнасці ад узроўню камфортнасці.

З кожнай вобласцю мы заключылі трохбаковае пагадненне паміж банкам, выканкамам і грамадскім аб'яднаннем. У рамках пагадненняў у кожным раённым цэнтры створаны рабочыя групы, у якія ўваходзяць прадстаўнікі названых трох бакоў — удзельнікаў праграмы. Яны дапамагаюць складаць праекты, разглядаюць іх. Наш лакальны акт прадугледжвае поўны пакет дакументаў. Каб гаспадарам сядзіб было лёгка зразумець, якія патрабаванні прад'яўляе банк, мы распрацавалі памятку для фермерскіх гаспадарак і фізічных асобаў, дзе паэтапна распісалі, хто што павінен рабіць, дзе можна атрымаць інфармацыю, якія ўмовы крэдыту, тэрміны. Мы прапанавалі льготную працэнтную стаўку — 5 працэнтаў. Для фермераў прызначылі тэрмін у 5 гадоў, бо ў іх больш магчымасцяў, для фізічных асобаў — 7 гадоў. Максімальная сума крэдыту — да 2000 базавых велічынь (на сёння 70 мільёнаў рублёў) у безнаяўным парадку і 750 базавых велічынь наяўнымі. Для сельскай мясцовасці гэта даволі буйныя грошы і, думаю, дастатковыя, каб стаць на ногі. Натуральна, што імгненна пачынаць іх вяртаць немагчыма. Таму мы на год далі адтэрміноўку па выплаце асноўнай запазычанасці.

— Але ж банку, каб выступіць ініцыятарам і рашыцца крэдытаваць зусім новую і для нашай краіны справу, трэба ў яе паверыць?

— Напэўна, першым паверыў старшыня праўлення банка Сяргей Румас. Справа ў тым, што мы шмат укладаем у сельскую гаспадарку і разумеем, што там неабходна ствараць інфраструктуру. Не толькі для работы, але і для адпачынку. Каб людзі не вывозілі грошы ў іншыя краіны, а пакідалі іх у беларускіх вёсках. Мы і ў Праграме напісалі, што асноўныя мэты яе: занятасць насельніцтва, прыток грашовых сродкаў, павышэнне ўзроўню дабрабыту ў вёсцы...

— Іншымі словамі банк, як агент урада па фінансаванні дзяржаўных праграм у аграпрамысловым комплексе краіны зацікаўлены, каб вёска багацела, у тым ліку дзякуючы развіццю турызму?

— Калі ўжо надаваць увагу сельскай гаспадарцы, то трэба клапаціцца не толькі пра вытворчасць, але і пра людзей, якія там жывуць. У тым ліку пра пенсіянераў, якім узрост ужо не дазваляе працаваць на прадпрыемстве, але жыццёвай энергіі ў іх хапае, каб прыняць гасцей. Таму мы не абмяжоўвалі ў Праграме ўзрост яе магчымых удзельнікаў, але прадугледзелі паручыцельства дзяцей і ўнукаў, каб была зацікаўленасць перадаваць справу ў спадчыну.

Перш чым распрацоўваць Праграму, мы мелі магчымасць убачыць, як агратурызм развіваецца ў Італіі. Там ёсць буйныя сядзібныя комплексы, разлічаныя на сотні чалавек, ёсць і маленькія...

— Прадстаўнікі банка паглядзелі на вясковы турызм у Італіі і «загарэліся»?

— «Загарэліся» мы раней. Італьянскі вопыт натхніў і надаў упэўненасці. У італьянцаў звычайна сельскі турызм — гэта сямейны бізнэс, які перадаецца з пакалення ў пакаленне. Для іх выехаць сям'ёй альбо кампаніяй у вёску, бліжэй да прыроды, на выхадныя альбо лета — святое.

— А ў беларускіх сядзібах асабіста вы былі?

— Была ў некалькіх, на жаль, пакуль не як турыст. І некаторыя з сядзібаў гэтак спадабаліся, што мару там адпачыць з сям'ёй. На Гродзеншчыне мяне вельмі ўразіў узровень сядзібы «Над Нёманам». Не думала, што ў Беларусі можна сустрэць такое. Там усё, ад дробязі да цэласнага ўспрыняцця, выклікае захапленне і працуе на тое, каб госцю было добра: прыгожы белы дом на ўзгорку, побач рака, дарожкі, выкладзеныя буйным каменнем, маляўнічы плот, зробленыя рукамі гаспадара шыкоўныя ложкі, поўны вясковымі прыпасамі склеп у гасцявым доме, дзе ёсць усё: ад вяндліны да настоек — можна прыходзіць і браць. Нават воканы там у агульным пакоі ад падлогі да столі, што стварае незвычайны цудоўны эфект. Самае галоўнае — там вельмі чыста і ўтульна. Адчуваецца, што людзі стваралі ўсё з душой, з любоўю да будучых турыстаў. Сам гаспадар Валерый Салькоўскі прафесійна іграе на гуслях, некалі зарабляў гэтым майстэрствам у Германіі.

Бачыла я і сядзібы, якія мне не вельмі падабаліся. Адчувалася, што галоўны інтарэс там не людзі, а грошы. Ёсць сядзібы, дзе быццам бы ўсё ёсць: рака і гасцявыя домікі асобна ад гаспадарскага, розныя ўпрыгажэнні, грыбы-пянёчкі. Але не хапае, па-першае, цэласнасці ў архітэктурным вырашэнні, усё там неяк паасобку, не стварае настрой. Па-другое, няма душэўнасці, і што асабіста для мяне важна — акуратнасці.

Два тыдні таму да мяне прыехалі знаёмыя, і мы хацелі з імі выехаць на выхадныя з Мінска, але ў Мінскай вобласці не знайшлі ні адной свабоднай сядзібы, а іх там, між тым, на сёння створана больш за чатыры дзесяткі. Аказалася, што браніраваць месцы трэба не меней, чым за два-тры тыдні.

— Пад Мінскам сядзібы адрозніваюцца яшчэ і дарагавізнай.

— Справа нават не ў гэтым. Мы гатовы былі заплаціць, але месцаў не было. Гэта гаворыць пра тое, што ў нас яшчэ пакуль недастатковая колькасць сядзіб, далёкая ад запатрабаванай. Для параўнання: у Польшчы 20 тысяч сядзіб, ва Украіне — 2 тысячы, у Літве, якая амаль утрая меншая за Беларусь — тысяча, у яшчэ меншай Латвіі — 500, а ў нас толькі 150.

— Адна з галоўных мэтаў банка, наколькі я зразумела, выправіць гэту сітуацыю, прапанаваўшы людзям льготныя крэдыты?

— Праграма пачала працаваць ва ўсіх рэгіёнах Беларусі толькі з канца кастрычніка мінулага года, і за няпоўныя чатыры месяцы мы падтрымалі крэдытамі 43 сядзібы на агульную суму каля 2 млрд рублёў. Са снежня разам з грамадскім аб'яднаннем «Адпачынак у вёсцы» праводзім навучанне для тых, хто хоча прымаць турыстаў. Расказваем пра стандарты якасці, пра тое, што цікава іншаземцам, як арганізаваць работу так, каб гэта было прыемна, зручна і для турыста, і для гаспадара. Дапамагаем граматна весці бухгалтэрыю, навучаем тэхніцы бяспекі і даём экалагічныя веды. Некаторыя гаспадары сядзіб памылкова лічаць, што падрыхтаваць дом для турыста — гэта значыць абшыць яго з усіх бакоў пластыкам. Але ў вёску едуць, у першую чаргу, каб на нейкі час уцячы ад пластыку і бетону. Гараджане едуць па водар дрэва, сена, воску, сырадою, па смак яешні са скваркамі, па цеплыню сцен з бярвенняў. Безумоўна, пры гэтым павінна быць усё чыста, камфортна і бяспечна. Іншаземцы да нас едуць, каб убачыць некранутыя лясы і балоты, старыя рэчы, якія памятаюць рукі нашых бабуль і служылі не аднаму пакаленню беларусаў...

— Якія ў банка планы на бліжэйшы год адносна развіцця агратурызму?

— Мы плануем забяспечыць стварэнне не меней за 100 новых сядзіб. Праграма ўдзелу ААТ «Белагрmaпрамбанк» у развіцці аграэкатурызму ёсць у кожным райвыканкаме, у кожным сельсавеце, інфармацыя ёсць на сайце банка.

— Трэба, напэўна, каб людзі паверылі ў гэта...

— Трэба, каб людзі гэта любілі. Калі займацца агратурызмам без любові, без сістэмнага падыходу, нічога не атрымаецца. Безумоўна, сустракаюцца і такія, хто хоча з дапамогай праграмы толькі рэалізаваць свой камерцыйны інтарэс: купіць аўтамабіль, пабудаваць лазню... Задача рабочай групы — адсячы падобнае. Многае бачна ўжо на этапе знаёмства з праектам. Да таго ж, мы кантралюем мэтавае выкарыстанне сродкаў. Калі крэдыт узяты для развіцця сельскай сядзібы, значыць грошы павінны быць скарыстаны на тое, каб сядзіба была падрыхтавана для прыёму турыстаў.

У нашых бліжэйшых планах — зрабіць навучанне гаспадароў сядзіб трохузроўневым і пастаянным: і для тых, хто пачаў, і для тых, хто ўжо працуе, спецыяльныя курсы па пэўных напрамках, напрыклад, беларуская кухня, экалагічны турызм, арганізацыя актыўнага адпачынку і г.д. Плануем таксама штогод альбо раз на два гады выдаваць новыя каталогі на рускай і англійскай мовах. Нарэшце, сёлета павінен адбыцца першы конкурс «Сядзіба года», з прапановай удзелу ў якасці інфармацыйнага спонсара ўжо выйшла на нас газета «Звязда».

— Святлана Мікалаеўна, калі банк пачаў праграму рэалізоўваць, ці былі нейкія адкрыцці для вас асабіста і для тых, хто працуе з сельскімі сядзібамі?

— Калі шчыра, не было часу здзіўляцца. Праўда, мы не чакалі, што людзі ў нас ужо даўно і паспяхова займаюцца гэтым, што дасягнуты пэўны ўзровень, што гэта настолькі запатрабавана. Атрымалася так, што наша праграма лягла на падрыхтаваную глебу. І вельмі своечасова.

— З якой мэтай Белагрaпрамбанк праводзіць спецыялізаваную канферэнцыю?

— Каб абазначыць на даволі высокім узроўні важнасць аграэкатурызму. Каб органы ўлады на больш сістэмнай аснове ўдзельнічалі ў яго развіцці. Гэта асноўны від турызму, якім мы можам зацікавіць замежных гасцей. Ёсць у нас яшчэ нацыянальныя паркі, паляўнічыя ўгоддзі, але сёння многія іншаземцы прагнуць адасобленасці, цішыні, спакою, душэўнай цеплыні, якую можа даць толькі той, хто прымае госця ў сваім доме.

У нас шмат раёнаў, дзе неўрадлівая глеба, няма буйных прадпрыемстваў, квітнеючых гаспадарак, але ёсць здзіўляючая, багатая прырода. Гэта патэнцыйна турыстычныя раёны. На Віцебшчыне гэта ўжо зразумелі, там на сельскі турызм робяць стаўку і не памыляюцца. Важна, каб мясцовыя ўлады падключаліся, клапаціліся пра дарогі, указальнікі, так накіроўвалі бюджэтныя сродкі, каб усё працавала на турыста: і прыдарожны сэрвіс, і пажарныя, і камунальныя службы. Вясковы турызм здольны вярнуць жыццё ў занядбаныя вёскі, жыццё мясцовых жыхароў зрабіць больш заможным і мэтанакіраваным.

Размаўляла Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

На радасць вернікам па Палессі падарожнічае абраз Мікалая Цудатворцы

А калі дакладней, дык па тураўскай епархіі. Старажытнае аблічча святіцеля з частачкай мошчаў божага ўгодніка знаходзіцца ў Мазыры, у храме якога збіраецца шмат народу.

Абраз тут будзе знаходзіцца да 24 лютага, затым памаліцца перад ім змогуць вернікі Калінкавіцкага, Петрыкаўскага, Жыткавіцкага, Лельчыцкага, Нараўлянскага, Брагінскага і Хойніцкага раёнаў.

У храмы епархіі, дзе да 10 сакавіка будзе знаходзіцца абраз, можна прыходзіць з 8 гадзін раніцы да 8 вечара, а богаслужэнні каля святыні праводзіць праасвяшчэнны Стэфан, епіскап Тураўскі і Мазырскі. Абраз Мікалая Цудатворцы з частачкай мошчаў святога богаўгодніка ў нашу краіну прынесены ўпершыню.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Па падарункі – на «Каменную казку»

Навукова-асветніцкая мінералагічная выстава-кірмаш «Каменная казка» пройдзе па традыцыі напярэдадні жаночага свята ў Беларускім дзяржаўным універсітэце.

Цудоўнай палове чалавецтва будзе адрасавана не толькі шматгранная экспазіцыя ювелірных упрыгажэнняў, каштоўных і паўкаштоўных камянёў, вырабаў з бісеру, скуры, какосавага арэха, створаных членамі Беларускага саюза майстроў народнай творчасці, але і аўтарскія калекцыі. Свае фантазіі ў мастацтве ікебаны прадэманструе вядомы беларускі геолаг Вера Грэсь. У «Таямнічы свет кварца» запросіць выкладчык кафедры дынамічнай геалогіі БДУ Сяргей Юдаеў, а «Эксклюзіўныя мінералы свету» і калекцыю сінтэзаваных крышталяў ізумрудаў, рубінаў прадставіць наведвальнікам выставы Аб'яднаны інстытут фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў НАН Беларусі.

Акрамя таго ў Музеі землязнаўства на геаграфічным факультэце БДУ можна будзе ўбачыць тэматычную экспазіцыю «Старонкі мінулага ў бурштыне», у якую ўвайшлі асабістыя калекцыі народнага майстра Беларусі Аляксандра Забалоцкага і прафесара Альберта Багдасарава.

Запланаваная таксама і сустрэча з двойчы лаўрэатам тэлевізійнага конкурсу «Сам себе рэжысёр», кінааматарам і даследчыкам прыроды з Талачына Дзмітрыем Іўчанкам. Ён пазнаёміць наведвальнікаў выставы са сваімі відэакліпамі, відэафільмам «Каменная казка», а таксама з фотаработамі.

Выстава «Каменная казка» адкрыецца ў галоўным корпусе БДУ (праспект Незалежнасці, 4) 20 лютага і будзе працаваць да 24 лютага з 11 да 20 гадзін.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ПРЫЯРЫТЭТЫ ДЗМІТРЫЯ КАРЗЮКА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Дзмітрый Міхайлавіч, ці вызначылі вы ўжо прыярытэтныя накірункі дзейнасці сталічнай Дзяржаўтаінспекцыі?

— Хто б ні быў на пасадзе кіраўніка ДАІ, я думаю, прыярытэты ў Дзяржаўтаінспекцыі былі і застануцца нязменнымі: жыццё і здароўе людзей. Мы робім і будзем рабіць усё магчымае, каб на мінскіх вуліцах і дарогах гінула як мага менш пешаходаў, кіроўцаў, пасажыраў. Больш важнай задачы для кіраўнікоў і шараговых супрацоўнікаў ДАІ няма. Менавіта дарожна-транспартны траўматызм з'яўляецца адным з галоўных фактараў смяротнасці сярод дзяцей і моладзі ва ўзросце да 25 гадоў. Больш за 40 працэнтаў выпадкаў гібелі людзей у выніку ДТЗ прыпадае на памянёную катэгорыю ўдзельнікаў дарожнага руху. Прыкладна 70 працэнтаў загінулых складаюць мужчыны.

— Праблем на сталічных вуліцах сёння даволі шмат. Гэта і заторы, і недахоп парковачных месцаў, і зусім неідэальная якасць дарожнага пакрыцця. А якія з іх аказваюць найбольш негатыўны ўплыў на бяспеку дарожнага руху ў Мінску?

— Я не абмяжоўваўся б толькі пералічанымі вышэй праблемамі. Насамрэч, на аварыйнасць аказваюць уплыў значна больш фактараў. Умоўна іх можна падзяліць на дзве асноўныя часткі. Прычым, на першае месца я паставіў бы «чалавечы фактар». На сёння самае распаўсюджанае ДТЗ у сталіцы — гэта наезд на пешаходаў. Толькі за мінулы месяц пад коламі транспартных сродкаў загінулі 5 пешаходаў і 68 — атрымалі раненні. Віноўнікамі такіх аварый, як правіла, з'яўляюцца самі ж пешыя ўдзельнікі дарожнага руху: пераходзяць вуліцы ў забароненых месцах, не рэагуюць на чырвонае святло святлафора, нечакана выскокваюць з-за транспартных сродкаў проста пад колы аўтамабіляў.

Кіроўцы транспартных сродкаў таксама не вызначаюцца ўзорнай дысцыплінаванасцю. Прыкладна 27 працэнтаў ДТЗ адбываюцца з-за перавышэння вадзіцелямі хуткаснага рэжыму. Больш за 28 працэнтаў кіроўцаў і пасажыраў гінуць у выніку невыканання правілаў карыстання рамянямі бяспекі і моташлемамі. Ізноў жа ўзрост такіх «смяротнікаў» складае ад 19 да 28 гадоў.

Зразумела, што на дарожную бяспеку аказваюць уплыў і арганізацыя руху, і ўмовы надвор'я, і імклівы рост аўтапарка. Калі, напрыклад, у 2006 годзе колькасць аўтамабіляў у сталіцы павялічылася на 30 тысяч, то ў 2007-м — ужо на 45 тысяч, а сёлета прагназуецца «прырост» дзесьці на 60 тысяч аўто.

— Вы не ўзгадалі яшчэ ямаў і выбоінаў, якія таксама ствараюць аварыйныя сітуацыі.

— Для сталіцы гэтая праблема не вельмі вострая. Пераважная большасць мінскіх вуліц добраўпарадкаваная. Летась, напрыклад, дрэнны стан дарожнага пакрыцця быў прычынай толькі пяці ДТЗ.

— А якія вуліцы, плошчы ці дарогі ў Мінску самыя аварыйныя?

— Месцы, дзе пастаянна адбываюцца ДТЗ, ёсць літаральна ў кожным раёне сталіцы. Але самым аварыйным участкам з'яўляецца Мінская кальцавая аўтадарога. Асноўныя віноўнікі здарэнняў на МКАД — пешаходы, якія імкнуцца перайсці дарогу ў забароненых месцах і трапляюць пад колы аўтамабіляў.

— Ці мэтазгодна, на вашу думку, павялічваць на МКАД максімальна дазволеную хуткасць з 90 кіламетраў у гадзіну да 110 км/г?

— Дыскусія на гэтую тэму вядзецца ў сродках масавай інфармацыі ўжо даўно. Мы лічым, што гэта рабіць пакуль нельга, бо можа адбыцца ўсплёск ДТЗ па віне «ліхачоў». У нас жа некаторыя несвядомыя кіроўцы лічаць, што калі дазволена 90 км/г, то можна асабліва не асцерагаючыся імчаць усе 100 км/г. Штрафы за такое перавышэнне адносна невялікія. Таму, калі падняць «хуткасную планку» да 110 км/г, то знойдзецца нямала асобаў, якія пачнуць «выціскаць» са сваіх аўтамабіляў 120 км/г і больш.

— Наколькі, на вашу думку, апраўданая практыка правядзення Дзяржаўтаінспекцыяй розных акцый? Адзін ці два тыдні «даішнікі» канцэнтруюць асноўныя сілы на барацьбе з «ліхачамі», потым пераключаюць увагу на аматараў пабалбатаць за рулём па мабільніку, пасля чаго кідаюць пільныя позіркі на непрышпіленых кіроўцаў і пасажыраў. А які эфект? Пасля заканчэння такіх акцый многія кіроўцы зноў забываюцца прышпіліцца, імчаць стрымгалоў і з тэлефонам не развітваюцца.

— Пэўная доля праўды ў вашых заўвагах ёсць. Але гэта не сведчыць пра марнасць акцый. Тут больш залежыць ад свядомасці кожнага кіроўцы. Да таго ж, хачу падкрэсліць, што і ў дні, калі няма ніякіх акцый, мы не менш уважліва і прынцыпова сочым за выкананнем Правілаў дарожнага руху. У сярэднім штодзень сталічная Дзяржаўтаінспекцыя выяўляе каля тысячы розных парушэнняў ПДР. А галоўная мэта нашых акцый — не пакараць як мага больш парушальнікаў, хоць колькасць такіх асобаў у адпаведныя дні сапраўды павялічваецца, а прыцягнуць увагу да той ці іншай праблемы самі вадзіцелі ў ўсёй грамадскасці. Вось цяпер мы вельмі пільна сочым за асобамі, якія ігнаруюць рамяні бяспекі, а таксама размаўляюць за рулём па мабільным тэлефоне. Штодзень выяўляем у сярэднім каля 200 такіх парушальнікаў. Так, штрафуем па максімуму, але і тлумачым людзям, наколькі небяспечныя іх паводзіны для іх саміх і іншых удзельнікаў дарожнага руху.

Альбо вернемся да ДТЗ з удзелам пешаходаў. Вы, пэўна заўважылі, што ў гадзіны пік ля многіх пешаходных пераходаў дзяжурыць дружыннікі. Лічу, што такія акцыі ў рэшце рэшт дадуць вельмі станоўчы вынік. Бо, напрыклад, нашы ветэраны ўспамінаюць, што калісьці, каб прывучыць мінчан пераходзіць вуліцу толькі на зялёнае святло, супрацоўнікі ДАІ разам з дружыннікамі іншымі прадстаўнікамі грамадскасці рабілі своеасаблівую жывую заслону на шляху самых нецярплівых пешаходаў. З цягам часу жыхары сталіцы і самі прызвычаіліся выконваць Правілы дарожнага руху і нават пры адсутнасці «даішнікаў» і транспартных сродкаў на дарозе цярплівa чакалі, калі з'явіцца зялёнае святло. На жаль, гэтая славутая дысцыпліна-ванасць мінчан знікла. Спадзяюся, што сумеснымі намаганнямі нам удасца яе аднавіць і ўвогуле навесці належны парадак на вуліцах роднага горада.

— А як вы плануеце перавыхоўваць кіроўцаў? Міністр унутраных спраў не так даўно заявіў, што мінскія аўтааматары самыя недысцыплінаваныя ў краіне.

— Часткова праблему выхавання вадзіцеляў я закрануў, распавядаючы пра нашы акцыі. Будзем праводзіць профілактычную працу, тлумачыць кіроўцам, як трэба паводзіць сябе на дарогах. А ў дачыненні да тых, хто не прыслухаецца да нашых слоў і будзе ігнараваць ПДР, давядзецца прымяняць прадугледжаныя законам меры пакарання.

— Існуе меркаванне, што карані недысцыплінаваных паводзінаў кіроўцаў на дарозе трэба шукаць яшчэ ў дзяцінстве. Бо гэтая праблема наўпрост звязана з узроўнем агульнай культуры чалавека. Вы згодны?

— Так, чым ніжэйшы ўзровень культуры кіроўцы, тым больш агрэсіўна ён паводзіць сябе за рулём. Хамства на дарозе праяўляецца больш яскрава, чым у іншых сітуацыях.

— У такім разе, магчыма, варта было б надаваць гэтай праблеме больш увагі хоць бы падчас навучання курсантаў у аўташколах? Наогул, вы задаволены якасцю падрыхтоўкі кіроўцаў?

— Аўташколы знаходзяцца пад юрысдыкцыяй Міністэрства транспарту. Таму ўмешвацца ў навучальны працэс з майго боку было б некарэктна. Магу выказаць толькі сваё меркаванне. Сапраўды, праблеме культуры паводзінаў за рулём трэба надаваць значна больш увагі пры навучанні курсантаў.

Што датычыцца якасці падрыхтоўкі вадзіцеляў, то яна нас не задавальняе. Ахвочых атрымаць правы з кожным годам усё больш. Летась, напрыклад, супрацоўнікамі сталічнага міжраённага рэгістрацыйна-экзаменацыйнага аддзела былі праведзены іспыты 124 тысяч «кандыдатаў у кіроўцы», што амаль на 8 працэнтаў больш, чым у 2006 годзе. Аднак правы атрымалі толькі крыху больш за 29 тысяч чалавек. З першага разу іспыты не здалі амаль 60 працэнтаў курсантаў. Менавіта «маладыя» вадзіцелі часам здзяйсняюць ДТЗ з цяжкімі наступствамі. Напрыклад, летась па віне кіроўцаў са стажам да 1 года адбылося 78 аварый, у якіх 8 чалавек загінулі і 95 — былі паранены. Прычыны дрэннай якасці падрыхтоўкі не толькі ў тым, што многія інструктары не зусім кваліфікавана і сумленна робяць сваю справу. Вы б паглядзелі, на якіх аўтамабілях вучаць курсантаў! З праверaных намі 1244 вучэбных машын амаль палова мелі розныя няспраўнасці, не кажучы ўжо пра іх узрост. Словам, аўташколы патрабуюць тэрміновых пераменаў.

— А ў сталічнай ДАІ чакаюцца якія-небудзь кадравыя змены ці вы будзеце працаваць з камандай свайго папярэдніка?

— У мінскай Дзяржаўтаінспекцыі я — чалавек не новы. У гэтым калектыве я з 1993 года, з многімі пачынаў сваю службу. Так што не бачу неабходнасці карэнным чынам мяняць гэтую каманду, яна мне не чужая.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

...ЗНАЙСЦІ КАРЫСНЫЯ «ВЫКАПНІ», ці Грошы не пахнуць...

Рэпарцёр атрымаў заданне...

...Вярнуўшыся, хацелася залезці, нават не распранаючыся, у пральную машыну. Бо пасля дня, які карэспандэнт правёў на палігоне адходаў «Паўночны», а калі прасцей, у самым сэрцы сметніка, куды кожны дзень з усёй сталіцы вывозяць змесціва ўрнаў і кантэйнераў, нос ужо не адрозніваў ніводнага паху. Але, напэўна, той прысутнічаў, і даволі моцны, таму што навакольныя стараліся абыходзіць мяне бокам, як апошняга бамжа. Дарэчы, менавіта для таго, каб зразумець побыт і лад жыцця гэтых людзей, карэспандэнт «Звязды» накіраваўся ў самае брудное месца, якое толькі ведаў.

Кажуць, што энергетычнае поле ў месцах кшталту сметнікаў вельмі нядобрае, небяспечнае для людзей. Магчыма, так і ёсць, бо калі стаіш на вяршыні, якая ад гарызонту да гарызонту высеяная кардоннымі, пластыкавымі, шкляннымі рэчамі, бітым посудам, паламанымі дзіцячымі цацкамі, іржавымі каркасамі невядома ад чаго, адчуванне, што трапіў у малюнак якога-небудзь мастака-сюррэаліста. Але калі побач бачыш чалавека, які па-свойску выцягвае з гарышча смецця што-небудзь карыснае для сябе, зноў апускаешся на зямлю. Гэта ўсяго толькі вельмі вялікае месца, дзе вельмі дрэнны пах. Вунь, чарговы грузавік вывальвае з кузава розны бруд, вецер уздымаецца, і частка рэчаў ляціць у твой бок. Гэта ужо трэці па ліку пакет, які чапляецца да адзення. А чалавек побач усё раскопвае гару, яму ўсё роўна.

Фура каўбасы і мільён долараў

Людзі прыбываюцца да сметніка, каб зарабіць. Знайсці і здаць у пункт прыёму кардон, шкляныя бутэлькі, каляровыя металы — вось тры асноўныя выкапні, прычым у літаральным сэнсе, якія даюць штодня мясцовым насельнікам працу. За адзін дзень можна «на шклатары» зарабіць да трохсот тысяч рублёў. Па меншай меры, так хваляцца. Але большасць усё ж такі зазначае, што каля трыццацітысяцідзесяці тысяч. З паперай — тая ж самая гісторыя. На гэтых двух рэсурсах звычайна працуе «ніжэйшая каста» работнікаў — людзі, якія не маюць пастаяннага месца жыхарства, альбо проста бамжы. Зборам каляровага металу займаюцца жыхары з прысталічных вёсак, гэта стала іх асноўным спосабам заробку. Па знешнім выглядзе, праўда, яны амаль не адрозніваюцца ад «мясцовых».

— Я сюды наведваюся ўжо некалькі гадоў, амаль кожны дзень. Пачаў збіраць, калі яшчэ працаваў на чыгунцы, у якасці дадатковага заробку. Зараз год як на пенсіі, і ўжо не магу спыніцца, — дзеліцца мужык, які прадстаўляецца Вовам. — На сметніку можна знайсці ўсё, што толькі магчыма ўявіць.

І сапраўды, амаль ці не ў кожнага з гэтых людзей ёсць мара адшукаць калі-небудзь сярод адходаў мільён долараў. Такія гісторыі вітаюць у паветры, але пакуль рэальных выпадкаў не сустракалася. Між тым, знаходзілі і залатыя ўпрыгажэнні, і цэлыя партыі спіртных напояў і піва. Паводле слоў гэтых людзей, не так ужо і рэдка можа пашчасціць трапіць на фуру мясных вырабаў, каўбасы, іншых прадуктаў харчавання, праўда, з мінулым тэрмінам прыдатнасці. Асабліва прадпрымальныя намагаюцца прапаноўваць гэтыя знаходкі на сталічныя рынкі, аптовым закупшчыкам. Невядома толькі, ці паспяховы такі бізнэс — зноў жа, пра больш сур'ёзныя прыбыткі неяк замоўчваюць.

Фантастычны горад...

Факт — каля сямідзесяці працэнтаў з тых, хто жыве на сметніку, маюць мінскую прапіску і ўласнае, цывілізаванае жыллё. Некаторыя нават кватэры ў цэнтры сталіцы. Сілком на палігон для адходаў іх ніхто не выганяў. Між тым, гэтыя гаспадары жылля, з дакументамі, аддаюць перавагу жыццю на сметніку. Некаторыя — толькі на час, на некалькі месяцаў у год, напрыклад, летам. Іх большасць, і бамжамі яны не могуць лічыцца. Але яны жывуць разам з астатняй меншасцю, з тымі, каму няма куды ісці. На падножжы крутога ўзгорка сметніка размеркаваўся амаль казачны мікрараён, аднапавярховыя хаты якога складаюцца з бляшаных і драўляных лістоў, тканіны і рыззя замест дзвярэй. У самапальных будачках (плошчай тры на два метры, зімой тэмпература ў памяшканні вышэй за навакольную не больш чым на тры градусы) праводзяць дні і ночы насельнікі сметніка. Фактычна, гэта іх прыстанішча, родны дом. Адсюль ужо няма куды збегчы. Сабакі, а іх дватры на аднаго гаспадара, адчуваюць сябе тут даволі ўтульна — вельмі прыязныя, нават да незнаёмых. На пытанне, хто жыве ў хаце, звыклы адказ — я, муж, Чыта (сабака), і чатыры яе шчаняці. Над дахам можа нават дыміць труба самаробнай печкі — нешта гатуюць.

Прычым, з людзей не прызнаецца, якую з «каробак» ён засяляе. Гэта такі кодэкс гонару, нават паміж сваімі не кажуць, што «жыву на сметніку». Хутчэй — «так, знаходжу час ад часу месца, каб пераначаваць».

«Арандую», — паказвае на былы аўтамабільны кузаў з трыма дзвярнымі адсекамі Дзяніс. Прычым у кожным з іх спіць па адным чалавеку. У Дзяніса — тыповы выпадак, без дакументаў з шаснаццаці гадоў, пашпарт ніколі не атрымліваў, на сметніку з дваццацігадовага ўзросту. Зараз яму трыццаць. Паўтара года таму выйшаў з калоніі, дзе быў за дробны крадзеж.

— Канкурэнцыі за месца пад сонцам сярод нас няма. Мы працуем паасобку, чужакоў прымаем да сябе без пытанняў, нікога ніколі не праганяем, — адразу ж абазначае ён. — Чаму я сюды трапіў? Выхоўваўся ў інтэрнаце, ведаю, што недзе ёсць мой бацька, але ніколі яго не бачыў. А што было рабіць? З маладосці быў аб'яўлены ў вышук, збег сюды, потым знайшлі. Цяпер выйшаў з калоніі — нічога не ўмею, падацца няма да каго. Застаецца толькі — бутэлькі збіраць, каб з голаду не памерці. З раніцы пахмяліюся — і на работу. Ежу знаходжу на сметніку. Раней адчуваў гідлівасць, агіду, а потым прызвычаіўся да такога жыцця. Я сам па сабе, начую, дзе пажадаю.

Прычым, трэба аддаць належнае, усе жыхары сметніка сочаць за сабой. Так, як уяўляюць. У адрозненне, калі магчыма параўноўваць, з тымі ж маскоўскімі валацугамі, нашы выглядаюць больш «прэзентабельна». Мужчыны паголеныя ўсе як адзін, на будачках вісяць люстэркі, на сцяне — вымыты посуд. Страціўшы грамадскія сувязі, гэтыя людзі, так мне здалося, не адчуваюць, што яны «на дне» ў разуменні нашым з вамі, бо годнасць і гонар чалавека яны не страцілі.

Бляск і галеча

Згубіла мясцовых жыхароў адзіная хвароба — п'янства. Бутэлька «чарніла» тут — самая цвёрдая валюта. Яе можна набыць адразу ж на месцы работы, на вяршыні сметнікавай гары, абмяняўшы на сабраныя кардон і бутэлькі. Такі вось бізнэс, які наладжваюць калегі па рамяству, толькі больш цвярозыя і прадпрымальныя. Аднак сустракаюцца і выключэнні — гэтым летам тут працаваў пятнаццацігадовы хлопец. За час канікулаў яму не было што рабіць, і, пакапаўшыся ў адходах, да пачатку навучальнага года ён набыў каштоўны веласіпед. Гарадскія жыхары, якія не злоўжываюць спіртнымі напоямі, ставяцца да сметніка, як да бруднага, але прыбытковага месца працы. Грошы, як вядома, не смярдзяць.

У астатнім тут усё як у жыцці. Ці наадварот — жыццё і яго ўдары насельнікі сметніка адчуваюць найбольш востра. Мясцовыя жыхары стваряюць сем' і разыходзяцца, кахаюць і ненавідзяць. І калі гора ў іх, то сапраўднае, і нават яшчэ мацней адчуваецца. У Дзяніса яно вылілае — згарэла яго каханая. Тут, у падножжы сметніка, яны жылі разам даволі працяглы час, і раптам, не так даўно, ноччу, будка загарэлася як трэска, і ў агні яго дзяўчына загінула. Што тут сказаць? Аб гэтай трагедыі ведаюць усе, і камунальныя работнікі сметніка, і яго насельніцтва.

Ад сумы і ад турмы, як вядома... Неаднаразова кажуць гэтыя асобы, што ўжо не ўяўляюць свайго жыцця без валацужніцтва. Зацягвае сметнік, і не адпускае. Можа, і сапраўды месца энергію мае асобую? Такія вось справы. Вось, напрыклад, яшчэ адна пастаянная жыхарка, Інга, ужо і не памятае, колькі гадоў жыве на палігоне. Мае кватэру ў Мінску, прычым, як я зразумеў, запазычанасці па аплаце камунальных паслуг ці іншых прычын, каб збегчы сюды, яна не мае. Зіма, мароз, а яна з хворымі нагамі ўсё роўна прыехала сюды і жыве ў будачцы, нібыта на хутары, асобна на ўзгорку.

— Не магу я без гэтага месца. Мне цяжка хадзіць, таму ўвесь час сяджу, а раней зарабляла зборам рэчаў. Вось печка ёсць, гатую сабе. Хто прыносіць прадукты? Ёсць людзі, дапамагаюць мне, мы адзін аднаго выручаем, калі трэба. Мяне не пакінуць, я ведаю. Таму чакаю, калі ногі мае перастануць балець, каб як і раней магла працаваць. Са мной жывуць сабакі, а бруду, пацукоў я не пужаюся. Прывыкла проста, і не заўважаю, — кажа яна.

Ці ёсць кароль сметніка?

Што рабіць дзяржаве з такімі вось асобамі — хто падкажа? Яны жывуць у кожнай краіне, але ліквідаваць з'яву гэтую не могуць пакуль ні ў адной. Адзінае, што магчыма — наладзіць кантроль з боку праваахоўных органаў. Некалькі разоў на год міліцыянеры праводзяць профілактычныя рэйды, у час якіх выяўляюцца сярод асобаў без пастаяннага месца жыхарства і злачынцы, і людзі, якія лічыліся без вестак зніклымі, і тыя, хто аб'яўлены ў вышук. У час, калі карэспандэнт «Звязды» вандраваў па сметніку, якраз і прайшоў чарговы такі рэйд. Вынікі яго падводзіць **капітан міліцыі, старшы ўпаўнаважаны аддзела крымінальнага вышуку Цэнтральнага РУУС Дзмітрый ЛЯВОНАЎ:**

— Некаторыя прыходзяць кожны дзень як на працу, некаторыя тут жывуць.

У іх размеркаваныя абавязкі па зборы другаснай сыравіны. Тут жа, на месцы яны здаюць знойдзенае скупшчыкам і атрымліваюць некаторую суму грошай за гэта.

— Дык што трымае тут людзей?

— Кожны лічыць, што пашанцаваць павінна менавіта яму, ці марыць знайсці асабліва каштоўную рэч, каб пасля яе продажу можна было жыць, не працуючы.

— Ці ёсць паміж мясцовымі «разборкі» — падзел тэрыторыі, дзе каму працаваць?

— Не, такіх выпадкаў у маёй практыцы не сустракалася. Усё вырашаецца мірам.

— Даводзілася чуць шмат баек пра «ўладароў сметнікаў» — людзей, якія зарабілі агромністыя грошы, трымаючы пад кантролем усіх, хто працуе на сметніку. Ці ёсць на гэтым палігоне для адходаў свой «крыжовы бацька»?

— Не, галоўнага над мясцовымі, «караля сметніка», аб якім вы пытаецце, няма. Аднак, хутчэй за ўсё, існуе юрыдычная асоба, якая афіцыйна займаецца скупкай знойдзеных каляровых металаў, шкляторы ў людзей, і гэтым шляхам заробляе сродкі.

Дзмітрый АЛЬФЕР.
Фота аўтара.

Аўтар выказвае падзяку старшаму інспектару групы інфармацыі і грамадскіх сувязяў Цэнтральнага РУУС г. Мінска Святлане Кабковай за дапамогу ў падрыхтоўцы матэрыялу.

Што за цырульнік без... мыла?

На Віцебшчыне не эфектыўна выкарыстоўваюцца аўтамабілі так званай мабільнай службы быту, атрыманыя з рэспубліканскага бюджэту. Наогул «бытоўка», на жаль, не аказвае ўсе неабходныя вяскоўцам паслугі, ды і якасць многіх з іх нізкая — да такіх высноў прыйшлі супрацоўнікі Камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці. Яны праверылі, як арганізавана бытавое абслугоўванне ў некалькіх раёнах рэгіёна.

Устаноўлена, што летась у Чашніцкім раёне «бытоўкай на колах» было аказана паслуг сельскаму насельніцтву на суму менш чым 400 тысяч беларускіх рублёў, а страты ў выніку склалі 3,6 мільёна (па водле даных за 10 месяцаў мінулага года).

Што датычыцца стацыянарных пунктаў бытавога абслугоўвання, таксама ёсць вялікія нараканні. Так, напрыклад, вымушае чакаць лепшага якасць паслуг у цырульні «Прыгажуня» ў саміх Чашніках. У майстроў не хапала ўсіх неабходных матэрыялаў. У прыватнасці — для стварэння мадэльных прычосак. А каб пафарбаваць валасы, кліентам трэба было прынесці з сабой адпаведныя прэпараты. А мужчынам немагчыма пагаліць бараду. Аб чым гаварыць, калі кантралёры высветлілі, што за 10 месяцаў 2007-га цырульнікам наогул не выдавалі мыла.

У Віцебскім раёне ў Доўжы на рабочым месцы комплекснага прыёмнага пункта знаходзіліся прэпараты, тэрмін выкарыстання якіх ужо даўно прайшоў. А ў самім Віцебску на ўчастку па рамонце абутку КУП «Вітрайбыт» па вуліцы Ленінградскай у квітках не ўказвалі даты прыёму і тэрмін выканання заказу, від неабходнага рамонту і іншае. Абутак вяртаўся без адрыўных гарантыйных талонаў, тым самым парушаліся правы спажыўцоў, якія маюць права на гарантыйны рамонт.

Па выніках гэтай «бытавой праверкі» да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнулі 11 вінаватых.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Аўтарэйтынг

«ІДЭАЛЬНЫЯ ГАРАДЖАНЕ»

Вядомы амерыканскі часопіс Forbes абнародаваў спіс аўтамабіляў, якія найлепш падыходзяць для эксплуатацыі ў гарадскіх умовах.

Такім чынам, у спаборніцтвах за тытул «ідэальных гараджан» не было роўных «Audi A3». Гэты аўтамабіль спрытна манеўруе, мае выдатную сістэму бяспекі і камфартабельны салон, у якім кіроўца выдатна пераносіць нават шматгадзінныя прастоі ў заторах. На другім месцы апынулася «Mazda3», на трэцім — «Mini Cooper». У спіс лепшых «гараджан» таксама трапілі: «Hyundai Tucson», «Mitsubishi Outlander», «Toyota RAV4», «Honda CR-V», «Toyota Camry».

Аўтанавінка

«СУБМАШЫНА»

Швейцарскае цюнінгавае атэлье «Rinspeed» стварыла першую ў свеце машыну-амфібію, якая можа плаваць і пад вадой. Адметна, што аўтамабіль пад назвай «Squba» мае электрычны рухавік. На сушы ён здольны імчаць з максімальнай хуткасцю 110 км/г, на паверхні вады — 6 км/г, а пад вадой — 3 км/г. «Субмашына» можа апускацца на глыбіню 10 м. Праўда, кіроўцу і пасажыру спатрэбяцца акваланг, бо «Squba» — кабрыялет (аўто з адкрытым верхам). Кошт «амфібіі» складае 1,5 мільёна долараў.



Аўтаімпарт

ІМКЛІВАЯ ПЛЫНЬ ІНШАМАРАК

Паводле звестак прэс-службы Дзяржаўнага мытнага камітэта, у мінулым годзе ў Беларусь было ўвезена 181,1 тыс. легкавых аўтамабіляў агульным коштам 1 млрд 80,9 млн рублёў.

Для параўнання, пазалетась у нашу краіну было імпартавана 157,6 тыс. іншамарак на 812,9 млн рублёў. Найчасцей беларусы ўвозілі аўтамабілі з Германіі, Францыі, Расіі і Японіі.

Аўтаспорт

РАЛІ ЭМІГРУЮЦЬ

Упершыню за 30 гадоў свайго існавання ралі «Дакар» будуць праводзіцца «ў эміграцыі».

Паводле звестак арганізатараў спаборніцтваў, гонкі адбудуцца ў студзені наступнага года ў Чылі і Аргенціне. Варта нагадаць, што ралі, запланаваныя на студзень гэтага года, былі адменены з-за пагрозы тэракту.

Аўтажарт

Аб'ява: «Патрабуецца аўтаслесар, які мае досвед у машынах ВАЗ. Работнікам «АўтаВАЗа» просьба не турбаваць...»

НЕПАХІСНЫЯ

Самагоншчыкаў, відавочна, ніякія штрафы не палохаюць, бо міні-заводаў, хоць іх і знішчае міліцыя, меней не становіцца.

Толькі за адзін дзень 11 лютага супрацоўнікі міліцыі ў лесе каля вёскі Апіляновічы, што ў Пружанскім раёне, знішчылі 2 тыс. літраў брагі. А ў Кобрынскім раёне вылілі яшчэ 1000 літраў.

Самагоншчыкі і на гэты раз уцяклі. Даводзіцца толькі здзіўляцца непахіснай мэтанакіраванасці ў гэтай справе палешукоў.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ОАО «Минский завод отопительного оборудования»

извещает акционеров о проведении очередного собрания акционеров 21 марта 2008 года в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Тимирязева, 29 — зал заседаний.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Отчет дирекции об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2007 г. Утверждение основных целевых прогнозных показателей социально-экономического развития Общества на 2008 год.
2. Отчет Наблюдательного совета о проделанной работе в 2007 году.
3. О результатах аудиторской проверки и проверки Ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2007 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков Общества за 2007 год.
5. Об утверждении распределения и использования чистой прибыли и расходов на потребление, а также выплате дивидендов за 2007 год.
6. Утверждение направлений использования чистой прибыли и расходов на потребление на 2008 год.
7. Об избрании членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.
8. Утверждение размера вознаграждения членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
9. О совершении Обществом крупной сделки.

С материалами по вопросам повестки дня акционеры могут ознакомиться по указанному адресу (профком) с 12 по 21 марта 2008 г. с 10 до 16 часов.

Регистрация участников собрания будет производиться с 15.00 до 15.45 в день и по месту проведения собрания на основании документа, удостоверяющего личность. Кроме того, представитель акционера должен иметь доверенность (руководитель юридического лица, являющегося акционером, — документы, подтверждающие его полномочия).

Список акционеров для регистрации участников собрания составлен по данным реестра акционеров на 1 марта 2008 г.

Наблюдательный совет ОАО «МЗОО».

УНН 100008064.

Местный фонд «Правопорядок Заводского района г. Минска»

зарегистрирован решением управления юстиции Минского горисполкома 19.07.2006 г. № 00043 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за **№ 194900098.**

МЕСТО НАХОЖДЕНИЯ ФОНДА:

220026, г. Минск, ул. Жилуновича, д. 17, комн. 26.

Учредителем Фонда является администрация Заводского района г. Минска.

Стоимость имущества Фонда 21 330 254 рубля.

ДОХОДЫ ФОНДА:

— безвозмездная (спонсорская) помощь от предприятий, организаций района;

— целевые поступления от организаций и предприятий района.

Общая сумма расходов, понесенных Фондом на достижение общественно полезных целей, указанных в Уставе Фонда, 68 990 916 рублей.

Предпринимательская деятельность Фондом не велась и хозяйственные общества не создавались.

Предложение о покупке акций

Полное наименование и местонахождение покупателя акций	Открытое акционерное общество «Продтовары», 224005, г. Брест, ул. Комсомольская, 34
Полное наименование, местонахождение эмитента, акции которого приобретаются	Открытое акционерное общество «Продтовары», 224005, г. Брест, ул. Комсомольская, 34
Цель приобретения акций	Для последующего аннулирования
Количество акций, которое намеревается приобретать покупатель	175 708 шт.
Цена, по которой покупатель намерен приобретать акции	2000 рублей
Срок, форма и порядок оплаты акций	В течение 5-ти рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи акций путем выплаты наличных денег или по безналичному расчету
Адрес, по которому будут заключаться договоры купли-продажи акций	224005, г. Брест, ул. Комсомольская, 34
Дата начала срока представления предложений акционеров на продажу акций	19 февраля 2008 г.
Дата окончания срока представления предложений акционеров на продажу акций	26 февраля 2008 г.
Дата начала покупки акций (заключение договоров купли-продажи)	27 февраля 2008 г.
Дата окончания покупки акций (заключение договоров купли-продажи)	2 апреля 2008 г.

Контактный телефон 21 92 38

УНП 200019837.

Браканьераў знайшлі па следзе

На краі ляснога масіву паблізу вёскі Селішча Барысаўскага раёна было знойдзена месца здабычы дзіка. Сляды прывялі работнікаў Касцюковіцкай міжрайінспекцыі аховы жывёльнага і раслінnага свету да аднаго з дамоў у гэтым населеным пункце. Выклікалі следча-аператыўную групу мясцовага РУУС.

Падчас агляду жылля была знойдзена разабраная туша дзіка, паляўнічыя патроны, незарэгістраванае ружжо, якое было схавана за печчу, і 17 паляўнічых петляў са стальнога дроту. У доме знаходзіліся два работнікі УП «Максімаўка». У дачыненні да правапарушальнікаў складзены адміністрацыйныя пратаколы, матэрыялы перададзены ў міліцыю для разгляду пытання аб узбуджэнні крымінальнай справы.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПАСПЯШАЎСЯ

Ужо немалады вадзіцель зазірнуў да знаёмай, якая жыве ў Паўночным мікрараёне, што ў Баранавічах.

Адпачыўшы, мужчына пайшоў дамоў, а калі ўбачыў, што з кішэні курткі знікла пластыкавая картка, захваляваўся, і нездарма. Нехта паспеў з рахунка вадзіцеля зняць паўтара мільёна рублёў. Міліцыя злодзея вылічыла хутка. Ім аказалася знаёмая, у якой мужчына распранаўся.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ТЦ «Купаловский»

(г. Минск, ст. метро «Октябрьская», 2-й уровень)

СДАЕТ В АРЕНДУ ТОРГОВЫЕ ПЛОЩАДИ.

Конт. тел.: (8 017) 287 76 31, 287 77 14.

Наблюдательный совет ОАО МК № 93

ставит в известность, что 28.03.08 г. в 10.00 в помещении ОАО Мехколонна № 93 (3 этаж) по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 13, состоится отчетно-выборное собрание акционеров по результатам работы за 2007 год.

ПОВЕСТКА ДНЯ

1. Отчет о работе Наблюдательного совета ОАО МК-93 за 2007 г.
Докладчик — председатель Наблюдательного совета Н.Я. Михальков.

2. Отчет дирекции о производственно-финансовой деятельности по использованию сметы ФЭС за 2007 год и утверждение плана социально-экономического развития и сметы ФЭС Общества Мехколонна № 93 по направлению на 2008 год.
Докладчик — директор ОАО МК-93 В.М. Сосновский.

3. Отчет Ревизионной комиссии ОАО о работе за 2007 год и утверждение акта аудиторской проверки финансовой деятельности ОАО Мехколонна № 93 за 2007 год.
Докладчик — А.П. Афанасьев.

4. Утверждение годового баланса ОАО МК-93 за 2007 год.
Докладчик — гл. бухгалтер ОАО МК-93.

5. Определение порядка выплаты дивидендов на 2008 г.
Докладчик — В.М. Сосновский.

6. Изменение и дополнение Устава ОАО МК-93.
Докладчик — Н.Я. Михальков.

7. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии по ОАО Мехколонна № 93.
Докладчик — В.М. Сосновский.

8. Определение размера вознаграждения членам Наблюдательного совета, Ревизионной комиссии.
Докладчик — В.М. Сосновский.

Председатель Наблюдательного совета ОАО МК-93 *Н.Я. Михальков*
УНП 100003019

Беларусы змогуць убачыць поўнае месяцавае зацьменне

Поўнае месяцавае зацьменне адбудзецца ў ноч з 20 на 21 лютага, калі Месяц будзе знаходзіцца ў задыякальным знаку Дзевы. Пры бясхмарным надвор'і беларусы змогуць убачыць гэту незвычайную астранамічную з'яву. Частковае месяцавае зацьменне пачнецца ў 3 гадзіны 43 хвіліны, у 5 гадзін 4 хвіліны настане поўнае зацьменне, якое дасягне свайго піку ў 5 гадзін 26 хвілін і закончыцца ў 7 гадзін 9 хвілін.

БЕЛТА.

Крымінал

ЗАТРЫМАЛІ НА МЕСЦЫ ЗЛАЧЫНСТВА

Двое маладых хлопцаў з Гомеля выехалі «на паляванне» ў «правінцыю» — у Добруш. Аб'ектам абралі краму «Свежы хлеб».

Дзейнічалі яны нахабна і зладжана. А восьмай гадзіне вечара, збіўшы і звязаўшы дзвюх прадаўшчыц, забралі выручку ў суме 460 тысяч рублёў, сотавы тэлефон і шукалі, што б яшчэ парадавала іх злачынныя душы, як тут (а прайшло ўсяго шэсць хвілін з моманту іх разбойнага нападу) з'явіліся супрацоўнікі міліцыі і ўзялі іх «за жабры». Што іх чакае цяпер, гаварыць не трэба.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Зімовыя зацемкі

РАЗГУЛЯЛІСЯ... НЕ ВЯТРЫ, НЕ ЗАВЕІ

Сёння гутарка пойдзе, дарагі чытач, пра кабет, якія кідаюцца на злом галавы. Куды? Зараз растлумачу. Работнікі Драгічынскага сацыяльна-педагагічнага цэнтра заўважылі тэндэнцыю апошняга часу: у прытулак трапляюць дзеці не толькі тых жанчын, якія співаюцца або запіваюць, але і тых мамачак, якія кідаюцца ў загулы. Адных з іх, здараецца, знаходзяць у прытонах, іншыя проста з'язджаюць у невядомым накірунку наўздагон прывіднаму «каханню». З п'янствам усё больш-менш зразумела, алкагалізм — хвароба, якая вядзе да змяненняў у галаўным мозгу. І хоць апошняе не можа быць апраўданнем ніводнаму алкаголіку, медыцынскі аспект праблемы дазваляе лягчэй зразумець сутнасць з'явы. А цяга да прыгод, якая мяжуе з залежнасцю, гэта нешта такое, што цяжэй паддаецца разумению.

Жывуць у суседніх вёсках дзве маладыя кабеты. У адной і другой — малыя дзеці. Яны не тое што сябруюць, так, сустракаюцца пра жыццё пагаварыць, нават адна адной часам дзяцей пакідаюць. А здараецца, знікне то адна, то другая і так хутка, што нават не паклапоціцца, каб недзе ўладкаваць на час малое. У вёсцы тады кажуць: «Загуляла». Пра дзіця дзён колькі клапоцяцца суседзі, работнікі ФАПа, калі толькі справа не даходзіць да прытулку. Бывае, маці з'яўляюцца самі, а бывае, ім для гэтага патрабуецца ўнушэнне прадстаўніка ўлады або нейкай адпаведнай установы. Карцінка, што называецца, з натуры. Але гаворка ідзе пра жанчын, якія гадуюць дзяцей адны, вызначыліся няўстойлівымі паводзінамі і ўтвараюць, што называецца, групу рызыкі. А вось наступная гісторыя адбылася з вясковай жанчынай 34 гадоў, маці шматдзетнай сям'і.

Сям'ю, відаць, можна было б назваць шчаслівай, каб не тое, што здарылася потым. Жылі, дзяцей гадавалі, працавалі, узялі крэдыт, каб пабудаваць дом. Свой, уласны, прасторны. Думалі, што ў ім будзе камфортна і хораша дзецям. І сцены ўжо былі ўзведзеныя. Пачаліся работы ўнутры. Гаспадар усё ў асноўным рабіў сваімі рукамі. Але (каб ведаў, абышоў бы дзесятай дарогай) у нейкі момант рашыў наняць памочніка — хлопца 22 гадоў. У памочніка, здавалася, рукі на месцы, справа пакрысе прасоўвалася. Нічога не заўважаў бацька сямейства, пакуль яна, маці і гаспадыня незакончанага дома, не заявіла, што сыходзіць з ім, з маладым. Звестка нібы маланка з неба апаліла ўсю радню.

Прасілі, угаворвалі адумацца яе бацькі, яго бацькі. «Каханне ў нас, — быў ім адказ, — і мы чакаем дзіця». Сабрала дзяцей, рэчы і пайшла. Дом болей не будуецца, яго паставілі на кансервацыю, шматдзетная сям'я развалілася. Ці будзе там новая сям'я, яшчэ вялікае пытанне. Найбольш верагодным уяўляецца такі ход развіцця падзей: праз год-другі малады і каханы сустрэне новае захапленне — сваю равесніцу, а былы муж невядома ці захоча ўсё забыць і пачынаць спачатку. І тады надыдзе час з'ядаць «горкую ягаду», якая, як вядома, дастаецца адной. Але пакуль на стале «салодкая», ніхто не думае пра наступствы.

Адна мая знаёмая, упэўненая феміністка, псіхолаг па адукацыі, кажа, што гэта падсвядомая помста жанчын за часы недалёкіх рыцараў, Дамастрою і пастаяннай дыскрымінацыі, якая і ў грубых, і вытанчаных формах існуе да гэтага часу ва ўсіх без выключэння краінах свету. Яна гатовая і сярэднявечча ўспомніць, каб апраўдаць безадказнасць самых звычайных нашых сучасніц. Ну былі дубінаголовыя рыцары з іх здзекам пад назвай «пояс вернасці», які прыўмове яго нашэння прывёў бы да хуткай смерці. Але ж літаратура тых часоў пакінула сведчанні пра дасціпных кавалёў, што не былі дурнямі і кавалі ў запас ключык-дублікат, які можна было прадаць за добрую цану іншаму рыцару або самой закаванай. Даўно мінулі змрочныя гады Дамастрою і пазнейшай барацьбы жанчын за сваё раўнапраўе. На дварэ XXI стагоддзе з усімі яго прыкметамі і поўнай інфармацыйнай свабодай. Вось у апошняй, па-мойму, і крыюцца карані з'яў, што часта абарочваюцца бедамі. А мы недаацэньваем уплыў на свядомасць сучасніц серыялаў і стужак аб прыгожым жыцці.

Скажаце, не можа быць так проста: нагледзелася, намарылася і пайшла куды вочы глядзяць. Выходзіць, што можа. А людзі нашы, як паказвае практыка, вельмі лёгка паддаюцца розным уплывам. Вось прыехаў нейкі прапаведнік, пагаварыў пра кашмары быцця, напалохаў Страшным судом. Вынік: адна кобрынская вясковая сям'я з дзецьмі сядзіць у пензенскім падзямеллі, жабінкаўская вясковая сям'я зрабіла сябе добраахвотнымі пустэльнікамі тут, дзяцей у школу не пускаюць. У вёсцы Пінскага раёна, у самай глыбіні Палесся, на пошце за два дні да 14 лютага ўсе «валянцінкі» разабралі, не хапіла многім нават. Гэта пра што гаворыць? Вельмі лёгка ўкараняецца ў свядомасць моладзі любая новая ідэя. А калі адзін серыял за другім, кожны дзень з новым сюжэтным паваротам, з прыгажосцямі і спецэфектамі паступова куюць цаглінкі свядомасці: нейкае фантастычнае каханне, незямное шчасце магчыма... А чаму б і не са мной? — думае вясковая кабета, якая сёння апранаецца, прычэсваецца і валодае ўсёй інфармацыяй не горш за гарадскіх. Жанчыны, на жаль, схільныя хутчэй захапляцца без астатку, чым мужчыны. Як і ў выпадку з алкаголем: з жаночага арганізма ён выходзіць намнога павольней, а вось трапіць у алкагольную залежнасць кабетам патрабуецца значна менш часу, чым моцнай палове.

Цяперашнія прыгажуні не глядзяць стары добры галівудскі фільм «Масты акругі Мэдзісан». Тым больш, не чытаюць аднайменны твор Джэймса Уолера. Яны глытаюць кінапрадукт, які прапануе сучаснае тэлебачанне. А ў памянёным творы гераіня дзеля вялікага кахання, якое не пакінула яе да канца жыцця, не змагла ахвяраваць сям'ёй. Каханню засталіся яе дзённікі і архівы, з якіх дзеці пра ўсё і даведаліся пасля смерці мацi. Бо жыццё — не серыял, тым больш, не адна серыя. Рана ці позна яно запатрабуе свайго сцэнарыя.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Усміхнёмся!

Пячонка, ныркі і іншыя ўнутраныя органы хочуць сардэчна падзякаваць галаўны мозг за літасціва прадстаўлены 48-гадзінны перапынак ва ўжыванні спіртных напояў, і просяць паставіць яму якую-небудзь вясёлую песню.

☺

Мама — дачцэ:
— Хто з'еў грушу?
— Не ведаю!
— А яшчэ хочаш?
— Хачу!

☺

Хворы ад апэрацыі адмовіўся, выпісаны пад нагляд раённага патолагааната-ма.

☺

На семінары па матэматычным аналізе:
— Студэнт, вы зрабілі хатняе заданне?
— Не.
— Чаму?
— Часу не было.
— Дзяўчаты?
— Не.
— Студэнт, вы мяне засмучаеце.

☺

Няўдзячная гэта справа — мір ратаваць: калі не атрымаецца, то ва ўсім абвінавацяць цябе, а калі атрымаецца, то ніхто не паверыць, што гэта зрабіў менавіта ты.



ЧАРОДКА ШЭРЫХ КУРАПАТАК ЗІМУЕ ПАД АХОВАЙ ВІЦЕБСКАЙ МІЛІЦЫІ

За некалькі крокаў ад цэнтральнага ўваходу ў Віцебскі раённы аддзел унутраных спраў, недалёка ад шумнай дарогі, якая вядзе на аўтазаправачную станцыю, у снезе размясцілі ся і камфортна адчуваюць каля 20 шэрых, крыху большых за шызага голуба, птушак.

Паводле слоў супрацоўнікаў міліцыі, для іх курапаткі, якія спяць у снезе, — звычайнае відовішча. Птушкі даўно аблюбавалі раён, дзе акрамя РАУС знаходзіцца абласное ўпраўленне ДАІ і дыслакуецца полк патрульна-паставой службы УУС. Нягледзячы на неспакойнае суседства, птушкі, верагодна, прыняслі лужок з блакітнымі елкамі ля ўваходу ў будынак за ўзлесак — месца свайго натуральнага пражывання. Міліцыянеры з задавальненнем падкормліваюць птушак, а тыя, у сваю чаргу, ахвотна пазіруюць камерам мабільных тэлефонаў.

У Віцебскім дзяржаўным універсітэце на кафедры заалогіі патлумачылі, што курапатки, як правіла, стараюцца зімаваць паблізу чалавека — на ўскраінах вёсак. Аднак віцебскую зімоўку пад крылом міліцыянераў арнітолагі лічаць даволі цікавым фактам.

БЕЛТА.

*Віншую з 15-годдзем сумеснага жыцця — бронзавым вяселлем — **Мікалая і Наталлю САРОКА**.*

Жадаю з мірам, каханнем і дабрабытам да серабра і золата дажыць.

Дораш К.В., *в. Зазерка.*

Утерянный бланк **страхового полиса Белгосстраха** по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь **серии АЖ № 1421238 считать недействительным.**

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.20	17.28	10.08
Віцебск —	7.13	17.14	10.01
Магілёў —	7.10	17.18	10.08
Гомель —	7.04	17.17	10.13
Гродна —	7.35	17.43	10.08
Брэст —	7.32	17.47	10.15

Месяц

Першая квадра.

Месяц у сузор'і Льва.

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Лукі, Парфена;*
К. *Анеты, Людмілы, Леха, Лявона, Юльяна.*

НАДВОР'Е на заўтра



...у суседзяў

ВАРШАВА	+2..+4°C	КІЕЎ	0..+2°C	РЫГА	+4..+6°C
ВІЛЬНЮС	+2..+4°C	МАСКВА	-4..-2°C	С.-ПЕЦЯРБУРГ	0..+2°C

Дзве даты

20 лютага

1903 год — 105 гадоў таму ў вёсцы Хоціна Бешанковіцкага раёна нарадзіўся Леў Міхайлавіч Даватар, легендарны савецкі военачальнік, Герой Савецкага Саюза. У Вялікую Айчынную вайну з чэрвеня 1941 года ваяваў на Заходнім фронце — камандаваў асобнай кавалерыйскай групай, якая ў жніўні—верасні зрабіла глыбокі рэйд па тылах праціўніка на Смаленшчыне, нанёсшы яму вялікія страты. Загінуў у снежні 1941 года.

1901 год — у «Церковных ведомостях» аб'яўлена аб адлучэнні Льва Талстога ад праваслаўнай царквы.

Цытата дня:

«Усё-такі шкада, што няма больш нямога кіно: якое задавальненне было бачыць, як жанчына адкрывае рот, а голасу не чуваць».

Чарлз Чаплін (1889—1977), амерыканскі акцёр, сцэнарыст, рэжысёр.

Ёсць нагода

«Добрым быць зусім-зусім няпроста?»

У нядзелю па ўсім свеце адзначаўся дзень спантаннага праяўлення дабрыні, які адзначаецца па ініцыятыве міжнародных дабрачынных арганізацый. У нашай краіне гэта свята амаль невядомае. У гэты дзень дораць сваю ўвагу і цеплыню не толькі родным і сябрам, але і незнаёмым людзям, якія ў ёй маюць патрэбу.

Каму сёння не хапае дабрыні? Хто, па вашаму, найбольш заслугоўвае яе праяўлення?

Кацярына САПОЖНІКАВА, інжынер-праекціроўшчык «Белпрампраекта»:

— Найбольшую патрэбу ў дабрыні, на мой погляд, маюць дзеці, якія выхоўваюцца ў дзіцячых дамах. Я заўсёды за іх перажываю. Я лічу, што сапраўдная сям'я — тая, дзе не менш за трое дзяцей. І наша з мужам мара — менавіта такая сям'я, прычым адно дзіця мы хацелі б усынавіць. Вельмі хацелася б, каб з нашай дапамогай спраўдзілася мара хоць бы аднаго малога знайсці маму і тату. Спадзяюся, што гэта наша мара ажыццявіцца.

Алег ШЭПЕЛЬ, старшыня Параалімпійскага камітэта Беларусі:

— Зараз і сапраўды той час, калі многім людзям неабходная дапамога. І яна не абавязкова павінна аказвацца фінансава. Найбольш увага сёння патрэбна дзецям з абмежаванымі магчымасцямі, дзецям, якія выхоўваюцца ў дамах-інтэрнатах, дзецям са шматдзетных сем'яў. Акцыя «Спартсмены — дзецям», адным з арганізатараў якой я з'яўляюся, ставіць мэтай дапамагчы менавіта такім дзецям. І я ўдзячны тым артыстам і многім нашым вядомым спартсменам, якія не шкадуюць ні ўласнага часу, ні сродкаў, каб падарыць свята дзецям, якія воляй лёсу засталіся без падтрымкі бацькоў.

Валянціна КАРАЛЁВА, начальнік Галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Міністэрства працы і сацыяльнай абароны:

— Дабрыні заслугоўваюць усе, незалежна ад статусу, полу, узросту. Гэта такое пачуццё, якое патрабуецца ўсім. Нават самым моцным людзям часам так хочацца чыёйсьці ўвагі. А дзеці і старыя — гэта тыя катэгорыі, якія найбольш востра пакутуюць, калі ім не хапае цеплыні і добрых адносінаў. Таму хацелася б, каб мы заўсёды памяталі, што нашы сталыя бацькі маюць патрэбу не столькі нават у матэрыяльнай падтрымцы, а проста ў чалавечай цеплыні, у размове, хоць бы па тэлефоне, якая для пажылога чалавека зусім не лішняя.

Андрэй ТАКАРЧУК, дырэктар Мінскага гарадскога тэрытарыяльнага фонду дзяржаўнай маёмасці:

— У сённяшнім свеце, напоўненым негатывам, які ідзе і з экрана тэлевізара, і з Інтэрнэта, найбольш уразлівымі застаюцца дзеці. Нашаму пакаленню, выхаванаму на творах Маршака, Агніі Барто, Біянкі, Астрэд Лінгрэнд было ў гэтым плане прасцей. Героі сённяшніх дзяцей — Пакемоны, Гары Потэр і інш., гэта своеасаблівыя дзіцячыя «баевікі», якія на жаль, не развіваюць лепшых якасцяў.

P.S. *Паважаныя дарослыя, паглядзіце на сваіх маленькіх дзяцей і пажылых бацькоў іншымі вачыма. І замест раздражнёнай заўвагі скажыце што-небудзь прыемнае. Ваша дабрыня вернецца вам у адказ тут жа, непадробнай цеплынёй і ўсмешкай, і што самае галоўнае, адгукнецца ў будучым.*

Алена АЎЧЫННІКАВА

Талковая нявестка

Было гэта гадоў 15 назад, восенню і ў нядзелю раніцай.

Чаму так дакладна помню? Таму, што ў той год жаніўся мой сын, на выхадныя разам з нявесткай прыехалі да мяне. Я (госці ёсць госці, ды яшчэ дарагія) раніцай будзіць іх не стала, ціхенька агледзела гаспадарку, падпаліла ў печы, наставіла гаршкоў. Час бліны пячы. Толькі за чапялу — сваячка на парог. На хвілінку, кажа, заехала — на выправы запрасіць.

Я давай нешта на стол збіраць, частаваць, а яно ж і пагаварыць ахвота...

Нявестка выручыла: каля печы яна не гаспадыня (гарадская), а вось ля газавай пліты... Адразу ўсе канфоркі запаліла: там у яе чайнік, там мяса смажыцца, тут бліны. А ў перапынках яшчэ нешта з халадзільніка на стол падае, посуд ставіць. Карацей, паўгадзінкі ці прайшло, мы ўжо снедаем, гамонім. Я, зразумела ж, хвалю нявестку. Сваю... А сваячка мая — сваю. Такая, кажа, талковая, такая гаспадыня...

— А твая не, не такая, — прызнала на развітанне сваячка (добра, што не чуў ніхто). — І бліны ў яе падгарэлыя, і мяса сухое...

— Дык дзіця ж, — кажу, — 20 гадоў няма. Навучыцца яшчэ.

А самой так крыўдна стала, што і на выправы не пайшла.

А вось да той хвалёнай нявесткі неяк патрапіла.

Падалася я, значыць, у раён на базар. Прыйшла на вакзал, каб дадому ехаць, — аўтобус адмянілі: наступны толькі ў чатыры гадзіны, а цяпер дванаццаці няма. Не паспела падумаць, што ж рабіць, сваячка тая... Як з пад зямлі. «Пайшлі да маіх, — кажа, — паглядзіш, як жывуць, пагамонім».

Прыйшлі. Паглядзелі. Чыста ў хаце, не бедна. Малое дагледжана. І нявестка прывеціла — узялася яблычны пірог пячы. Зрабіла ўсё, у духоўку паставіла, сядзіць з намі, чакае пакуль спячэцца. А на гадзінніку між тым палова другой.

— Ой, — падхапілася, — у мяне ж прадумана ўсё. На абед рыбны суп будзе і рагу. Я зараз...

— Ды не трэба, — баронімся (пах на ўсю хату, есці ахвота...). — Можна чаю з тым пірагом...

— Не, — пратэстуе. — Вы блізкая радня, першы раз у хаце.

На кухню пайшла, нечым там ляпала. Разоў колькі вярталася. Ну, думаю, зараз жа, зараз за стол пакліча. Не, не тут тое было, не прычакалі — ні суп не зварыўся, ні тое рагу. І на вакзал нам пара.

Так галодныя і панесліся. Ужо ў аўтобусе пірага таго з'елі. З сабою дала. Па кавалачку...

Але, нягледзячы на голад, смачным ён мне не здаўся. Як і нявестка дужа талковай.

Алена К.,
Маладзечанскі раён

Гісторыя з геаграфіяй

Сабраліся мы, трое аднакурснікаў, адзначыць стары Новы год. Як водзіцца, пасядзелі, выпілі пакрысе, сталі ўспамінаць, у каго ў навагоддзе якія прыгоды былі... Тады я і пачуў...

Было гэта, значыць, у 80-ыя гады мінулага стагоддзя. У школе, дзе я тады працавала, тэлефон зазваніў — пуцёўка ёсць. Па майму профілю. І, лічы, задарма, бо гарыць...

— Дзе той санаторый? — пытаюся.

— У Светлагорску, — кажуць.

Я і рада: далёка ехаць не трэба. Сабралася, купіла білет на 30 снежня, села ў аўтобус і еду шчаслівая.

Але ж дзень кароткі. Цямнець хутка стала. Я да кіроўцаў:

— Хлопцы, — прашу, — вы ж мне скажаце, як лепш да санаторыя дабрацца, што ў Светлагорску?

Яны пераглянуліся. Рагатнулі... Кажуць:

— Жанчына, тут, у Светлагорску, адзін санаторый... Алкаголікаў лечаць. Вам, як быццам, ён не па профілю?..

Я ў сумку, — пуцёўку дастаю. Чытаю: санаторый мой сапраўды ў Светлагорску, але... Калінінградскай вобласці.

Аж села знячэўку.

Хлопцы выручылі. Кажуць:

— Хутка будзе сустрэчны аўтобус. На Мінск. Мы яго спынім, вы вернецеся назад...

Вярнулася. На цягнік білетаў няма. Дадому ехаць сорамна. Ледзь умаліла начальніка аднаго з цягнікоў, каб да Калінінграда ўзяў... Хоць пад столлю на верхняй лаўцы, дзе валізкі возяць...

Вось там і сустрэла я Новы год.

Потым, калі пытаўся хто, як, — казала:

— Выдатна.

Але ў падрабязнасці не ўдавалася, бо сорамна... Да таго ж выкладчыку геаграфіі.

Адно, што засвоіла і сама і іншым раю — заўсёды чытайце ўсё, што напісана ў пуцёўцы.

П.І. БРАТОК,
г. Мінск

Незвычайны мужчына!

У той час у дэфіцыце было ўсё. А ўжо яйкі, перад Вялікаднем...

Адна сямейная пара — муж з жонкаю — паўгорада аббегалі, у трох чэргах пастаялі (не хапіла...), але ж у чацвёртай купілі-такі. Поўны поліэтыленавы пакет.

На аўтобусны прыпынак яго мужчына панёс. Асцярожна-асцярожненька.

А далей жа ехаць трэба. І аўтобусы перапоўнены. Адзін прапусцілі, другі... Народу на прыпынку сабралася... У тым ліку і з яйкамі — з гастранома таго, з чаргі...

Трэці аўтобус пад'ехаў, дзверы адчыніў. Мужык той, як чалавек выхаваны, культурны, сваю жонку наперад прапусціў, іншых жанчын. Сам толькі нарэшце шчаміцца стаў. А яйкі, каб не падушыліся, ззаду трымаў, за спінай. Жонка згледзела гэта — ледзь не самлела: раптам хто штурхане?.. «Кранты» ж — прыйдзецца зноў у чэргах стаяць. А таму як закрычыць:

— Людцы, ды паглядзіце ж вы: усе мужыкі, як мужыкі — яйцы спераду трымаюць, а ў майго дык ззаду.

Аўтобус, казалі, аж страсянуўся ад смеху.

...Што цікава — пасля гэтага — месца ў ім паболела, і дэфіцыт у поўнай цэласці даехаў дадому.

Алена САЎКО,
в. Рэпля, Ваўкавыскі раён

А Васька слухае...

Смеху баіцца нават той, хто не баіцца ўжо нічога.

Не верыце? Тады слухайце.

Быў у мяне адзін знаёмы. Знешне — мужык, як мужык: сталы, жанаты, дзетны. Ганьба адна — як рабіць штосьці — яго днём з агнём не знойдзеш, а вось як есці (ды на дармаўшчыну) — першы за сталом. Да таго ж — ні на кога не зважае, найсмачнейшае пад сябе — і давай умінаць.

Гаварылі яму, што так не ўсе свінні ядуць, сарамацілі. А з чалавека, як з гуся вада: слухае ды, прабачце, с... наядае.

Рашылі тады правучыць яго, жарт састроіць. У той час у многіх прырэчных вёсках рыбалавецкія брыгады стваралі. У адну — Васіль запісаўся. Ведаў, што і капейку там можна атрымаць, і паесці ад пуза, бо пасля лоўлі ж на ўсю брыгаду юшку варылі, а значыць, калі сумлення няма, можна лепшыя кавалкі з яе павыбраць...

У той раз ён уласнаручна галаву язя ад тулава адрэзаў. Разам з плячыма... Порцыя, мо, з кілю вагою была. Сказаў: «Хлопцы, глядзіце, каб во гэта — ніхто не чапаў. Маё...». І ў казан укінуў. А сам перад ядою рашыў на траўцы паляжаць. Паводдаль. «Кухары» перамігнуліся, галаву тую з казана дасталі, паклалі на траву. А перад тым як юшку па місках разліваць, зноў у варыва ўкінулі. «Зварылі», карацей. Паклікалі ўсіх есці. Васька, як водзіцца, першы прыйшоў, вылавіў сваю порцыю і давай наварочваць. Есць, аж за вушамі трашчыць: адну міску апустошыў, па другую палез. Але ж адчуў, што трэба адлучыцца... Прычым тэрмінова... Сігануў у кусты. Вярнуўся. Колькі лыжак зачэрпнуў, — куляю зноў. Мужыкі ад смеху душацца, але ж віду не падаюць, юшку ядуць, нахвальваюць ды яшчэ і пытаюцца:

— Вася, што з табой сёння?

А той, бедны, нават адказаць ім не можа — ён з кустоў не вылазіць.

І плыць ужо час... Рыбу здаваць... А то сапсуецца, крый Бог...

Карацей, нічога скапніку не заставалася: зняў з сябе порткі, накінуў рыбацкі плашч і сеў у лодку, азадак звесіўшы...

Мужыкі матор завялі. Паімчалі. Адно — да звыклага гудзення, разпораз, дабаўляліся іншыя не менш моцныя гукі... На вадзе заставаўся след.

Але ж галоўнае, што ён застаўся і ў памяці, бо пасля гэтага Вася значна паспакайнеў і за сталом, хоць крыху, ды стаў азірацца.

...Чаго, уласна, ад яго і дамагаліся.

Аляксей МІХАЛЬЧЫК,
г. Масты

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

«Снежная краіна-2008»

Пад такой назвай у Мінску 16 лютага прайшла рэспубліканская выстава сабак. У рамках праграмы адбыліся чэмпіянаты пародаў пекінэс і мопс, а таксама выстава йоркшырскага тэр'ера.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 24 31 92, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

html: www.zviazda.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 35.018. Індэкс 63850. Зак. № 927. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12